# Мой востраў радасці – Астравеччына





**Багдзевіч (Сваток) Інэса Віктараўна** (1971) нарадзілася і пачала творчы шлях у Астраўцы. Вучылася ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.

Працавала настаўніцай англійскай мовы ў 1-й і 2-й астравецкіх школах. Некаторы час працавала журналістам у газеце “Астравецкая праўда”. Пасля пераезду ў Мінск працавала ў рэспубліканскай прэсе.

У 2005 г. быў выданы зборнік казак “Куфэрак бабці Ганці” – запісаных і апрацаваных прыпавесцяў, пачутых ад роднай бабулі, у 2009 г. – філасофская, духоўна-павучальная аповесць з апавяданняў “На кухні ў Рэгіны Магдалены”, у 2014 г. – паэма ў вершах “Фенікс”, гімн адраджэнню чалавечай душы з попелу заняпаду, вызваленню з палону цёмных сіл. Кніга вершаў і казак для дзяцей “Кірмаш на клумбе” выйшаў з друку ў 2017 г.

**Боль і сонца**

Я хацела застацца з табой,
Мой святы Астравец, назаўсёды.
Але лёс адгукнуўся трубой,
Што паклілала зноў у паходы.

Паміж соснаў у цёплай цішы
Я стаю над бацькоўскай магілай.
І на стомленай хворай душы
Боль і сонца слязамі застылі.

Калі лівень узрушыць траву,

Я цябе, Астравец, пацалую.
У пакоры схілю галаву.
Я кахаю. Сумую. Жалую.

**Забвенне душы**
Дарагая восень,
Залатая восень,
Свежая, як неба,
Добрая, як Бог.
Я у задуменні
Аб перапляценні
І журбы, і сонца,
І тваіх дарог.

У такую восень
З халадзінкай просінь.
Я плыву, як лебедзь,
Побач у цішы.
Гэта шлях да неба,
Гэта ўсё, што трэба,
Гэта як забвенне
Для тваёй душы.

**Пілігрымка**
Мне кажуць, што каханне –
Як лёгкасць, як святло.
А мне – як пакаранне,
Як шлях, где толькі шкло.

Іду, іду бясконца,
Скрывавіўшы ступні.
Ні вецер і не сонца
Не скажуць : “Адпачні”.

Я падаю – і зноўку
Іду, іду, іду.
Дзе ж бедную галоўку
Я прытуліць знайду?..

Я скардзіцца не смею,
Мне б дзякаваць цяпер,
Таму што разумею
Цябе, Хрыстос, павер.

Ах, толькі б, толькі б годна
Мне несці гэты боль.
На крок высакародны
Знайсці мне моц дазволь.

**Ружа**
Цябе няма, а я гляджу на ружы,
Што мне ад сэрца
ты падараваў.
За ўсіх прыгожых,
значных, мудрых, дужых
Мне лепшы той, што Бог прыгатаваў.
Багатыя пунсовыя пялёсткі
Душу мне гояць,
як Хрыстова кроў.
І хто б другі ні слаў якія лёсткі,
Скажу адно:
“Прабач – і будзь здароў!”
Ах, дзякуй, неба,
што пашкадавала
Гаротніцу, распятую на зле.
Спакусаў даўніх горкая навала
Суцішным ліўнем падае на глей.

**Маім настаўнікам**
Першай восеньскай раніцы
Я з дзяцінства чакала.
Дарагія настаўніцы,
Я вас шчыра кахала.
Тры букеты найлепшыя
Я зрання майстравала.
Гладыёлусы свежыя
У садку выбірала.
Адпачынкам здаваліся
Мне заняткі цудоўныя.
Вы на іх разгараліся
Ад натхнення працоўнага.
Вы такімі прыгожымі
Мне заўсёды з'яўляліся,
Што іскрынкамі Божымі
У дзяцінстве здаваліся.
І цяпер не змяніліся,
Хоць і сталі старэйшыя.
Вы з жыццём аднавіліся,
Па-ранейшаму лепшыя!

**Калыханка**
Баю-бай, мая дачушка,
Хай прыходзіць добры сон.
Расхінае над падушкай
Каляровы парасон.

Бачыш, лялька плюшчыць вочкі,
Нагулялася за дзень.
Спіць мядзведзік у куточку
І начнік кідае цень.
Баю-бай, мая Юльянка,

Падарунак залаты.
Пазяхаюць за фіранкай
Вінаградныя лісты…

**Мой маленькі гарадок**

Ціхі, сонечны, кляновы
Мой маленькі гарадок.
Ён адвечны, ён і новы,
Ён майго жыцця парог.
Пачалося ўсё з калыскі
І бутэлькі з малаком.
А цяпер я шлях няблізкі
Сам адольваю пяшком:
У аптэку, пошту, краму,
У лясок, у Божы храм
Завяду я тату, маму,
Падкажу дарогу вам.
Я ўсе ведаю мясціны,
Я не першы тут гадок.
Прыязджайце
ў наш гасцінны
Беларускі гарадок

**Падары мне крылы!**

Падарыце ж вы мне крылы!
Мне блакіт нябёсаў мілы,
Залатыя аблачыны
проста вабяць, вам скажу.
Я б ляцеў над нашай вёскай,
Рэчкі сіняе палоскай,
Над лясамі і лугамі,
нібы пчолка жа-жу-жу.
Сярод ветру і вясёлкі

Пагуляў бы я з вавёркай,
Салаўём, арлом і дзятлам,
гэта супер – хіба не?
Я б лунаў, як белы бусел,
Гарызонт знайшоў бы, мусіць,
Я б ляцеў, нібыта плаваў,
неба лашчыла б мяне.

Што ж ніхто не купіць крылаў?
Я чакаць не маю сілаў!
Ці ж вы самі не жадалі б
гэтых воблачных прыгод?
Калі іх не мае крама,
Зробіць хай з кардону мама,
Каб я мог хаця б убрацца
матыльком на Новы год!



**Бандарэвіч-Чарненка Лілія** (1954) нарадзілася ў в. Анжадава на Ашмяншчыне ў сям'і настаўнікаў. Паэтычны талент праявіўся ў школьныя гады – вершы друкавалі ў газетах "Ашмянскі веснік", "Гродзенская праўда". Пэўны час вучылася ў Варнянскай сярэдняй школе. Скончыла філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсытэта імя Я. Купалы. Настаўнічала на Ашмяншчыне. Была членам літаратурнага аб'яднання "Наднёманскія галасы". Пазней з сям'ёй пераехала ў горад Прылукі Чарнігаўскай вобласці. Працавала загадчыцай раённага аддзела культуры, 13 гадоў выкладала эстэтыку і літаратуру ў Прылуцкай папраўча-працоўнай калоніі для непаўналетніх. На мясцовым тэлебачанні "Эфір-TV" вяла аўтарскую праграму "Правінцыйныя дыялогі". Журналіст рэгіянальнага выдання «Прылуччына» і абласнога штотыднёвіка «Белая хата».

Член Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны. Піша на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі "Красавік кахання", "Мінулагодні дождж"; зборнікаў прозы "Жанчына, якая нешта ведае", "Ведзьма з будучыні", "На берагах кахання"; аповесцей «Зона гуляе блюз», «Насця Каменская з вуліцы Вішнёвай»; зборніка «Мы ўсе – падарожнікі». Лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі "Трыумф" (2000), Міжнароднай прэміі журналістаў імя Васіля Стуса (2001), Усеўкраінскага конкурсу "Кніжнік-REVIEW" за лепшую рэцэнзію (2001), неаднаразовы пераможца абласных конкурсаў "Крашча кніга року". Сумесна з Тамарай Кручэнка выдала зборнік

"Ад берагоў Дзясны да Сожа". За гэтую кнігу ў 2008 годзе атрымала прэмію імя К. Тураўскага і Міжнародную літаратурную прэмію імя Рыгора Патэльні "Сад Боскіх песень". Друкавалася ў шматлікіх калектыўных зборніках і выданнях Украіны, Расіі, Беларусі: часопісах «Сучаснасць», «Сіверянскі літапіс», «Літаратурны Чарнігіў», «Вясёлка», «Форум» (Масква), «Беларусь» (Мінск), газеце «Кніжнік-REVIEW», у часопісе «Ятрань» (Кіеў - Нью-Ёрк). У выдавецтве "Мастацкая літаратура" (Мінск) у 2008 годзе выйшла аповесць на беларускай мове "Смарагдавыя каралі". Дыпламант і пераможца ў адной з намінацый абласнога конкурсу "Жанчына года-99". Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2007 года.

У "Астравецкай праўдзе" творы Ліліі Бандарэвіч-Чарненка друкуюцца з 2009 года.

****

Ад цябе ўспаміны –
Больш няма мне нічога.
за якую правіну
Пакарана я Богам?
Мы ж не Ясь і Яніна,
Не Адам і не Ева,
не чапалі й галіны
таго райскага дрэва.
Ты пайшоў – я прапала.
Як сястра мне – журбота.
Не сустрэць, хоць шукала,
Не цяпер і не потым.
Вецер у твар мне дыхнуў
пахам позняй рабіны.
Ты не чуеш… не чуў…
Аб цябе – успаміны.

****
Пакацілася колам вунь сонца
і за возерам дальнім знікае.
Я, як рыба, у цеснай палонцы.
Памяць ціха касу расплятае.
Без Яго што ж рабіць мне з сабою?...
Я у лета акно адчыніла,
і туга запаўзла да пакою,
і матыль заляцеў жоўтакрылы.
Вечар доўгім такім мне здаецца.
Хто прыдумаў разлукі і сваркі?
Прыкладу падарожнік да сэрца,
Матылю пачытаю Рэмарка.

****
Філіжанка кавы. Вечар
Прытуліўся, лёг на ганак.
І ўжо позна для сустрэчы,
Для разлукі – трошкі рана.

Над ракою – смех русалчын.
У радасць вокны не адчыніш…
Не чакаю іншых спадчын –
Толькі боль, што мне пакінеш.

Як атрута мне разлука –
Мае смак палынны, горкі…
Падмяшаеш трошкі цукру –
Ну, якая там гаворка!..

Я чакаю, як прычасця,
Як збаўлення, той атравы.
Яна вылечыць ад шчасця.

Вечар…
Філіжанка кавы…

****

«Спасибо, Господи, Тебе
За утро и за вечер
В моей неправильной судьбе,
За долгожданность встречи,
За то, что не сулишь наград,
За музыку хоралов:
Их звуки дивные летят
Под купол — в небо храма.
За то, что сыном я горжусь.
За внучки детский лепет,
За боль, за радость и за грусть,
И за иллюзий пепел…
За то, что под окном сирень
Ветвями всех обнимет!
За мой с бедой и счастьем день —
За всё Тебе спасибо!
И что от стужи бытия
В густынских храмах греюсь…
За то, что верую в Тебя,
Живу, люблю, надеюсь!..»

****

На дорогах Земли трудно встретиться —
По углам разбрелось человечество.
Забавляется злобой и войнами:
Сколько чёрных платков под иконами!
Мир раскрашен кровавыми красками
И заплакан слезою славянскою.
Подступает, как тьма, одиночество,

Но пророчеств нам добры так хочется!
Помоги нам Творец Мироздания!
Научи доброте, состраданию!
Научи милосердию, сродности,
В души дай хоть по капельке совести!..
.И   летит  вдаль карета почтовая,
Пыль вселенскую метя подковами.
И везёт в небеса нашу весточку —
Нам откроют вверху занавесочки?..

**У иконы Божией матери**

Глядит на нас с иконы Божья Матерь –
Взгляд чист Её и светел, как всегда.
И любит всех — тех, кто пришёл на паперть,
Кто причащается у Алтаря…
Как милосердно и смиренно сердце –
Все знают Доброту, Любовь Твою:
Всегда в пути — недавно под Донецком
От пуль спасала мальчиков в бою…
То в городе, то где-то на околице –
Где больно, страшно, где терпеть не в мочь,
Так ясно ощущают Богородицу,
Которая пришла спасти, помочь…
О, Матерь Божья, под Твоим Покровом
Детей рожаем, боремся с бедой,
Нет в этом миру для Тебя чужого:
И каждый сын — младенец, муж седой…
Сакральные есть в нашей жизни вещи –
Любить Ей, вечно жить в веках!
О, самая прекрасная из женщин —
Святая Дева с Сыном на руках!

****

Мы плакать
давно разучились,
не можем подставить плечо…
Когда это с нами случилось
и что с нами будет ещё?..
Злословим мы и суетимся,
а стыдно бывает на миг…
Лукавим, завидуем, злимся,
стреляем в чужих и своих.
Живём, как во тьме мы
незрячей,
а грех – он ведь липкий,
как мёд,
и сердимся мы, что удача
в наш дом не спешит, не идёт.
Бездарно, бездумно, нелепо
мы ищем блаженный покой,
а полог Господнего неба
натянут над каждой судьбой!
… И истина наша сурова,
до боли горька и проста –
мы каждый день снова и снова
ведём на Голгофу Христа…



**Бацюлева Святлана Пятроўна** (нар. у 1952 г.), беларуская паэтка, пісьменніца, ветэран педагагічнай працы. Нарадзілася ў в. Крыўляне Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Вучылася ў Крыўлянскай СШ. Бацькі былі настаўнікамі, тата – яшчэ і дырэктарам. Потым быў пераезд у Шчучын, новая школа, куды Святлана прыйшла ўжо вучаніцай і адкуль выйшла з цвёрда акрэсленым намерам стаць настаўніцай. Вучылася ў Гродзенскім педагагічным інстытуце.

Пасля заканчэння ВНУ працавала настаўнікам-філолагам у Астравецкай СШ № 2, потым – гімназіі. З 1991 года працавала школьным псіхолагам.

Піша вершы даўно, яшчэ са студэнцкай пары. На філалагічным факультэце не магло не аказацца паэтаў, таму неўзабаве ўзнік літаратурны часопіс, рэдагаваць які давялося Святлане Байгот (дзявочае прозвішча). Рэдакцыя “Гродзенскай праўды”, куды дзяўчына часам дасылала свае вершы, запрасіла яе ў сваё літаратурнае аб’яднанне. Вершы Святланы Бацюлевай уразілі глыбокім філасофскім сэнсам, дакладнымі, жывымі, кранальнымі вобразамі, яскравай паэтычнай мовай.

Студэнцкія гады запомніліся незабыўнымі сустрэчамі з вядомымі паэтамі Андрэем Вазнясенскім, Робертам Раждзественскім, Эдуардам Асадавым. Кумірам студэнцкага пакалення 70 – пачатку 80-х гадоў быў, вядома, Уладзімір Высоцкі.

Напружаная праца ў школе, сямейныя абавязкі, выхаванне дачушкі надоўга забралі лішкі вольнага часу, і Святлана Пятроўна адклала ў бок запаветны нататнік. А калі часам нараджаўся верш, хавала яго ціхенька ў шуфляду пісьмовага стала.

Імпульсам да аднаўлення творчага працэсу, па словах самой Святланы Пятроўны, стала наведванне выставы карцін Бірутэ Куцкайтэ, што праходзіла ў Астраўцы. Непаўторныя вобразы з жывапісных палотнаў мастачкі моцна ўразілі чулую паэтычную душу Святланы Пятроўны, навеялі светлыя ўспаміны дзяцінства. Неяк адразу нарадзіўся верш "Свет Бірутэ". А за ім – і іншыя. Вершы Святланы Бацюлевай пастаянна з'яўляюцца ў "Літаратурнай старонцы" раённай газеты. Змешчаны яны і ў калектыўных зборніках: "Астравецкай зямлі галасы", "На крыльях вдохновения"

Жыве ў Астраўцы.

**Куда уйти в старинные приюты…**

Куда уйти в старинные приюты
И снять с души коросты зуд,
Нечистоплотность взглядов
пересудов
И вечно вопиющий суд?
Куда уйти от мира чванства
Всех сильных, предержащих
власть,
И как спастись от низкого коварства,
Предательство питающего всласть?
Куда уйти от серого потока
Тусовок, «звёзд» и «мыльных» фраз?

От зависти, что недреманным
о ком,

Словно Горгона, поражает нас?
Куда уйти от мелочного рабства
Страстей, амбиций, призрачной
хвалы?

На милость победителей
не сдаться,

Нимб Божий сохранить у головы.

**С. Козловскому**
Странник с земли островецкой,
Человек с беспокойным сердцем,
Устремился в далёкий путь,
Мир познать и собою рискнуть!
И в суровых северных широтах
Изучал фольклор его народов,
И вернулся домой через годы

С картинами их жизни и природы.
Один талант рождает другой,
Мы слушаем голос простой,
Он повествует без всяких затей
О чудных обычаях, быте людей.
И мчат упряжки северных оленей,
И нам знакома Колыма,
И нам близки эвены,
И будто ждёт у зимнего костра

Нас Козловский с Дерсу Узала...

**Высоцкаму**
Без правды, чистой правды
На свете не прожить,
Ведь правда – это жажда
И надо утолить.

И за глоточком истины
Бесчисленны гонцы.
С легендой к нам доходят
Из седых веков бойцы.

Их головы на плахе
Летят—держи! держи!
Они кострами – взмахами
В небеса ушли.

В память, в безызвестность,
Гонимые толпой.
Уносят их дороги
Завидною судьбой.

Одни уже упали,
Другие на пути
Рвут жизни пистолетом,
Отчаяшись найти.

А истина сверкает,
Горит за той чертой...
Багрится снег Сенатской,

И в ссылке Трубецкой.

Опять несут ей жертвы
Подобные богам:
Взлетает мысль
Конструктора
К неведомым мирам.

И тает жизнь Есенина
Рождественской свечой,
Прочерчен путь Высоцкого
Отчаянной звездой.

А правды луч заветный
С веками не угас,
Он пламенем вселился
Из непокорных - в нас.

Горит, и жжет, и гонит –
Внимайте честный глас,
Иначе нити правды
Порвутся вдруг на нас...

Без правды, чистой правды
На свете не прожить,
Ведь правда – это жажда,
И надо утолить...

**Ветеранам**
Политики, звезды, актеры
Стремятся к известности и славе,

Но самая дивная сила
В ваших рядах, ветераны!
Редеет с каждой весною
Ваша святая когорта:
Уже за вашей спиною
Каждый второй, третий,

четвертый...
Но не сотрут летящие года
Ваш подвиг и любовь к Отчизне:
Горит, как символ вашей жизни,
Победы майская звезда.

**Беларусь**
Беларусь — любімае
месца сусвету
Сярод пышных зяленых
лясоў,
Родных хатак у свеце
чаромух
І кіпенна – белых садоў.
Беларусь – непалімая
папарацъ-кветка
На скрыжаванні варожых
шляхоў
Будзь назаўседы пад покрывам
светлым
Багародзічнай маці сваей.

**Восень**
Ужо сонца сышло з апагею,

Ходзіць бокам, бы цяжка яму.
Вельмі рана цяпер шарэе,
І ўсё паказвае на зіму.
Ужо восень лісты-паштоўкі
Разаслала па адрасах,
Расказала, што ёй нядоўга,
Што ў апошні збіраецца шлях.
Адпусціла музыкаў-птушак
Да вясны яна ў цеплы край,
Калі снегам зямлю зацярушыць,
Малітоўна нам скажа «бывай».
Але і ў студзёным зімовым прасторы,
Празрыстым да самых зор,
Будуць сніцца асеннія мроі,
Прагажосць яе і спакой.

**Цветы**

Ты решил подарить мне цветы
И в весеннюю очередь стал,
Где по канонам мужской красоты
Очень долго букет выбирал.
В этом жуткая тайна мужчин:
Они, цветочных узниц в целлофане,
В гофрированных юбочках рабынь,
Несут домой с блестящими глазами!
Я видеть не могу агонию цветов,
Совершенно изнемогших без воды,
С головками, склоненными без слов,
И на корсетах — узких ленточек следы.
Плененные цветы подолгу не живут,
Но, словно плод мужских стараний,

Они прекрасно и отчаянно цветут,
Поняв беспомощность страданий...

**Счастье**

Хотите – почитаю вам стихи,
Весенние, счастливые, зеленые.
В них полно разной чепухи
И радости какой-то незнакомой.
Весною разливается река,
Летят на север птичьи балаганы,
И рушится телесная труха,
И обнажает душу без обмана.
Яснеется далекий горизонт,
Не верится в грядущие измены.
Над головой распахиваешь зонт
И улетаешь к счастью непременно.

**Осень. Октябрь**

Еще позволено любить,
Еще так хочется смеяться,
Еще губами воздух пить
И небом синим наслаждаться.
Еще летят смешные паучки,
На сеточках своих искрятся
И ищут потайные уголки,
Чтоб зимнею порой скрываться.
Еще кружится голова,
Еще покой дождем не смыт,
Хотя с деревьев, словно капельки свечи,
Стекает за листочком лист…

**Вечнасць**

Пры ўсякай спакусе:

Уладзе, багацці –
Анёл чорны стаіць,
Прыплюшчыўшы вочы,
І здзекліва смяецца
Над чалавекам,
Які нешта вечнае хоча.

Пры ўсякай спагадзе:
Дабры і натхненні:
Анёл белы стаіць,
Прыплюшчыўшы вочы,
І гарэзна смяецца
Над чалавекам,
Які нешта вечнае хоча.

У вечнасці крылы
Другога размаху:
Яна мае простыя вочы –
Даруе спакусы,
Прымае спагады,
Хавае жалобы ў куфэрак
Ды сыпле пясочак белы
На белыя палацы і хаты.



**Янка Быліна** (сапр. Семашкевіч Іван) нарадзіўся 20.10.1883, у в. Лакцяны Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Астравецкі р-н), беларускі паэт, драматург, перакладчык, рэлігійны і культурна-грамадскі дзеяч.

Янка Быліна з беднай сялянскай сям'і. У 1907 годзе скончыў Віленскую каталіцкую семінарыю і ў тым жа годзе быў пасвечаны ў святары. Падчас вучобы пазнаёміўся і стаў сябраваць з будучымі вядомымі беларускімі каталіцкімі дзеячамі Францішкам Грынкевічам, Францішкам Рамейкам, Уладзіславам Талочкам. Адчуў вялікі ўплыў Вацлава Ластоўскага.

Быў ксяндзом у Ілы на Вілейшчыне, Цудзенішках на Ашмяншчыне, Медніках і Лаварышках каля Вільні, служыў у Слонімскім дэканаце.

Выступаў за шырокае ўжыванне беларускай мовы ў пастырскай дзейнасці, актыўна выступаў за беларусізацыю рэлігійнага жыцця беларускіх каталікоў, за што праследваўся польскімі ўладамі.

Падчас Першай сусветнай вайны разам з Уладзіславам Талочкам уваходзіў у Віленскі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны. У 1917-1918 гадах арганізатар і ўдзельнік беларускай канферэнцыі ў Вільні. У 1933 годзе быў пераведзены на пасаду вікарыя ў Янаў.

Друкавацца пачаў у газеце "Гоман". У 1918 г. выдаў зборнік вершаў "На прызьбе". У 1926 г. пабачыла свет яго камедыя "Выбар старшыні". Патрыятызм і крытычныя адносіны да рэчаіснасці прывялі Я. Быліну ў 20-я гады ў

сатырычныя часопісы “Авадзень” і “Маланка”. Друкаваў вершаваныя апавяданні-гутаркі (“Пахаванне старшыні”, “Здарэнне” і інш.). Перакладаў на беларускую мову рэлігійную літаратуру. Выдаў вершаваныя варыяцыі касцельнага набажэнства “Песні жальбы” (1929), “Дарога крыжа” (1930), кніжку “На покуці” (1934).

У сваіх вершаваных апавяданнях апрацоўваў сюжэты народных жартаў і анекдотаў (“Як пан Петрык ажаніўся”, “Блыха і пан” і інш.), высмейваў вясковую адсталасць, нацыянальную пасіўнасць. Здзекліва паказваў палітыку Польшчы ў Заходняй Беларусі ў байках і сатырычных вершах. Вернасць роднаму краю, любоў да свайго народа выказваў у лірычных вершах.

Найбольш значным мастацкім творам Я. Быліны з’яўляецца трагікамедыя ў трох дзеях “Выбары старшыні”.

У п’есе аўтар высмейвае несумленнасць і жорсткасць чыноўнікаў у дачыненні да простага чалавека. П’еса карысталася вялікім поспехам і папулярнасцю сярод вясковых і местачковых жыхароў, неаднаразова ставілася самадзейнымі тэатральнымі калектывамі.

Пасля вайны ён быў рэпрэсіраваны. Потым давялося працаваць у Польшчы. У апошнія гады жыў у Міхалове-Нязбудным каля Беластока.

Памёр 18 лютага 1956 года.

**Бацькаўшчына**

Хаця яна бедна і хоць так няшчасна,
Напэўна другой я такой не спаткаю. –
Яна мне ў мыслях, як зоранка ясна!
Ёй толькі аднэй свае песьні спяваю.

І ў сне мне мігнець, як анёлачак з раю;
Душу ей і ўсё я аддаў бы на свеце.
Ей толькі аднэй свае песьні спяваю.

Яна так як з байкі заклята кралеўна
Чы з сяго, чы з таго света? – не знаю, -
Яе да магілы любіць буду верна!
Ей толькі аднэй свае песьні спяваю.

Яна хоць за гэта не дасць мне нічога,
Бо скарбаў не мае, гэта добра знаю, -
Адна мне да смерці ёсць дана ад Бога!
Ей толькі аднэй свае песьні спяваю.

**Думкі ля вязьніцы**

I

Сумна.. звесіў галоў,
Чуць не плакаць гатоў..
Я іду… ўсё іду…
Ня пытайце, куды?
Мо знайду? Не знайду?
Можа ўбачу сляды…
Ў ланцугох пэўне йшоў
Вязень тут малады.
На снягу бачу кроў…
Тут ішоў
Не дамоў…
Яго гналі туды…
Плылі хмары ў гары…
Ад пары да пары
Падаў дождж, падаў сьнег.

Вязень нёс якісь мех.
Ён ісці слаба мог
Ланцуг дзынгаў ля ног
Да крыві скуру дзёр.
Ён жывець, не памёр!

II

Стой! Ня відзіш? Сьцяна!
Муравана-ж яна,
Вышыня, вышыня!
Задраў голаў, гляджу:
Вежа там, вежа тут
Аж праняў нейкі жут
Дзіўны вежы, скажу!
Так, дзіўныя яны:
З іх ня звоняць званы –
Там жандары стаяць
Цэлы дзень, цэлу ноч,
Ім прыказ пільнаваць,
Каб ня ўцёк з турмы проч!
Прытуліў я свой твар
Да халоднай сьцяны,
А у сэрцы пёк жар…
Хоць той мур ледзяны.
Стагнаў, плакаў віхор,
Лісты з дрэў кудысь гнаў,
Кудысь гнаў на прастор.

Ў вежы дождж удараў..
Я стаяў і стаяў..

III

Досыць стаяць, досыць ныць,
Табе сьцен не прабіць…
Ля дзвярэй, ля вакон.

**Блыха і пан**
Блыха ўлезла ў пярнат,
З яе быў пан не рад:
Стала грызць яго за брушка
Тлуста, мякка, як падушка.
Засмакавала пана кроў:
Паскача, ды скача зноў.
Варухаючысь на бакі,
Пан доўга, як цюцька, скрабаўся,
Злавіўшы ж блыху, адазваўся:
"Ага, злавіў цябе такі!
Ах ты, насенне праклята,
Збрыдла табе хамская хата?
Досыць, што жывеш усё без працы,
Захацела ты жыць у палацы?
Знай, як шанаваць паноў
І смактаць яшчэ з іх кроў!"
Так мармочачы пад нос,
Блыху да свечкі пан паднёс.
"Чаго хочаш, пан, чаго? –
Закрычала блыха тут. –
К Богу ідзём, пан на суд.
Бо гдзе ж справядлівасць, гдзе ж?
Я п'ю кроў з цябе аднаго,
А ты з тысячаў кроў п'еш".



**Бялячыц Рычард Станіслававіч** (1953), беларускі паэт. Нарадзіўся ў в. Стаўбуры Астравецкага р-на.

Вучыўся ў Варнянскай сярэдняй школе. У 1970 г. паступае на літаратурна-музычнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння вучобы працаваў завучам па выхаваўчай рабоце Цудзенішскай сярэдняй школы (Ашмянскі раён). У гэты ж час з'яўляюцца яго вершы ў часопісе "Маладосць". З 1976 г. працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Варнянскай сярэдняй школы. З 1981 – інспектар школ аддзела адукацыі Астравецкага райвыканкама. У 1982 г. перайшоў на працу ў рэдакцыю газеты "Астравецкая праўда". У 1984 г. быў назначаны завучам Варнянская сярэдняй школы і настаўнікам беларускай мовы, літаратуры і спеваў, дзе працаваў да 1987 г. З 1987 г. Пасля пераезду на пастаяннае месца жыхарства ў Шчучынскі раён, працаваў настаўнікам, журналістам у раённай газеце "Дзянніца".

Рычард Станіслававіч аўтар паэтычных зборнікаў: "Сакавіцкае крыло" у калектыўнай кнізе, "Лагодны промень раніцы" (1988), " Прасветлінка" (1995), "Міг выратавання" ( 2001), "Вочы малітвы"(2004). Таксама вершы Р. Бялячыца друкаваліся ў зборніках "Астравецкі край", "Астравецкай зямлі галасы", "Лагодны промень раніцы", "Галасы", "Дзень паэзіі" і інш.

Лаўрэат прэміі імя А. І. Дубко "Пісменнік года" (2003).

Жыве ў г. Шчучын.

**Прадчуванне**

Мне нажурчэла
крыніца,
Жаўранак цвердзіў
пра гэта:
Штосьці павінна
адбыцца
Ў сіняй бясконцасці
свету.
Зоркі, аднак,
не знікаюць
Болей няхай
з-пад нябёсаў.
Здымкі жаўцеюць
на памяць,
Дзе я шчаслівы і босы.
Пахнуць дарогай
святліцы,
На падаконніку – краскі.
Не перастануць
іскрыцца
Згадкаю вочы
І ласкай.
Штосьці адбыцца
такое
Ў свеце бясконцым
павінна.
Бог дакранецца шчакою
Да сінявокай краіны.

**Прыйшло**

Хачу патрэбным стаць дарозе,
Каб адзінокай не жыла,
І мулкай прозе на парозе,
Што завітала да стала.

Каб сумавала зорка ў высях,
Хачу, без зграбнага мяне,
Дажджынкі светлыя ліліся,
Каб па шчацэ
І па вясне.

Табе патрэбным быць уранні,
Спазнаўшы неба і зямлю,
Як мне патрэбнае дыханне,
Калі цярплю,
Калі люблю.

Прыйшло жаданне
ціхім словам,
Вачыма сцялася ў акне
Не ўпершыню на свет.
Не новым,
Але маё
І да мяне.

********

Так забываемся пра лета
На падыходзе хмурых дзён.
Крадзе-хавае вобраз светлы
Шчаслівы сіні парасон.

Мяне разумны тоўсты слоўнік
Захопіць шмат вякоў падрад.
Цябе жывой сцяной заслоніць
На час касмічны снегапад

А праз зіму ўрост неба пойдзе,
Адыдзе, як і не было,
І памінулае стагоддзе,
І парасонава крыло.

Але хвіліна дарагая
Прыходзіць раніцай, як сон;
Блік таямніц абярагае
Шчаслівы сіні парасон.

**Век залаты**
Гараднічанка манашкай,
Твар затуліўшы, цякла.
Вочы ваколіцы нашай
З неба чакалі святла.
Век залаты.
І ніякай

Драмы ў прыгожым жыцці.
Людзі з усмешкаю мяккай
Меліся вось-вось прыйсці.
Ціха ў чаканні паселі
Добрых са свету навін.
Нібы ў высокім касцеле
Светлыя ўсе
Як адзін.

Іх каля Замка чакалі
І па-за Нёмнам ужо,
Каля Нясвіжа
І каля

Ясных святых вітражоў.
Век залаты...
Ён калоссем
Пах,
І ты побач ішла.
Зведаць і мне давялося
Час той
Узмахам крыла.
Мілы, шляхетны і годны –
Цешся, дзівіся, смакуй –
Век залаты
Па Гародні
З сонцам ідзе пад руку.

**Мой грэх**

*(Беаце Барась)*

Яшчэ не пахнулі вясной
Пад снегам стомленыя далі,
А Вы, напісанае мной,
Па-польску хораша чыталі.
Пагляд туманіла сляза
Адна на ўсіх,
Адначасова.
Як позна, позна я сказаў
Для маці ўслых жывое слова.
Далонь у крыжа на плячы,

Яе ён скінуць быццам хоча.
Гады, як школьнік, палічыў,
А хто палічыць дні і ночы?
Ужо вятры па-за сцяной
Зямлі наводзілі прычоску.
А Вы, напісанае мной,
Чыталі хораша па-польску.
Апошні раз бялюткі снег
Усё павыправіў нібыта.
Аднак нявызнаны мой грэх
Як быццам Богам не забыты.

**Памяці Алаізы Пашкевіч**
Прастораў разбег што ёсць сілы
Дарогі сціскаюць і трушчаць.
Я еду да вашай магілы,
Чырвонаму небу насустрач.
Спрадвеку было яно сінім,
Хоць вёсен мінула нямала.

Як доўга ў касмічнай стыні
Святло па душы сумавала.
На кветкі сядала атрута,
Там роздуму пуста і гола.
Усё ад святла гэта.
Тут нам –

Малітва для сэрца ды голас.
Каб спеў і звычайны і рэдкі
Заўсёды да дому вярнуўся,
Укленчаць спазнелыя кветкі

На кожным грудку
Беларусі.

**Прад вялікасцю зораў**

Не міне Вялікдзень,
Што асвенчаны мне быў.
Ты ж дагэтуль ішла за планідай якой?
Па святочным стале
Сакавіцкага неба
Мы пакоцім
Чырвонага сонца яйко.

І калі над зямлёй
Лёгка-вусцішна стане,
Разаднеюць дарогі ў даліне калі,
Па вачах зразумею тваіх, па дыханні,
Як ты радасць
Спяшала са мной падзяліць.

Кожны з нас адзіноту спасціг і агораў.
А на вечар відаць,
Што ізноў, як адзін,
Штосьці зробім не так
Прад вялікасцю зораў
І святло сваіх душ
Ім адным аддадзім.

**Крыніца**

І ціха.
Я ж не адшукаю
І кропелькі не адніму.

Але ж была крыніца тая,
Калі так снілася яму.

Жалобны вечар
Вербай ніцай
Сцякае з вышыні да ног.
А ён штоночы сніў крыніцу –
Нутро сасмягла ад трывог.

Жывых жагнае бліскавіца,
І гром крыніцу аглушыў.
З яе нікому не напіцца,
Апроч пакутлівай душы.



**Валадзько Людміла Фабіянаўна** (1958-2021), ветэран педагагічнай працы. Працавала настаўніцай замежнай мовы ў Падольскай сярэдняй школе. Дыплом прэстыжнага лінгвістычнага універсітэта адкрываў перад ёю шырокую дарогу да паспяховай кар'еры перакладчыка, але яна выбрала настаўніцкую працу ў роднай школе і дасягнула ў ёй сапраўднага прызнання вучняў і калег.

Людміла Фабіянаўна з маладосці пісала вершы — шчырыя, пранікнёныя, сардэчныя і прысвячае іх малой радзіме, аднавяскоўцам. Дэбютавала ў газеце «Астравецкая праўда» удала, і яе паэтычныя творы на працягу многіх год друкаваліся на «Літаратурнай старонцы». Таксама вершы друкаваліся ў “Настаўніцкай газеце”, часопісе “Маладосць”.

У 2020 годзе Людміла Фабіянаўна стала адным з пераможцаў літаратурнага конкурсу «Бацькаўшчына светлая мая», прысвечанага Году малой радзімы, у намінацыі «Паэзія». Конкурс на працягу года праводзіў Першы канал Беларускага радыё. Кожны месяц з ліку дасланых твораў вызначалі фіналістаў, сярод якіх затым журы абрала пераможцаў. Людміла Фабіянаўна са сваім вершам «Вучуся» прайшла праз густое сіта адбору – і стала лаўрэатам другой ступені рэспубліканскага конкурсу.

**Сон з дзяцінства**

Сніцца: мама зноў
каля печы ўвіхаецца.
Хіба ж жарты:

сямейка ўся наша збіраецца!
Пасля доўгай зімы,
летнім ранкам,
Пазбіраемся ўсе за сняданкам.
Зноў за вокнамі
клёны шапочуцца –
Мне падслухаць
гамонку іх хочацца,
Распытаць тыя ліпы ля ганку
Пра спрадвечную іх
калыханку…
А яны, нахінуўшыся
нізенька-нізка,
Прарыпяць у адказ мне
дзяцінства калыскай.
Басаногая, у лёгкай хусцінцы
Прабягуся
па роснай сцяжынцы,
Загукаю, шчаслівая самая:
“Зноў я дома!
Дзень добры, зямля мая!”

****

Можаш быць хоць у сотні краінах,
Хоць паўсвету прайсці, абляцець,
Ёсць на свеце куточак адзіны –
Па ім сэрца не кіне балець.

Як ні звала замежжа, і горад
Якіх цудаў бы ні абяцаў –
Клікаў край свой бацькоўскі з дакорам,
Водар роднай зямлі спакушаў.

Там матуля чакае нас, тужыць
І глядзіць ўдалячынь з-пад рукі:
Там у небе з курлыканнем кружаць,
Нібы дзеці яе, жаўрукі.

Зачарсцвееш душою, застынеш.
Абагрэцца туды паспяшыш.
Маму, тату прытуліш, абдымеш –
І на ўсё з прасвятленнем глядзіш.

Толькі позірк вачэй іх пабачыш,
Што стаміліся дзетак чакаць,
Неўпрыкмет для сябе ты заплачаш –
Слёзы здымуць цяжар, што нікому не зняць.

* * *

Старонка мая, непаўторны куток...
Ты сэрцу людскому бальзаму глыток.
Табой захапляліся, родна Айчына,
Тваe Багушэвіч, Купала, Скарына...
Не змог табе здрадзіць наш слаўны зямляк,
Мо прозвішча выбраў затое — Сваяк.
За славай не гнаўся, народу служыў,
На жаль, толькі мала на свеце пажыў.
У вёсцы Барані між лесу, азёр
Вучыў роднай мове чужых і сясцёр.
Хацеў прыгажэй каб, шчаслівей жылі,
На свет белы глянуць шырэй каб змаглі.

**Званы абед**

Прашу цябе! Не памірай,
Святая вёсачка мая!

Трымайся, люба! І свет гукай:
Няхай зляціцца ўся радня,
Што ўзгадавала-ўскалыхала,
У людзі вывела, і вось –
Сама ўшчэнт ты заняпала,
А сын твой — рэдкі ў цябе госць…
І дочкі-кралі ў край заморск,
Як найдалей, адсюль ўцяклі,
Каб слёзы, клопат, роднай вёскі
Іх быт азмрочыць не маглі.
Начамі тупае, чакае
Ля вокан з дошкамі, платоў,
Па сцежках, што пазарасталі,
Чакае дочак і сыноў…
На золку вочы зложыць: сніцца
Прыгожы і дзівосны сон,
Бяроза, даўняя сястрыца,
Спявае песні. Стары клён
Раскошным лісцем лечыць-туліць
Рубцы збалелае душы…
І дзеткі, нібы пчолкі ў вулей
Імчаць у госці па шашы.
І сніцца вёсачцы: сышліся
Усе крывіначкі яе,
Яе старэнькай – не зракліся,
На званы іх абед заве…

**Маці Божай Гудагайскай**
*(У дзень каранацыі святога абраза)*
Душа імчыць аж да нябёсаў,
У грудзях гучыць любві санет –
Марыя з дзіцяткам Ісусам
Глядзіць узрушана на свет…

Святлее твар увачавідкі,
Нібы на хвалях паплыла.
І хор шматтысячнай малітвы
Дабавіў Ёй яшчэ святла.

Паветра поўніцца трымценнем
Адкрытых сэрцаў і надзей,
І цуд людскога прасвятлення –
У далоньках зложаных дзяцей…

У вочках выцвілых бабулек,
У задуменнасці мужчын,
У патоках слёз жанчын-матулек,
Што льюцца быццам без прычын.

Лунаюць у паветры словы
Нямое споведзі душы,
І вусны шэпчуць бы замову:
“Марыя Маці! Памажы!

Дапамажы! Падзякуй Богу!
За павяртанне да святла,
За верную ў жыцці дарогу,
Што ў Божы храм нас прывяла”.

У небе ясным бліскавіца
Асвечвае яе адказ:
“Перад Усявышнім зноў маліцца
Я буду, дзетачкі, за вас!”

**Край васільковы**

Сонца зззяе над любай старонкай,
Песцяць промні куточкі яе.

Салаўі заліваюцца звонка,
Так салодка! Аж слоў не стае!
Збажыной каласяцца палеткі,
Ад іх золата светла ў вачах…
А стракатыя красачкі-кветкі
Гэтак пахнуць у садку па начах.
Край васільковы,
рамонкава-светлы –
Хіба дзе знойдзеш зямлю
прыгажэй? –
Вам усміхнецца ўсмешкаю
светлай
Шчырых, гасцінных,
руплівых людзей.
Над сінявою баранскіх азёраў
Кружаць у танцы нібы журавы.
Срэбна-узнёсла ў Свіранскім касцёле,
Гімнам святлу раздаюцца званы.

Наша Вілія з небам блакітным
Нібы ў пары раздольна цячэ.
А ў лясах з верасоў аксаміту
Лёс на шчасце дыван нам сатчэ…



**Станіслав Віктаравіч Валодзька** (1956), беларускі паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Нарадзіўся ў в. Падольцы. У 1974 г. скончыў Жукойненскую сярэднюю школу. У сёмым класе ён паўдзельнічаў у конкурсе на лепшае сачыненне па тэме “Мая любімая прафесія”, які быў аб’яўлены беларускім радыё ў праграме “Рамантыкі”, напісаў верш пра геолага і стаў прызёрам конкурсу. Самы першы верш “Вілія”, дакладней чатырохрадкоўе, быў надрукаваны ў газеце “Астравецкая праўда” ў 1974 годзе. Поўнасцю верш убачыў свет у штогодніку “Галасы” (Гродна, 2002, № 1).

Пасля заканчэння школы пайшоў у армію. Служачы ў войску, Станіслаў Віктаравіч не перарываў працэс напісання вершаў. Першыя публікацыі ў рэспубліканскім друку з’явіліся пасля вяртання з войска. Спачатку ў газеце “Чырвоная змена”.

Праз некаторы час з’явіліся падборкі ў часопісах “Беларусь” і “Маладосць”. Хутка прыйшло запрашэнне прыняць удзел у перадачы Рэспубліканскага тэлебачання “Спявайце, юныя паэты”, якую вёў Кастусь Цвірка.

Неўзабаве з’явіліся вершы паэта ў газеце “Літаратура і мастацтва” і ў часопісе “Нёман”.

Працаваў на чыгунцы ў Вільнюсе, потым у Даўгаўпілсе. Адначасова з пачаткам працы на чыгунцы была і завочная вучоба на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта, які Станіслаў Валодзька закончыў у 1987 годзе. Працуючы ў Латвійскім горадзе Даўгаўпілсе

механікам пуцявой машыны, ён сустрэў сваю суджаную і пусціў там свае карані.

У 1983 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” выйшаў калектыўны зборнік паэзіі пад назвай “Сцяжына”. Менавіта ў ім была змешчана вялікая падборка вершаў Станіслава Віктаравіча “На хвалях хвалявання”.

З гэтага часу творы паэта больш шырока друкуюцца ў перыёдыцы Беларусі і Латвіі, гучаць на беларускім і латвійскім радыё і тэлебачанні. Многія з іх пакладзены на музыку прафесійнымі кампазітарамі. Ён супрацоўнічае з беларускімі і латвійскімі кампазітарамі. У супрацоўніцтве з астравецкім кампазітарам А. Якіменкм з’явіліся песні “Памяці Казіміра Сваяка”, “Міхалішскі касцёл”, “Дачка лесніка”, “Астравеччына”.

Творчасць паэта прадстаўлена больш чым у 15 асобніках, таксама творы друкаваліся ў шматлікіх калектыўных зборніках.

Адзначан медалём Францыска Скарыны, нагрудным знакам Міністэрства культуры, Ганаровай граматай Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў.

Жыве ў г. Даўгаўпілс (Латвія).

**Бацькоўскі дом**

Гадам, напэўна,
трэба доўг аддаць:
Бывае сумна мне –
не перадаць.
І я сябе спрабую апраўдаць,
Што мне прыйшлося
родны дом прадаць.

Бо ён адзін стаяў, як сірата,
А мне не выпадала завітаць, -
Страху залатаць
і скасіць быльнёг,
Каб весялей глядзець
на свет ён мог.

Яшчэ мне і аб тым
не грэх сказаць:
За грошы,
што за дом я змог узяць,
Не раз я
на радзіму прыязджаў,
Паклон
магілам родным аддаваў.

І зноў сплывае
смутак мой з вачэй,
І ў вочы мне
зірнуць яму лягчэй.
Ён дзеліцца са мной
святлом сваім.
Жывіце, людзі, счаслiва у ім!

**Пад небам Радзімы**
Я тут і праз падэшвы адчуваю
Сляды дзяцінства босага свайго.
Крынічнаю вадою ачышчаю
Душу ад непатрэбнага ўсяго.
Адзначаны жыццёвай новай вехай,
Гляджу замілавана ўдалячынь.

І ясна так юнацтва чую рэха,
Пад бацькаўшчыны небам ідучы.
У вёсцы пад адкрытым небам танцы –
Язміну водар кружыць галаву.
З дзяўчынкай сарамліваю у вальсе
На хвалях хвалявання я плыву.
Якія словы вымавіць не знаю, –
Дыханнем апякаю вушка ёй.
І зоркі ўзнёсла кружацца над намі
У небе мілай вотчыны маёй...
Дарогі па зямлі мяне кружылі, –
Нярэдка горкім быў чужбіны дым.
Ды дзякуй Богу, як да сэрца жылы,
Шляхі мяне ізноў вялі сюды,
Дзе мары, як калісьці, б'юць крыніцай,
Пачуцці тут выходзяць з берагоў.
І цёплы, летні дождж вярбою ніцай
Спадае з неба роднага майго...

**Дачка лесніка**
Ох і дачка ў лясніка расцвітае,
Быццам купальская зорачка тая.
Сонца і месяц заўжды за ёй сочаць,
Каб не маглі прыгажуньку сорочыць.
Гнецца лясная дарожка падковай, –
Шчасця ўсё зычыць дачцэ лясніковай.
Год ёй багата зязюлька жадае,
Зводны хор птушак ёй оду спявае.
Хлопцы ў акрузе па ёй уздыхаюць,
Так уздыхаюць, – вятрыску ўздымаюць.
І да таго часам моцны вятрыска, –

Краскі ў паклоне схіляюцца нізка.
Ой, у ляснічкі, у чараўнічкі
Вочкі – чарнічкі, вусны – сунічкі,
Косы, нібыта ў ніцай бярозы,
Смех яе шчыры, як россыпы росаў...

**“Новая зямля”**
Запала ў сэрца “Новая зямля”.
Мне ўспомніцца не раз праз часу замець:
У шостым класе з хваляваннем я
“Мой родны кут” расказваю на памяць.
І лашчыць слых мне шчырай пахвалой
Настаўніца і ставіць мне “пяцёрку”.
Што даражэй няма зямлі сваёй,
Я з той пары навек засвоіў цвёрда.
І сёння праз навалы навальніц –
Я шчасліў, бо мне ёсць дзе чэрпаць сілы:
Я ведаю на памяць да драбніц
Свой родны кут, што мне таксама мілы.

Я цешуся, як тое немаўля, –
Вясна зямельцы справіла абновы;
І радуе, што “Новая зямля” –
Жыцця падручнік пакаленням новым...

* * *
Час збіраць камені
Час камені пазбіраць,
Не раскідваючы болей,
І фундаменты пара
Пазакладваць нам з любоўю.

Брукаванкаю яны
Могуць класціся пад ногі.
Ў лазні ім няма цаны,
Што ратуе ад знямогі.
Час каменні пазбіраць –
Не хапаць з нябёсаў зоркі, –
Дзецям даць урок дабра,
Каб не зналі долі горкай.
Лепей поле засяваць, –
Каб радзіла нам на шчасце, –
Час каменні пазбіраць, –
Іх за пазуху не класці...

**Ігнасеў сад**
З маленства помню сад Ігнасеў
На ўскрайку вёскі,
Што застаўся
Як напамінак аб тым часе,
Як раскулачвалі Ігнася.
Кулак, – не фіга быў,
За тое
Ў Сібір вывозілі сям'ёю.

І гэты сад заламваў рукі
І лісцем гнаўся ўслед за ёю...
Асірацелы сад Ігнасеў
Год колькі ўдалеч углядаўся,
Жагнаўся часам,
Ды нікога
З іх так ён і не дачакаўся...
Любіў гуляць я ў гэтым садзе.

Стары ён мне насустрач гнуўся,
Па галаве малога гладзіў,
Як я да яблыкаў цягнуўся...
Я і нядаўна быў зайшоўся:
– Ну як ты жыў-здароў? – спытаўся.
Зноў пачастунак мне знайшоўся,
Ды штосьці яблык даўкім здаўся...

**Бацькоўскі кут**

Дзе ножкі мае босыя ступалі,
Трава найбольш гаючая расце,
І на Купалле, быццам знічкі ўпалі,
Найпрыгажэй тут папараць цвіце!
І сонца тут ярчэй і поўня свеціць,
І бліскавіц бліжэй няма чым тут.
Спакон найдаражэйшы у Сусвеце,
Асвечаны дажджом, бацькоўскі кут.
І тут найсаладзейшыя суніцы,
І тут найлагаднейшая рака.
Ў мяне ў старонцы роднай не сініца,
А журавель калодзежны ў руках.
З паклонам ён і днём дастане зорку,
Што для мяне за пазухай трымаў.
Аднак жа і такой рабіны горкай
Нідзе на белым свеце больш няма.
Як да сябе вяртанне я святкую.
Мне босым, як малому, добра йсці.
І найдаўжэй зязюлька тут кукуе, –
Нідзе такой зычлівай не знайсці.

**Чаромха**
Парой надвечаровай
У роднай старане
Знаёмая чаромха
Здалёк махае мне.
У вэлюме чаромха
Махае мне здаля,
Нявесціцца чаромха –
Равесніца мая.
Я з гэтаю чаромхаю,
Абняўшысь, пастаю, –
Успомню зноў чароўную
Дзяўчыначку сваю.
Як пад чаромхай гэтай
З равесніцай стаяў, –
Яе сваёй нявестай
Так марыў бачыць я!
Як воблакі-чаромхі,
Гады былі, – сплылі.
Ад водару чаромхі
Мне галаў не баліць...

**Візы**
Мяне ў суседняй старане
Шчыпае візамі граніца.
І часам грошай не стае
Прыехаць родным пакланіцца.
У полі бульбіну падняць,
І ў лесе – ягаду, дравіну.
І разам чарачку ўзняць,
Пачуць вясковыя навіны...

Дзе знічка падае ў выток,
Нібы вачэй сляза скупая.
Дзе мой пупок, — у той куток
Без візы памяць зноў ступае...



**Валуевіч Іаланта Францаўна** (1954), ветэран бібліятэчнай справы, краязнаўца. Нарадзілася ў вёсцы Глушыца Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. У 1970 годзе скончыла сярэднюю школу і пачала працоўную дзейнасць у Спондаўскай сельскай бібліятэцы. У гэтым жа годзе паступіла на завочнае аддзяленне Мінскага інстытута культуры, у 1983 годзе скончыла Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці бібліятэкар-бібліёграф.

Пераможца раённага конкурсу "Культработник года" ў намінацыі "Бібліятэкар года" (2003). Намінант абласнога конкурсу "Жанчына года". За значны ўклад у адраджэнне і зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны ўзнагароджана Ганаровымі граматамі ўпраўлення культуры (2004), аблвыканкама, райвыканкама і райсавета дэпутатаў. Па выніках працы была занесена на Дошку гонару бібліятэчных работнікаў.

І. Валуевіч вяла актыўную грамадскую працу. Яна была абраная дэпутатам Спондаўскага сельскага Савета некалькіх скліканняў.

Па ініцыятыве І.Ф. Валуевіч у Спондаўскай бібліятэцы была створана асацыяцыя работнікаў культуры Спондаўскага сельскага Савета, якія сумесна рыхтавалі і праводзілі буйныя мерапрыемствы ў сёлах зоны абслугоўвання. За праведзеную працу бібліятэкар была ўзнагароджана Ганаровай граматай Гродзенскага аблвыканкама.

У 80-я гады і. Валуевіч адной з першых пачала праводзіць святы вёсак у сваёй зоне абслугоўвання. Таксама адной з першых І. Валуевіч стала арганізоўваць і праводзіць папулярныя ў 80-гады дні памяці.

Усе гады сваёй працоўнай дзейнасці Іаланта Францаўна вяла карпатлівую краязнаўчую працу. Гэтыя даследаванні з'явіліся асновай творчай дзейнасці, матэрыялы друкаваліся на старонках раённай і рэспубліканскіх газет, часопісе "Родная прырода". Асобна былі выдадзены працы "Мікратапонімы Спондаўскага краю", "Мая маленькая радзіма, Мой родны Спондаўскі куток", "Яе мова ад родных мясцін".

Іалантай Францаўнай праведзена вялікая праца па ўвекавечванні і папулярызацыі мясцовых майстроў-разьбяроў па дрэве. Яе кнігі "Рязбар з Глушыцы", "Калыска талентаў - Глушыца" і інш., прысвечаны народнаму майстру М. Валуевічу, рэзчыкам Яну Бучыну, Кліменцію Лаўрыновічу, Юзафу Пупінскаму, Іосіфу Міхновічу, Вікенцію Ягеле.

Вялікая праца праводзілася па ўвекавечванні памяці знакамітых ураджэнцаў Спондаўшчыны. Гэта і Янка Быліна - паэт і святар, Адольф Клімовіч – навуковец, грамадскі дзеяч, Казімір Сваяк – пісьменнік, святар. Пераможца раённага конкурсу, прысвечанага Казіміру Сваяку, у намінацыі "Даследчая дзейнасць" (2010).

Яна шукала і наладжвала сувязі з землякамі, якія праславіліся за межамі сваёй маленькай радзімы, кожны на сваёй ніве. Гэта і Фелікс Станевіч, вядомы рацыяналізатар у галіне музыкі, які пражывае ў Рызе, і расійскі фізік-ядзершчык, кандыдат тэхнічных навук Рычард Памецька і іншыя.

Жыве ў Мінску.

**Чортава балота**

Многія мясціны майго роднага кутка і сёння авеяны легендамі. Вось адна з іх. Каля нашай вёскі Спонды ёсць ажно тры Чортавы балоты. Сама назва падказвае, што туды лепш не хадзіць, калі не хочаш, каб з табой здарылася нешта нядобрае.

Гісторыя гэта адбылася, мо, стагоддзі два таму. Адзін вясковец любіў хадзіць у суседняе мястэчка ў карчму. Аднойчы заседзеўся дапазна, а калі вяртаўся на добрым падпітку дахаты, то ў Чортавым балоце заблудзіўся. Ніяк не мог выйсці: кружыў, кружыў па імшарыне. Ужо і стаміўся, хацеў прылегчы на курган адпачыць, як раптам з'явілася мноства чарцей, акружылі яго, далі ў рукі скрыпачку і загадалі граць.

Селянін ніколі не быў музыкантам. Але як толькі ўзяў у рукі тую "крывую

скрыпачку", то так здорава зайграў на ёй, што самому захацелася пусціцца ў скокі. А ўжо як чэрці весяліліся: кружыліся, падскоквалі, аж у вачах мільгацела. І пра музыканта не забывалі, падбягалі і шчодра сыпалі яму ў шапку грошы. Так яны выгульвалі, пакуль не стала світаць. А тады раптам усё знікла, як і не было нічога.

Чалавек пачаў думаць, ці не страшны сон яму прысніўся. Ад успамінаў аж мурашкі па спіне пабеглі. "Не дай Бог яшчэ калі такі сон убачыць! Цьфу, цьфу, цьфу! – сплюнуў ён праз левае плячо і ледзь не абамлеў: ля ног ляжала шапка, напоўненая... скамечанымі паперкамі.

**Таямніцы глухога возера**

Амаль пра кожнае з азёр Астравеччыны ў народзе захаваліся легенды, паданні.

Але найбольш ахутана таямніцамі возера Глухое, альбо Глушачок, як яго ласкава называюць мясцовыя

жыхары. Яно размешчана на тэрыторыі Падольскага лясніцтва і распачынае сабой знакаміты ланцужок цудоўных «Сарачанскіх карбляў».

Кажуць, некалі праязджала ў Вільню з Пецярбурга знатная князёўна ў залачонай карэце з багатымі падарункамі. Дарога праходзіла цераз балота, на месцы якога цяпер возера. Коні з гары панеслі, карэта саскочыла з дарогі і — багна пачала засмоктваць яе. Удалося выратавацца самім дзякуючы таму, што коней паспелі адпрэгчы. А карэту з багаццем паглынула ў сябе балота.

Не менш цікавая легенда ўтварэння гэтага возера. Калісьці Нарачанскі край славіўся сваімі чараўніцамі. З імі люта распраўляліся, тапілі ў азёрах, прывязаўшы на шыю камень, каб нават чарадзейная сіла не дапамагла выплысці. І вось адна з чараўніц вырвалася з рук сваіх захопнікаў. Яна ўцякала, але ў балоце, на месцы цяперашняга возера, яе дагналі. Убачыўшы, што няма іншага выйсця, чараўніца выкрыкнула магічнае заклінанне, ператварыўшы балота ў возера, і патапіла тым самым сябе і сваіх крыўдзіцеляў.

Многія сцвярджаюць, што Глухое злучаецца з нарачанскімі азёрамі падземнымі хадамі. Даследчыкі, каб выявіць, куды вядуць крынічныя хады, акальцавалі некалькі дзесяткаў розных рыб у Нарачанскім возеры. Аднаго з такіх шчупакоў вылавілі ў Глухім возеры. Плыўцы, якія адважыліся тут ныраць, расказвалі, што ёсць такое месца, дзе з неймавернай сілай зацягвае ў бездань.

І вось пагодлівым восеньскім днём мы пад’ехалі да возера. Спакойнае і велічнае. Да яго амаль ушчыльную падступаў маляўнічы лес, а вакол — ні душы. Сонечныя праменьчыкі гайдаліся на хвалях, нібы ўсміхаючыся нам і запрашаючы да сябе. Але,

памятаючы аповяды мясцовых жыхароў, мы не адважыліся падысці да вады. Да таго ж небяспечная дрыгва акружала возера з усіх бакоў.

Успомнілі пра шматлікія ахвяры, якія забрала возера. Апошняй быў малады хлопец, які вярнуўся дадому, адслужыўшы тры гады ў марскім флоце. Паспрачаўся з сябрамі, што пераплыве возера пад вадой. Як нырнуў, так яго больш і не ўбачылі.

Дрыгва таксама шмат каго засмактала...

Легенды пра Глухое возера існуюць і да гэтай пары, абуджаюць фантазію, бударажаць кроў і гарачыя галовы мясцовых скарбашукальнікаў. Многім хацелася знайсці тую карэту са скарбам... Здавалася б, прасцей было б спусціць ваду з возера: Глухое размешчана вышэй за Баранскае, якое знаходзіцца побач, на метраў 15-20. Але зноў жа старажылы перасцерагаюць: хто спрабаваў гэта зрабіць — аслеплі...

Бывае возера і шчодрым. Смельчакі, што адважыліся лавіць там рыбу, хваляцца багатымі ўловамі. Ды яшчэ здзіўляюцца чысціні і празрыстасці вады, якой няма ў іншых азёрах. А ягаднікаў увосень Глушачок шчодра адорвае журавінамі, якія густым мохам аплялі берагі возера.

**Святы камень**

Каля Вялікай Вёскі, што ў Спондаўскім сельсавеце, ёсць старажытны камень. Існуе прыгожая легенда аб яго паходжанні.

Маці Боская сышла на зямлю, каб паслухаць, як славяць яе вернікі. Так ішла яна па зямлі, а людзі і птушкі спявалі ёй, лясы, палі і сады апраналі самыя прыгожыя ўборы, каб сустрэць яе, духмяныя чаромха і бэз уплятали кветкі ў яе косы. Праходзячы міма Вялікай Вёскі, Багародзіца залюбавалася прыгажосцю тамтэйшых мясцін і стала на камень, каб лепш было відаць. А з вёскі вечар

даносіў такі прыгожы спеў, нібы гэта і не людзі, а самі анёлы спявалі, славячы Бога. Узрадавалася Маці Боская, заслухалася, затрымалася на некалькі хвілін, і адбітак яе святой нагі застаўся на тым камені.

Напэўна, падарунак Маці Боскай трэба лічыць тое, што спявачкі не пераводзяцца ў вёсцы і па сённяшні дзень. Самыя прыгожыя галасы ў хоры Клюшчанскага касцёла – гэта галасы жанчын з Вялікай Вёскі.



**Ганулiч Алена** нарадзiлася ў в. Варняны. Закончыла Гродзенскі універсітэт імя Янкі Купалы, па адукацыі псіхолаг-педагог. Працавала школным псіхолагам. Выхоўвае дачку Аляксандру. З 2013 года працуе журналістам у газеце "Астравецкая праўда. Піша вершы і прозу.

Друкуецца ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. Алена Ганулiч загадчыца аддзела сельскай гаспадаркі газеты «Астравецкая праўда».

Асвятляе пытанні сельскай гаспадаркі, аховы прыроды, духоўнасці. Праекты: "На карце Астравеччыны", "Супольнасць", "Духоўнасць". Пераможца літаратурнага конкурсу газеты "Звязда" і Саюза пісьменнікаў Беларусі (2011). Першай прэміяй было адзначана яе апавяданне, складзенае з кароткіх навел, якому аўтар дала назву "Анёлы". Пераможца конкурсу "Хлебаробы. Погляд рэпарцёра", аб'яўленага на перыяд жніва Гродзенскай абласной арганізацыяй Беларускага саюза журналістаў (2017), рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшае асвятленне ў СМІ тэматыкі ўборачнай кампаніі "І жнівом адзіныя" (2018).

Алена піша вельмі шчырыя і пранікнёныя навелы і кароткія апавяданні, вершы, якія рэгулярна друкуюцца на старонках "Астравецкай праўды".

Сябра Беларускага саюза журналістаў

**Калядная мара**

Так хочацца ведаць,
што ўсё будзе добра.
Так хочацца верыць

у цуды ўсё роўна.

Скідаць назаўсёды звыклыя маскі,
У памяць вяртаць дзіцячыя казкі.
І жыць прадчуваннем калядные ночы.
Упэўнена дыхаць. Упэўнена крочыць.

Закрэсліць усе ілжэтвары на твары
І крылы з паперы прыклеіць да мары,
І быць, як усе, - у спагадзе і згодзе –
Не варта, не існа, калі не па модзе! –

Адкрыта глядзець, адкінуўшы маску,
Пакрыўджанаму – “Прабач, калі ласка!”
Прывесці ў парадак сумленні старанна,
Пафарбаваць у белы заганы…

…І толькі калі па-сапраўднаму верыць –
Калядная мара пагрукае ў дзверы.

**Новая вясна**
Тварам да твару-
Слоў няма.
Мара да мары –
З’ела зіма.
Нам бы з табою
Дажыць да вясны.
Ну, а вясною?
Зноў-такі сны...
Вера-нявера?
Абставінаў збег?
Аркуш паперы
Белы, як снег.

Зорка да зоркі –
Знічка адна.
Белыя пёркі
Сыпле зіма...

Нам бы з табою –
Мне і табе –
Зімнюю мрою
Сэрцам па шкле;
Аркушам белым,
Знічкай начной
Стаць адным цэлым:
Новай вясной.

* * *
Мелодыя тэлефавання –
Ціш наўкола ўжо не спіць.
З краю свету адно пытанне:
Дзе бяруць людзі сілы жыць?
І тваёй думкі экзістэнцыйнай
Раз'ядаюць аскепкі мяне.
Слаць адказ як ёсць, афіцыйна?
Ці віламі вадзіць па вадзе?
У складанасці – каб не змыліцца –
Твары два. Папытай у тых,
Хто умее сапраўдна маліцца,
Хто глядзеў у вочы старых.

**Я хачу, каб не было вайны**
Я хачу, каб не было вайны
І ні днём, і ні ўночы – ніколі.
Я хачу, каб чыесці сыны
Не ляжалі на смертным полі.

Я хачу, каб не было вайны
Ні ў краіне, ні ў цэлым свеце.
Я хачу, каб спакойныя сны
Ноччу бачылі нашыя дзеці.

Я хачу, каб не было вайны
Ні ў сям'і, ні з самім сабою.
Я хачу, каб квецень вясны
Разбівала ў ашчэпкі зброю.

Я хачу, каб не было вайны…
(Каб ніколі вайне не стацца!)
Я хачу, каб жылі без маны –
Каб людзьмі між сабою звацца!

**Я пакіну цябе**

Я пакіну цябе
У скрыжаванні дарог,
Я пакіну цябе
На абочыне лёсу.
Я пакіну цябе
Следам ля ног.
Я пакіну цябе
На сцежцы роснай..
Я пакіну цябе
На вякі. На гады.
Я пакіну цябе
І адпрэчу ўпотай.
Я пакіну цябе!
Успамінаў сляды
Пакіданнем вяртаюць
Мне зноў адзіноту.

**Дождж**

Прыслухайся да дажджу – і ты пачуеш голас самой Зямлі. Сцішаны, часам цвёрда-каменны, іншы раз – рашучастальны. Яна шкадуе нас, людзей, як і кожная маці сваіх дзяцей. І шапаціць грыбнымі, праліўнымі, незаўважнымі дажджамі. Каб толькі мы маглі зразумець яе. Чалавек чамусьці не йдзе на кантакт: ён вышэйшы за размовы праз дождж.

А ты паслухай музыку дажджу! Не будзь, як усе.

Кубак кавы ці гарбаты, прыпраўленай язмінам. Ногі, цела ды і ўся існасць у абдымках рабога пледу, ці хусткі, як называлі нашыя дзяды ды бабулі; ды імбрык памалу аддае цеплыню “ужо не кіпеню”…

Праз адчыненае акно далятаюць дажджынкі: кратаюць далоні, далікатныя фіранкі… Змываюць сваёй падкупнай прахалодай усе сумневы і бруд на сэрцы.

Нарэшце ты адчула сябе чыстай.

Хвалі дажджу.

Узмах крыльцаў матыля ў другой палове свету нараджае дождж. Ты ўдзячна матыльку ды і далёкай Амерыцы за яшчэ адну магчымасць пачуць голас Зямлі.

Скажы мне, якую музыку ты слухаеш, - і я скажу, хто ты.

Ты слухаеш песні дажджу – значыць, ты Чалавек.

**Гадзіннік**

Можна жыць, а можна рабіць выгляд, што жывеш. Рана ці позна нават самая трывалая самаабарона зжывае сябе. Майму адмаўленню не наканавана ўваскрэснуць; і ніякая рэфлексія, людзі са сваімі аднолькава-непадобнымі тварамі душы, банальныя абставіны – тут ні пры чым.

Дзень мінае за днём. Гадзіннік па-ранейшаму б’е шэсць разоў у васемнаццаць нуль-нуль і дванаццаць – апоўначы.

Зіма паядае восень, лета выпарвае вясну. Жыццёвым крэда для сябе, так і адказам для акаляючых неўпрыкмет становіцца “усё добра” (і абавязкова ўсмешка).

Сто, тысячы, мільёны гэтых самаабманаў-паразітаў, прагавароных, запісаных, падуманых, - і сапраўды “усё добра” віруе ў жыцці. Ілюзія, якая становіцца жыццём.

Можна рабіць выгляд, што жывеш.

Гадзіннік змаўкае. Не, не той, які адмервае зямны час (ён спраўна выконвае сваю працу), а ўнутраны, невялічкі, бы карабок запалак. Адна спружына парушыла адладжаны механізм чалавечай свядомасці, і -…

…Можна жыць, а не рабіць выгляд, што жывеш.



**Граблеўская Таццяна Мечыславаўна** нарадзілася ў 1955 г. ў Астравецкім раёне. У 1977 г. скончыла Гродзенскі педагагічны інстытут. У 1999 г. закончыла вышэйшую школу пры БДУ па спецыяльнасці «культуралогія». Шмат гадоў працавала настаўніцай гісторыі і сусветнай мастацкай культуры ў СШ № 2 (потым гімназіі № 1) г. Астравец. Пасля заканчэння педагагічнай дзейнасці некаторы час працавала метадыстам па музейнай рабоце ў раённым аддзеле культуры. Вершы друкаваліся ў газеце "Астравецкая праўда", калектыўных зборніках "Астравецкі край" (2005), "Астравецкай зямлі галасы" (2008). У выдавецтве "Белы вецер" выйшла кніжка "Стихотворные викторины и задачи по истории искусства". Некаторыя вершы Таццяны Мечыславаўны пакладзены на песні кампазітарам А. Якіменкам.

Жыве ў Астраўцы.

**Адысей з Беларусі**

*І. А. Гашкевічу*

Краіна ў промнях усходняга сонца
Была таямніцай, загадкай для нас,
Яе адкрываў светлавокі наш консул,
У даўні няўрымслівы час.

Адысей з Беларусі, Адысей з Беларусі,
Быў нялёгкім і слаўным твой лёс.
Прывітанне ад сініх азёр беларускіх

У край далёкі усходні прынёс.

Бачыў у дальніх краях ты бурлівае мора
І як горад і горы ўздымаў землятрус,
А да родных палёў ты вярнуўся няскора,
Хоць чакала цябе Беларусь

І руплівая праца ад ранку да ранку.
Перажыць жа прыйшлося нямала трывог.
Астравеччына стала спакойным прыстанкам
Пасля многіх жыццёвых дарог.

**Ветразі**
Жыццё, жыццё – няпростае яно,
Больш цёмных у яго палос,
чым белых.
Бядоты, боль, як прэч іх ні гані,
Усё ж пачуеш за спіной іх подых.
І на дарозе нашай на зямной
Касяць дажджы, мятуць завеі.
І ўздымаюць толькі нас з табой
Зноў ветразі кахання і надзеі.

Жыццё, жыццё – складанае яно.
Задачы часам
з невядомымі рашаем.
Мудрэц не дапаможа нават нам,
Бывае, жыць з нуля
мы пачынаем.
І сэрца зноў сціскаецца ў журбе,
Буран убіраецца ў сілу і шалее.
І выратоўваць у гэты час цябе
Зноў ветразі кахання і надзеі.

Жыццё, жыццё – цудоўнае яно,
Устане першая вясёлка
над ракою,
Загляне сонца раніцай ў акно,
Пачуеш песні жаўрука
над галавою,
І з’явяцца лісты на яблыні старой,
Бэз каля плоту зноў заружавее…
І панясуць над роднаю зямлёй
Нас ветразі кахання і надзеі.

* * *
Жаночае шчасце... Чароўная птушка...
Што ўварвецца ў дзён кругаверць,
Кожная з нас марыць стаць Папялушкай
І прынца аднойчы спаткаць.

Жаночае шчасце... Прыгожая птушка...
Махне нам каханне прызыўным крылом.
Трымціць у паветры вясельная стужка
І доўгае «горка» гучыць за сталом.

Жаночае шчасце... Прывідная птушка...
Калючае слова яго абарве.
І толькі сухая калючая ружа,
І як успамін — наш партрэт на сцяне.

**Льву Дабжынскаму**
Дабжынскі Леў, наш дарагі зямляк,
Таваё імя цяпер ўстае з нябыту,
З варункаў лёсу і ўсяленскае тугі,
Што сэрцам успрынята, перажыта.

Мы заміраем ля тваіх палотнаў
Прад глыбінёй, мастак, тваёй душы,
Прад прыгажосцю вёсачкі гаротнай,
Што мірна патанае у цішы.
Бацькоў сядзібы строгія абрысы
І дрэў высокіх таямнічы сум
Ты так цудоўна занатоўваў, жывапісец,
Як радасць светлую і развітальны сум.
Ты прамільгнуў, як яркая камета,
На небасхіле творчага жыцця,
А смутак, боль пакінуў нам і свету,
Усю сілу таленту свайго і пачуцця.

**Каложа**
І вечарам сінім, і ранкам харошым
За светлым натхненнем у пошуках слоў
Сюды прыходжу і зноў я і зноў
На Нёмана бераг, да роднай Каложы.

Храм старажытны Барыса і Глеба —
Аповед пра здраду і сілу радства —
Імкнешся ўгору, да сіняга неба,
Срод роднай прыроды, яе хараства.

Каложа, Каложа, святая Каложа,
Над Нёманам-бацькам стаіш на гары,
Каложа, Каложа, храм чысты, прыгожы.
Аб днях векапомных ты нам гавары.

Вымольвала лёс ты заўжды для народа,
Каб лепшую меў, а не цяжкую долю,
Каб жыта расціў ён на родным прыволлі
І быў бы ў думках і словах свабодны.

Вось так і стаіш усім віхурам адкрыты —
Прад вечнасцю храм, прад прасторам шырокім.
І шлях твой, Каложа, не будзе забыты —
Шлях векапомны, далёкі, вялікі.

* * *

Паслухайце старыя дрэвы
На самым пачатку вясны,
Пачуйце ў строгім напеве
Натужны іх боль векавы.

Краніце кару іх рукою,
Адчуйце і цвёрдасць, і тлен.
Упітвайце вечнасць душою,
У маўчанні застыньце прад ёй.

Паслухайце ціхую споведзь,
Дыханне сівой даўніны,
Бясхітрасны просты аповед —
Няма ў ім ні кроплі маны.

Аповед пра дні ліхалеццяў —
Яны міма дрэў не прайшлі,
І чорны знішчаючы вецер
Яны у сябе прынялі.

Аповед пра сілу кахання,
Прытулкам якому былі,
Ніякіх пачвараў насланні
Адолець яго не змаглі.

Паслухайце старыя дрэвы…
**Бурштын**

Сонцам і морам бурштыну дадзена жыццё,
Таму і часцінкі ў ім застылі назаўсёды,
Як бы цудоўнай прыгажосці адкрыццё,
Як дар адвечнай велічнай прыроды.

З бурштыну пацеркі дзівосныя надзень –
Рабілі так калісьці продкі нашы –
Хай у гармоніі з Сусветам булзе дзень
І чэрпай сілы ты з прыроды мудрай чашы.

**Зімы дзяцінства**
Ах, зімы дзяцінства…
Гурбы пад стрэхі,
Гульні дзяцінства,
Забавы, патехі.

Рукавічкі, валёнкі,
Шапка-вушанка,
Рачулка-студзёнка,
Сцяжынка-слізганка.

Буза, куча-мала
На гэтай сцяжынцы,
Пыл снежных баталій
Хлапчукоў і дзяўчынак.

Лыжні петлі-метры,
Сасёнкі ля кручы,
У вушах посвіст ветру,
У твар – снег калючы.

І крэпасць са снегу
Са сховай, з хадамі,

“Вайна” не для смеху,
Кастры вечарамі…
На кармушцы сініца,
З печаў – дым трубою.
Дзяцінства мне сніцца
І гэтаю зімою.



**Александрава Дзіяна Сяргееўна** (псеўданім Дзіяна Дабрадзеева, Дабрадзея) - нарадзілася 9 чэрвеня 1996, горад Астравец.

Дзяцінства прайшло ў вёсцы Падольцы. У пятым класе напісала свой першы верш, прысвяціла яго Радзіме. Пасля заканчэння школы паступіла ў Маладзечанскі медыцынскі каледж, дзе і пачала сваю актыўную паэтычную дзейнасць. Пасля каледжу працавала медыцынскай сястрой у Астравецкай ЦРБ. Але мастацтва перамагло жаданне быць медыкам: у 2016 годзе сыйшла працаваць у мясцовы цэнтр дзіцячай творчасці. Праз год з’ехала з роднага гораду. Па сённяшні дзень любоў да дзетак і вершаў стаіць у жыцці на першым месцы.

Вярнуўшыся на маленькую Разіму, у 2019 годзе нарадзіла сына. У 2021 вырашыла здзейсніць сваю дзіцячую мару: разам з сынам з’ехала ў вёсачку Буцюрмы Астравецкага раёна, дзе пачала пісаць казкі і займацца траўніцтвам. На сённяшні дзень творчасцю займаецца з дапамогай сацыяльных сетак.

Мова твораў: беларуская, руская, украінская.

Жанр: вершы, казкі.

****

Тварам кінутая ў глебу –
Адбіралі твае паветра.
Не прасіла ты зорак з неба,
Ні караляў з вядомасцю
светлай.
На сухой траве моўчкі ляжала,

За парогам ля роднага дому.
Для цябе было месца так мала,
Ты патрэбна была – нікому.
Даражэнькая, падымайся!
Я твае чырвоныя росы
Да адзінай збяру ў далоні,
Я з табою пайду побач босай!
На спіне пацягну да Галгофы,
На калені падаць не буду.
Я за тых, хто труціў цябе,
Адспяваю з усмешкай пакуту.
Што трывала ты столькі год,
Ды за што зашывалі вочы?
- Хопіць, чэрці,
плясаць карагод,
Адпусціце,
няхай вольна крочыць!
Не пакіну цябе паміраць –
Мае моц сваю святое слова.
Не маўчы.
Колькі ж можна маўчаць?!
Жыві вечна, Родная мова!

****

Што бачылі вочы матулі
За светам штодзённых турбот,
За мноствам сардэчных адтулін
Сярод апусцелых шырот?

Што бачылі вочы матулі
І колькі пабачаць яшчэ?
Ды толькі не бачыш ты,
Як маці чакае цябе.

Ты зноў да яе не прыедзеш,
Не знойдзеш хвіліны сказаць.
Спытаешся па суседзях:
“Ну, як там ды што чуваць?”

Яна паглядзіць у ваконца,
Слязінкі хусцінкай сатрэ –
І сціснецца матчына сэрца,
І думкі застынуць у імгле.

Твае дзіцячыя вочкі з-пад шкла
Фотарамкі глядзяць,
Як рукі тваёй адзінай
Ад болю і стомы дрыжаць.

Маршчынкі, сівыя скроні,
Бялюткі, як снежань, твар…
Ты не лічыў гадзіны,
Ты старасць яе не чакаў.

Аднойчы ты купіш квіток
На самы апошні цягнік –
Застыне сумленне тваё
І сэрца тваё забаліць.
Ты будзеш ляцець дадому,
Ты будзеш, што моц ёсць,
крычаць.
І стане табе агідна,
Што маці не мог абняць.

****

Я хочу себе дом в деревушке,
С добрым взглядом скромного мужа,

Чтобы ужин обычный, не суши,
Чтобы морем казалась и лужа.

Я хочу себе сад за окошком,
Чтоб по дому – запах сирени.
Чтоб на ухо мурлыкала кошка,
А на стенах – от пламени тени.

Я хочу, чтоб лесок в километре,
Листьев шум под босыми ногами.
Не по вкусу мне ваше
"быть в центре",
Мне приятнее жить с соловьями.

****
Что человек скрывает за улыбкой?
До боли грустные, стеклянные глаза.
Что там , внутри, за ледяной улыбкой?
Полупрозрачная потухшая душа.

Что прячет он под звонким,
ярким смехом?
И почему ночами он не спит?
Что скрыто там, за чёртовым успехом?
А там – дыра, которая болит.

Что в мыслях у него, когда смеётся?
Когда он веселится и поёт?
Как сильно его сердце
с криком бьётся!
Судьба играет, но не знает нот.

Что человек скрывает за глазами,

Когда слезятся, будто на ветру?
Не говорите: “Виноваты сами” –
С улыбкой, даже стоя на краю.

Что человек скрывает за улыбкой?
А там дорога из сплошных камней…
Такие не бросаются словами –
Свой пряча взгляд, становятся сильней.

Там, за улыбкой, слишком много боли
И крови вперемешку с молоком.
Такие люди не играют роли,
Лишь утверждают: “Мы переживём…”

Там, за глазами, человек-калека,
Заштопана улыбками душа,
И каждый день –
о скалы, да с разбега…
Им перевязка словом не нужна.

Что человек скрывает за улыбкой?
Ты не узнаешь, вовсе не поймёшь.
В ответ он будет лишь смеяться.
Пока на сердце барабанит дождь.

Такие люди любят улыбаться,
Пускай и переломаны судьбой.
Без повода привычно им метаться,
С улыбкой – только не живой…

****

Часто у меня вопрос всплывал:
Что такое счастье? Сколько длится?

А когда я вкус его познал,
Захотелось с миром поделиться.

Счастье – это солнца луч в глаза,
Когда знаешь, что наступит завтра.
Счастье – когда катится слеза,
От того, что счастлив – это правда.

Счастье – не курорт, не океан.
Счастье – когда дома всё в порядке.
Думаю, дано понять и вам:
Счастлив я, когда душа в остатке.

Счастье – это ужин на двоих,
Пополам кровать и одеяло,
И ты знаешь то, что не один,
Пережил, хотя судьба ломала.

Счастье – это книга, тёплый чай,
Дома фильмы в грустную погоду.
Когда кто-то шепчет: “Обнимай…”
Так верните же заботу в моду!

Счастье – когда дома ждёт семья.
Может быть, для вас это банально.
Счастье – это мамины глаза,
Именно они лечат морально.

Счастье – это самый верный друг
Прибежит на помощь среди ночи.
Когда слышит твой плачевный звук.
Счастье – это вовсе не поездка в Сочи.

Счастье там, где кто-то верно ждёт,
Кто-то любит и всегда скучает.
Счастье скоро каждого найдёт –
Только вот не каждый это знает.

Часто у меня вопрос всплывал:
Что такое счастье? Сколько длится?
Оказалось – рядышком оно.
Просто нужно жизни научиться.



**Святлана Еўтушэнка** (Ніна Міралькова) нарадзілася ў г. Светлагорску Гомельскай вобласці. Пасля агульнаадукацыйнай і музычнай школы паступіла ў музыкальнае вучылішча імя Н.Ф. Сакалоўскага. Па заканчэнні працавала на радзіме. Выйшла замуж і перабралася на Астравеччыну. З 2005 года жыве ў вёсцы Варняны, працуе выкладчыкам ў Варнянскім філіяле Астравецкай дзіцячай школы мастацтваў. Маці траіх дзяцей.

У дзяцінстве пісала прыгодніцкія аповеды, у юнацтве пайшлі вершы. Зараз займаецца малой прозай, казкамі. Жанр, у якім працуе Святлана Васільеўна, яна называе абразкамі. Яна словамі робіць зрэз сітуацыі, назірання, падзеі. Абразкі варта не столькі чытаць, колькі адчуваць.

Абразкі Святланы Васільеўны надрукаваны ў калектыўным зборніку “На крыльях вдохновения”.

**Чалавек – як дрэва**

Жыццё лепіцца кавалкамі і фрагментамі, а плануецца суцэльным пластом. То палатно, на якое наносіш грунтоўку і фарбаў слой. Плануеш ці прыдумляеш? Іншы раз здаецца, што ідзеш па краі. І дзіву даешся, як толькі выжываеш?!

У чалавека дні – галіны садовага дрэва. Адзіны ствол і прышчэплены сорт, скажам, белага наліву. Яблык становіцца смачнейшым!

Улічваючы сумяшчальнасць, прышчапіць можна любы сорт. А вось прышчэпа больш пераборлівая. Груша прымае толькі грушу – але сама прышчапляецца і на айву, і на яблыню, і на аронію, і на чырвоную рабіну. Лямцавую вішню прышчапляюць на сліву.

Для чаго гэта пералічваю? Бо прышчэпкі бываюць розныя – унутрывідавыя, міжвідавыя і міжродавыя. І чым далей, тым складаней прыжываюцца. Тое вядома. На словах! А калі займаемся выхаваннем дзяцей ці пошукамі спадарожніка жыцця, ці помнім?!

Чалавек можа нагадваць і навагоднюю ёлку. Чаго толькі на яе не начэпіш! Але свята пройдзе, і ты яе выкінеш. А ў дрэве свае карані! І пры асэнсаваным падыходзе жыццё плануеш, і ад таго, што вырасце, адыходзіш.

Дрэва з моцнай каранёвай сістэмай можна зрэзаць пад нуль і шчэпу прыжывіць з некалькіх пупышак. Доўга..

Крапатлівая праца – амаль што галоўнае. І яе нам дужа не хапае… Выхаванне – навука. Жыццё – разнавіднасць чаканняў.

**Не спыняйся**

Нават калі дзверы перад носам зачынілі. То не твае дзверы. Шмат метраў нагамі адмерай, і сваё знойдзеш. Не спыняйся. Яно можа быць меньшым, або проста замаляваным. Адмывай. Не шукай тое, што вочы рэжа. Адпускай. Я ведаю, жыццё не ў спакоі, а ў радасці. Хто яе дасць? Толькі сам. Чаму так складана жыць у пары? Бо ў птушцы, што ў клетцы, і ў той, што на волі, living рознае апярэнне. Як ім злівацца? Уступай.

Я за форму шара – мягкую і не калючую. Дзяліся, але не аддавай. Ці можна быць дужым, калі слабасці раздзіраюць? Зірні ў неба. Усё там. Ты сябе трымай, а сілы дажджом сыйдуць. Збірай! І не злуйся, калі дзверы перад табой зачынілі. Іх на зямлі столькі... Стукайся, нехта пачуе...

**Аб тым, што спаць не дае**

Галава не хоча слухаць мае словы. Круціцца, пысу ў бок адстаўляе. Не для яе. А як можна нешта сказаць, калі

цябе не чуюць! Падыйдзі з другога боку – пад прымусам. І як? Забяры і дай. Марная трата...

Вось куды зараз думка паляцела? У вырай. Падрэж крылы. Спыніла. Яна

плача... Не шкадуй. Дай волю. Вылятае... Але ўжо паўзком. Уцякае? Прымірэння просіць.

Сон – адбітак дня. Калі дзень пражыў у неспакоі... Ты – мастак. Ты любіш, ты малюеш, ты зарабляеш. Што намаляваў...

Дзень – пошукі жэмчуга са дна мора. Знайшоў – паспаў. Тэхніка ныранне і нічога болей. Вучышся затрымліваць дыханне.

***

Па ільду, што зацярушаны снегам, на які нагою стала – не праваліцца б... Гэта як пастка напалову – і знала, і не знала. І лёд не затрашчаў, і ногі ўстаялі. Дзякуй Богу, што ўтрымаў, а магло б быць такое... Я ж каля самага краю! Асцярожна і, як птушка, махаючы крыламі. Баішся, а ходзіш. Адкуль у чалавека столькі экстрыму? Што ён правярае? Свой нерв, ці глупства сваіх жаданняў? Ва што мы верым? Ва ўласную сілу ці Божае існаванне? Хто яго выратуе, калі раптоўна... Чалавек шукае прыгод, не баючыся смерці. Ці ён на тое права мае? Як самураі...

Філасофія жыцця простая – перагортваць дні, як старонкі кнігі, што чытаеш. Сама асалода прыходзіць праз дыханне. А рызыка? Што адчуваеш, ідучы па краю? Здольнасць стаць чалавекам – адчуць яднанне з Богам. Толькі ў палёце адрастаюць крылы. Усё залежыць ад думкі, з якой на лёд нагу ставіш.

**Сонца на лёдзе**

Сонца ўпала на лёд. Ён загарэўся.І я раблю паклоны, дзякуючы Богу за яго хараство. Жоўтым стаў блакіт, і ў жаўцізну апрануліся дрэвы. Пачаў гарэць лес...

У мяне пад нагамі снег. Скрыпучы і крохкі. Ад халоднага ветру пасінеў нос. Абмерзлі рукі. Сагрэю, падставіўшы пад промні. І цёпла, і холадна. Іду

шпарчэй.Чырвоныя шчокі пачынаюць балець. Я іх тру далонямі. Вецер не сціхае, але і сонца за хмары не хаваецца. Паветра празрыстае – бачу кожны сухі ліст, што нейкім чынам завіс паміж галін. Цені доўгія, размаляваныя, таму не страшныя. Такім днём жахі хаваюцца.

Я ўжо вяртаюся. Як пакінуць такое сонца? Забяру сабе ў кішэню. Кішэня

гарыць! Ты ўкрала сонца! Не, яно са мной падзялілася.

Радасці столькі, што холад у ёй заблытаўся...

**Прамаўчы**

Прабіваецца травінка скрозь халодную зямлю. Хочацца сагрэць яе пальцамі. Пацягнуць угару — бліжэй да сонца. “Я сама, — нібыта шэпча трава, — не ўтоптвай глебу – і мне будзе лягчэй”.

Я асцярожна саступіла на сцежку. Прысела на кукішкі і , ледзь дыхаючы, каб не перашкодзіць, назіраю за травой. Такая чыстая і тонкая. Ні пыліначкі. Як усё жывое, хоча жыць прыгожа. І каб вільгаці хапіла, і сонейка сагравала, і ніхто не біў...

Але ж мы топчам траву! А яна зноў і зноў галаву да сонца ўздымае. Расце і ў брудзе. І ў пыле. А мурзатай не бывае.

Здаецца, яна і нас не заўважае. І ног нашых не баіцца: “ Ну, сталі, прыціснулі. Далей жыць буду. А вось калі з карэнчыкам вырвуць, або не будзе чаго піць – памру”. Ей не

страшна памерці! Яна нікому ў жыцці не нашкодзіла.Мужна ўсё пераносіла, ні на каго не крыўдзілася і гучна не крычала. Ты пра мяне падумала? І пра сябе так сама. Чалавек заўжды шукае крайніх у сваіх бедах. Нехта абавязкова вінаваты. А чаму трава жыве моўчкі? Яна ж магла б, як крапіва, апячы. Па крапіве мы не ходзім, абмінаем яе, а траву топчам. Сорамна? Не. Па нечым жа хадзіць трэба. А вось тое, што шукаем крайніх, — праўда. Людзі рэдка кажуць: я вінаваты. Вось гэта сорамна...

Неяк на службе ў царкве бацюшка вучыў нас спавядацца. І галоўны займеннік быў – “я”. Я зрабіў, я зайздрошчу, я не дарую. Я! Не нехта мяне прымушае або схіляе, а Я і толькі Я сам. Вось такую споведзь Бог прымае.

Не хавацца за чужыя спіны, мужна, як трава, пазіраць на сонца і не баяцца

смерці. Лёгка?

А калі я сапраўды не вінаватая? Сказаць: “Мая віна”? Прамаўчы. Трава на цябе крычала? Не. Маўчанне беражэ сілы. Хай яны пойдуць на нешта лепшае. Трава б ніколі не ўзнялася, каб на кожны наш крок махала нам услед.

Дарогу адолее той, хто, ідучы, не разменьваецца на дробязі. Як важна: не весці пустыя спрэчкі. Хай Бог чалавека вучыць, а не мы з вамі.

**Слёзы**

Вецер свішча праз шчылінкі ў вокнах. Як ні закітоўваю, парыў не спыніць.

Прабіваецца праз шкло... Ты ўцякаеш, а ён за тобой ляціць. Ловіць твой шорах, гоніць прэч твой цень. Гне, як дрэва, — ты галінамі за паветра хапаешся і быццам плывеш.

Шкада, што не хапае крылаў, — я б навыперадкі з ім пабегла.А то ногі, як камяні, начапляюць глiністага пяску – не падняць. Спаборнічаць з ветрам – усё роўна што за пылам

ганяцца. Няма сэнсу! А калі яго прыдумаць? Ты шукаеш прыгод? Забароны.

У зачыненай прасторы – душна. Сама потым падставіш твар ветру. Той яго

паб’е, і ён пачырванее... Ты хочаш жыць у сораме?! Тады не бойся, хай свішча! А ці можна інакш? Толькі цёплае паліто і хустка.

Нават у чалавека, ад якога смярдзіць, трэба любіць яго бессмяротную душу.

Спытаеш: як? Някрыўдай. Не адказвай злом на зло. Лепей паплач...

**Званы, фікусы і законы**

У цябе сёння баліць галава? Ты ледзь паднялася? Паслухай званы святочнай нядзельнай літургіі.

Ёсць законы, да якіх трэба бегчы. Гэта як зімовае футра і скураныя боты, без якіх не пойдзеш у мароз па снезе.

На днях знаёмая папрасіла купіць фікус з вялікімі лістамі, што калісь стаяў у кожнай хаце. І я ўспомніла – у дзяцінстве і ў нас было такое дрэва, і з яго лістоў штотыднёва пыл збіралі. Для чаго? Я палезла ў інтэрнэт: фікус хатні з’яўляецца раслінай-фільтрам, спрыяльна адбіваецца на здароўі чалавека.

Расліны лечаць цела. Званы – душу.

Мы губляемся ў тым, чаго шмат. Вочы разбягаюцца, і становішся дурным. А ці іх прыкрыеш? Яны шукаюць і знойдуць! Таму і кажу: да сябе тулі толькі тыя законы, да якіх хочацца бегчы.

Можна гаварыць, можна слухаць, прайсці праз тоўшчу, разбіць лэб ільдом, але застацца фікусам, які ачышчае, а не брудзіць. Мо і яму складана, толькі ён чалавеку служыць не залежна ад таго, што ў паветры лунае.

Фікус узбадзёрвае, званы – узносяць. Як блізка...

Жыць не па тых законах, што ўчора прыдумалі, а якія час спрасаваў і вымераў.

**Зерне**

Яго не кідаюць у адно месца жменямі, а раскідваюць па ўсім полі. І яно расце, як легла – дзе гушчэй, а дзе і рэдка. І авёс, і проса, і жыта, і грэчка – хлеб, адно ім слова. І між імі прарастае пустазелле. І чым менш дагледжанае поле, тым яго болей.

Вы бачылі, як збожжа збіраюць? Адным укосам. І ў наступны год сярод зерня множыцца пустазелле. Руплівы гаспадар па восені яго выбірае, а абыякавы – застаецца без ураджаю. І галодны пачынае сытага есці… Па гісторыі мы тое праходзілі. Столькі год – і нічаму нас не навучылі…

Усё жыццё на кагосьці азіраешся – як той зрабіў, як гэты. Вучымся, пераймаем. Нешта не разумеем, але ўсё роўна на плечы накідваем. Навошта? Яно ж прарастае! А калі не сам, а падштурхнулі? Плечы твае? Ім і гнуцца. Чаму кажуць: пасля бою кулакамі не машуць? Ужо ёсць пераможны. Думаць апасля позна. Безумоўна, нешта можна правіць – адышоў адзін цягнік, другі прыйдзе. А час?! Пускаем хвіліны па ветры. А ў выніку – гады і стагоддзі.

Чаму я пра зерне распачала? Бо расце яно доўга – чакаць і чакаць… І калі не весці барацьбу з пустазеллем сёння… Не азірацца, як нехта, а як ты сам. Любы прымус павінен быць толькі твой, па тваёй добрай волі. Змагайся, адстойвай, я ведаю, што табе ад таго будзе горшэй, але менш сораму! І надзея на адраджэнне запалае пунсовым полымем.



**Казімір Сваяк** (Канстанцін Стаповіч) - паэт, драматург, публіцыст, каталіцкі святар.

Нарадзіўся 19.02.1890 года ў в. Барані ў мнагадзетнай сям'і. Тут жа атрымаў пачатковую адукацыю. Затым скончыў павятовую школу ў Свянцянах і духоўную семінарыю ў Вільні (1908-1914).

У 1915 годзе ў Пецярбургу пасвечаны ў ксяндзы. У якасці вікарыя быў накіраваны ў парафію Камаі, але "…з месяц па прыезду туды прыйшла нямецкая акупацыя. Побыт мой аказаўся там лішнім. Я прабываў тады цэлы год у сваёй роднай парафіі Клюшчаны, дзе дружыў з моладдзю, якая рвалася да новага жыцця. Аддуль назначаны быў у Карыцін (Беласточчына) – Карыцін, дзе я зруйнаваў сваё здароўе".

Казімір Сваяк разгарнуў рэлігійную і грамадска-асветніцкую дзейнасць на беларускай мове, прысвяціў сябе служэнню Айчыне і роднаму народу. Ён арганізоўваў у павеце беларускія школы (толькі за 1916 год з яго дапамогай у парафіі адкрылася сем школ), настаўніцкія курсы, стварыў касцельны хор, маладзёжную самадзейную суполку "Хаўрус сваякоў", якая наладжвала для вяскоўцаў беларускія імпрэзы, ставіла спектаклі. У сувязі з гэтым быў пераведзены на Беласточчыну. З 1920 года – пробашч у Засвіры (цяпер Мядзельскі раён).

Казімір Сваяк з'яўляецца аўтарам зборніка вершаў "Мая ліра" (1924), містэрыі "Купалле", драмы "Янка Канцавы" (1920, 1924), кніжкі для набажэнства "Голас душы" (1934), філасофскага дзённіка "Дзея маёй мыслі, сэрца і волі" (1932).

Казімір Сваяк – паэт лірычна-спавядальнага і драматычнага таленту. Хворы на сухоты, якія заўчасна звялі яго ў магілу, ён з нейкай асаблівай духоўнай апантанасцю служыў Богу і беларускай нацыянальнай ідзеі, паядноўваючы ў творах гэтыя два высокія пачаткі жыцця.

З першых гадоў вучобы ў семінарыі ўвайшоў у асяроддзе газеты "Наша ніва". Першы верш "На імяніны майго пробашча" Казімір Сваяк напісаў у 1912 г., а ў 1913 некаторыя яго творы ўжо былі надрукаваны ў газеце "Беларус". З 1919 года рэгулярна друкуецца на старонках беларускамоўных перыядычных выданняў. Вершы, апавяданні, эсе, філасофскія эцюды, артыкулы рэлігійнага і літаратурна-крытычнага зместу... Большасць твораў К. Сваяка напоўнены прагаю ісціны, пошукамі адказу на цяжкія пытанні народнага жыцця.

У 1924 г. у Вільні быў выдадзены адзіны прыжыццёвы зборнік яго вершаў "Мая ліра", які, як адзначалі крытыкі, адразу вылучыў паэта ў першы шэраг беларускіх паэтычных дзеячаў дваццатых гадоў.

А здароўе ўсё слабела… Паратунку паэт шукае ў горным санаторыі ў Закапаным. А. Станкевіч так апісаў канец жыцця К. Сваяка: "На папраўу здароўя ўжо не было ніякай надзеі. Разумеў гэта добра і ён сам… Жадаў толькі аднаго, каб "сярод сваіх мог дажыць кароткі свой дзянёк" і каб над ім "ня было дзярно чужое". Згодна з яго апошняй воляй пад канец красавіка 1926 г. удалося яго перавезці ў Вільню, у вагон з вагона носячы на насілках. 6 мая Казімір Сваяк (ксёндз Канстанцін Стэповіч), як свечка на алтары мук і цярпення, згас і адышоў у лепшую краіну".

Памёр Казімір Сваяк 06.05.1926 года. Пахаваны на могілках Роса ў Вільні.

**Загляне сонца...**
Загляне сонца ў наша ваконца,
Хатку асвеціць праменьмі -
Па цёмнай ночы ажывіць вочы
Боскім да працы натхненнем.

Позна мы ўсталі, і шмат праспалі,
Гойдалі злыдні нам долю -
Пяялі песні нам напрадвесні,
Радасці песню ў няволі.

Заход смяяўся, каб ён даждаўся,
У лапцёх што з труду мы спалі, -
Усход нас мучыў цяжка-балюча:
Хацеў, каб з душой мы прапалі.

Абы балота, будзе ліхота:
Дзёрлі нас нянькі-начніцы -
Аж да жывога - мо з волі Бога -
Кроў аж зрасіла зямліцу.

Аж застагнала зямля ў падвалах,
Неба пакрыў бліск агняны -
З болю зямліцы, з крыві крыніцы
Брат наш збудзіўся русняны.

Асвеціць сонца яго ваконца,
Злуду мар сонных развее -
І выйдзе з плугам ён саматугам,
Родненьку ніву засее.

Груган з Усходу, а крук з Заходу
Дарма там жыру шукае -
Бо зерне спорна, у волю прасторна,
Хутка пад неба ўзрастае.

**Эрас і Псіхея**
Я хацеў бы зірнуць ў твае вочы,
Там тайніцу душы адчытаць,
І ў трывожнай жыццёвай паўночы,
Я хацеў бы ў іх праўды шукаць.

Разгарнуць твае чорныя косы,
Цалаваць а паўночнай цішы,
На твар вызваць слязістыя росы,
Аддзяліці твой дух ад душы.

След іроніі з вуснaчкі сцерці,
Заглыбіцца да язні на дно, -
Для заблуднага свету умерці
І стварыці вяселле адно.

Не таі, не віляй - а прызнайся,
Што таёмна ты любіш мяне, -
А ці я... Ты мяне не пытайся:
Прада мной ты на яве і ў сне.

Дай душу мне тваю - больш не трэба,
Творчы дух ты народу аддай,
І так жыйма абое для неба,
І сваім ты мяне называй.

**Не чаруй**

Не чаруй мяне ты зорам,
Не чаруй красой;
Не чаруй сваім ты горам,
Не чаруй слязой.
Не чаруй ядвабнай коскай,
Ні вусноў агнём...
Не чаруй усмешкай боскай,
Ні святым жыццём.

Не чаруй дзявочым станам,
Не чаруй грудзьмі...
Каб не быў я пакараны
Богам і людзьмі.

**Хрысце**

Хрысце, відзіш маё сэрца
Маёй тайніцы душы:
Табе малюсь у паняверцы,
Мае слёзы асушы.
Выракаюся я грэху,
Шчыра плачу за блуды,
Прышлі ж урэшце мне пацеху
За нядолю, за труды.

Даеш гора мне з патрэбы,
Не забыў каб цноты я;
Бо у шчасці не здалеў бы
Паважаць красу жыцця…

Але ж крыж уеўся ў плечы,
Ланцугі у рук, у ног:
Ворагі паднялі мечы,
Каб паўстаці я не мог.

Хрысце Езу, пасля мукі
Меў жа Ты трыумфу час:
Развяжы ж і нам ўжо рукі,
Бо грахі прыдушылі нас…

На дарогу да свабоды
Дай жа нам святы Дар Твой:
Благаслаў усе народы
На збратанне, на спакой.

**Прад Богам**
Я глінай мяккай ў руках Тваіх, Божа,
Дух мой асобны нічога не можа,
Хоць з Тваёй ласкі і ў Тваёй сіле
Я несмяртэльны нават і ў магіле.
Я падарожны з высокай краіны,
Шукаю шчасця, і кожнай часіны
Мыслю: Крый Божа злуднае мары, –
Жыцця ў раскошы без бед і ахвяры…

Аднэй пацехі прашу Цябе, Пане,
Дай зразуменне і ўмілаванне
Праўды, што выйшаў з рук Тваіх я вольны
Выбраць няшчасце ці рай упатольны.

**Песня на каляды**
Пастушкі гулялі,
Каляду ігралі:
Бог нам аб’явіўся,
Хрыстус нарадзіўся
– Каляда-Каляда, гэй.
Не ў пышных харомах,
Ані ў панскіх домах:
У маленькай хаце
Яго туліць Маці
– Каляда-Каляда, гэй.

Трэба несці дары,
Трэба даць ахвяры:
Як мы і Ён кволы,
Хоць кругом анёлы
– Каляда-Каляда, гэй.

Гукнём нашу песню,
Як бы на прадвесні:
Хрыстус свет адменіць,
Голаў злу прышчэміць
– Каляда-Каляда, гэй.

Чэсць Табе, Марыя,
Чыстая лілія:
Цябе Божай Маці
Будзем называці
– Каляда-Каляда, гэй.

І Язэпу слава
Няхай бы паўстала:

Бо ў яго ж прынятку
Марыя з Дзіцяткам
– Каляда-Каляда, гэй.

А волікам тутка,
Што стаяць ціхутка,
І гэтай асліцы
Прынясём травіцы
– Каляда-Каляда, гэй.

Хвалім вельмі Бога,
Бо нам дарагога,
Спаслаў Сына з неба,
Каб душы даць хлеба
– Каляда-Каляда, гэй.

Браточкі гукніце,
На ўвесь свет пяіце,
Што Бог чалавеку
Спагадаў ад веку
– Каляда-Каляда, гэй.

**О, Край мой родны!**

О, край мой родны! Куды я ні гляну,
Дзе лёс мой дзіўны мяне ні закіне,
Што-колеч думкай сваёй ні закрану:
Са мной ты ўсюды у кожнай гадзіне.
Мо гэта маці так зачаравала
Сваёю песняй над ложам дзяціны,
А мо зязюля так накукавала,
А мо чар гэта мілае дзяўчыны…

Я знаў дзяўчынку з вёскі неўдалёчкі:
Яна мне казкі любіла казаці,
А мела слёзьмі залітыя вочкі,
вочкі, што трэба небу прыраўняці.

Умёрла з гора: з голаду вайною,
І так жа сумна прад сконам глядзела,
Як застывала мёртвай цішынёю,
Што маё сэрца жалем скамянела.

Над самым ранам, як будзіцца сонца,
Яна ўздыхнула глыбока-таёмна,
і, азірнуўшы слабы свет з аконца,
“Жаль мне зямліцы”, – сказала прытомна.

І на падушку слязінка упала,
Касулька сонца тварок асвяціла:
Так безнадзейна Мальвіся канала,
Сонца ж на грудках крыжык залаціла!

А слова жальбы скалыхнула грудзі
Чарам магутным, болем і трывогай:
і расхадзіліся, плачучы, людзі,
Шэпчучы скаргу нямую да Бога.

Адзін раз бурай жыцця скалачоны,
У безнадзеі на лепшыя змены,
Быў я пры смерці, палам знемажоны
Я зваў пагібель голасам пламенным.

Тады здалося мне, як бы наяве,
Прыйшла Мальвіся ў беленькай хустцы,
З пальцам на вуснах, у сумнай паставе,
Крыжык на грудках на чырвонай стужцы.

Так праз хвіліну нада мной стаяла,
Жаласным вокам агарнула ложа,
Мяне ж жудоснасць тады агартала,
Голасам зычным крыкнуў я: “О Божа!”

Мальвіся ціха сціснула мне голаў,
Чало мне з плачам раз пацалавала:
“Хоць безнадзейны, хоць бедны, хоць кволы,
Так, як народ наш, – ціхутка казала. –

Не траць надзеі нідзе і ніколі.
Працуй, чым можаш, каб зменшыць бяздолле,
Бо я дазнала, што ў нашай злой долі
Скрыта дарога на лёс і прыволле…”

На крыж мне сумна яна паказала,
Слёзка зрасіла ёй твар мармуровы,
і, як аблочак, павольна знікала,
Мяне абняўшы чарам таей мовы.

Ад таго часу краіна нядолі,
Што Беларускай на свеце завецца:
Краіна гора, без долі, без волі –
У маіх думках заўсёды снуецца.



**Менке Кац** нарадзіўся ў 1906 годзе ў Міхалішках. У 1920 годзе выехаў у Амерыку і амаль адразу стаў дасылаць свае першыя літаратурныя спробы ў яўрэйскамоўныя амерыканскія газеты. Зарабляючы цяжкай працай на жыццё, Кац вечарамі знаходзіў адпачынак у складанні вершаў пра родныя мясціны – Міхалішкі і Свір, пра раку Вяллю і блакітна-шэрае, а часам і чорнае беларускае неба. Зямля, на якой прайшлі і самыя шчаслівыя, і самыя цяжкія гады яго жыцця, назаўсёды засталася ў яго творчасці.

Менавіта Міхалішкі натхнілі Менке Каца на першую паэтычную кніжку “Тры сястры” (1932). Погляды паэта пад удзеяннем савецкай прапаганды былі тады пракумуністычныя. Але пазней, калі хваля рэпрэсій у СССР адкрыла яму вочы на рэчаіснасць, Менке перагледзеў свае адносіны да камуністаў. Другая яго кніга “Палаючае мястэчка” (1938) выклікала абурэнне яго левых сяброў. Адказ на іх абвінавачанні Кац напісаў у форме кнігі “Адказы маёй бабулі Багданы” (1939), у якой выказаў сваё грамадзянскае і мастацкае крэда непрыняцця таталітарызму і маны ў літаратуры і жыцці.

Друкаваўся ў яўрэйскамоўных амерыканскіх газетах “Форвард” і “Фрайгайт”. Пасля вайны пісаў на англійскай мове, быў адзначаны амерыканскай літаратурнай крытыкай. Ён выдаў на ідыш і англійскай мовах 18 кніг, сярод якіх ёсць навуковыя працы.

Памёр 24 красавіка 1991 года.

**Лес каля вёскі Заборцы**
Поўнач. Зімовая сьцюжа.
Ільдзістыя крышталі аздабляюць
паддашкі, як кветкі марозу.

Мароз выпісвае на
зьледзянелых шыбах лёсы
вандроўных бадзяг,

загубленых у лесе
пад Заборцамі. Галоўная воўчая
зграя блукае па лесе.

Малыя, пассаўшы цыцкі ваўчыцы,
выццём пранізваюць ночы
дзікага лесу.

Царэўна русалак, пад
зьверхнасьцю якой сьпявае хор мораў,
вяртаецца на бацькаўшчыну да

Рэчкі Вяльлі
з падарункам з-па-за свайго люстэрка
для маёй цудоўнай каханай

Парагулі, якая прыходзіць
ад зьмяркання да сьвітаньня цешыцца
са мной ў маіх марах.

**Вяртанне ў вёску Міхалішкі**

1.

Калі Вэльке-містык, увесь у лахманах і латах, вярнуўся з усіх тутэйшых пякелішкаў да абсмаленай крушні, што некалі была вёскай-пяюхай Міхалішкі, ён убачыў, нібы той Абрагам, кінуты ў вогнішча, - ружамі палаюць ускрэсіны. Ён продкаў убачыў сваіх, пыхлівых нябогаў.

Яны пратачыліся праз абсмаленыя гады, іх слёзы перамяшаліся з попелам Жабрацкай Прысады. З болем выла цішіня гучней за галодную зграю ваўчыную па-над месяцовым жахам лесу. Пер’е ненажэрных груганоў запаланяла вецер.

2.

Вэльке-містык убачыў Бога, што госцем на небе, як чалавек на зямлі.

Ён убачыў, як памірае Бог з апошнім промнем смяротнага заходу. Бог, мёртвы жабрак, благае жыцьця ад пылу, што некалі быў яго стварэннямі. О, каб жывы быў Янкель, даўганосы кравец, ён пашыў бы святы саян для Бога, але цяпер яму ляжаць зусім непакрытым з усімі мярцамі ў знікаючым лесе, у аголенай восені. Габрыель, вылецеўшы зь летуценняў Данііеля, абняў спачувальнымі крыламі райскую істоту Бога, праенчыў кадыш над першым і апошнім жыцьцём на Зямлі: Бог мёртвы.

3.

Вэльке-містык стаяў, падобны да байкара, слухаючы буру – тысячакратны праклён Богу, здзек з агорнутых навальніцаю нябёсаў, лямант, што разадраў прастору й час, долу зрынуў анёлаў. Ён чуў, як пярун за перуном абвяшчалі свой узыход на пасад Гаспадара, каб уладарыць спустошанымі нябёсамі, светам кожнай блыхі на зямлі.

4.

Вэльке-містык убачыў Мэсію, што над Бога нябачнай магілаю прамаўляў на развітанне з адумерлым уладаром жыцця і смерці: Бог, ты патануў у сваіх грахах. Калі я, сын Давіда, з’яўлюся – ты ўстанеш, як і ўсе смяротныя, на адпушчэнне грахоў і чарвяку, і чалавеку, і скаціне.

Толькі тады ты зможаш сказаць, што святло першага золку – гэта добра, і што рай, толькі бязь пекла, - гэта добра, і зямля без жалобы – гэта добра. Ён убачыў адыход Мэсіі, што злажыў аброк вярнуцца напрыканцы ночы і дня. Разгублены натоўп паўшых анёлаў, як зблукала быдла, прысебрыўся да танцораў-мядзведзянятаў, гарэзаў-ласуноў.

**Размова пры стале**

**1. Да гары**

Размова пры стале – гэта адвечнае падарожжа з часоў, калі на свеце былі цягнікамі вятры, хмары – караблямі, а кіт Іоны – першай падлодкай, толькі спушчанай на ваду, даць тарпэдай па грахах Нінэвіі. О, так праходзім з табою праз час і прастору за кубачкам кавы, мы блізімся да канца смутку. Я бачу, як вязьніца відовішчна ператвараецца ў замак, дзе мая чароўная каханая будзе марыць пра мяне тысячу гадоў, пакуль я не прыйду абудзіць яе пацалункам і не павяду яе да нашага вострава небывалага свету – да нашага стала.

Вечар. Сонца коціцца пад коламі, як затаптаны твар прыдушанага Геркулеса. Апошнія прамяні – анёлы, аслепленыя дымам. Ва ўсіх вітрынах распрадаецца збляклае сонца, бы яблык з Садому. Ноч. З нажамі ў зубах гвалтоўнікі сочаць за кожнай жанчынай: аголенай нявестай,

згвалтаванай на сметнікавай кучы. Цені іхныя цікуюць па завулках пад спалоханымі зоркамі. Падазроная рука нагадвае змея, што спакусіў матухну Эву пад забароненым дрэвам. Смерць на вуліцах: гэта стрэльба ў выглядзе Бога. Мы ля нашага стала вечныя, смерць – выдумка далёкіх часоў, але летнія нябёсы майго дзяцінства заўсёды будуць нагадваць пра блакітнае забойства. Я навучыўся ад мудрых ваўкоў абмінаць святло, хавацца ў логаве адзіноты. Я бачыў, як памёрлыя жаўнёры баяцца, што старэйшыя па званні (чысцюткія, як адліхтаванае зло, з вачамі лютымі, як тыя зацятыя мурашкі) пагоняць іх, мёртвых, паміраць зноў, калі яны не ўстануць, каб казырнуць уладару магілаў. Я бачу дрэва, што выцягнулася ўпоперак вуліцы, што хіліцца да д’ябла: скалечаная памяць
мая.

Пераклад вершаў Т. Галідэй



**Коўтун Валянціна Міхайлаўна (1946-2011),** паэтэса, празаік, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук. Сябра СП БССР (з 1975), СП СССР (з 1976). З 1976 — літсупрацоўнік, з 1979 — рэдактар аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя», з 1982— загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Юнацтва», з 1990 — старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя», з 2006 — рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць». Старшыня Усебеларускага жаночага фонду святой Еўфрасінні Полацкай (з 1993). Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1986) за кнігу паэзіі «Метраном».

Валянціна КОЎТУН лёсам з Варнянамі была звязаная толькі некалькі гадоў, тым не менш, гэтая выбітная жанчына, паэтэса, празаік, драматург, перадкладчык, літаратуразнаўца назаўсёды засталася ў памяці людзей, якія працавалі побач з ёй, і якіх яна вучыла.

Валянціна Коўтун нарадзілася ў вёсцы Дземяхі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў настаўніцкай сям’і. Пасля школы вырашыла стаць педагогам. Была студэнткай рускага аддзялення філалагічнага факультэта Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Івана Франко, праз 4 гады перавялася ў БДУ. Скончыла аспірантуру БДУ і абараніла кандыдацкую дысертацыю “Паэтычная структура беларускай пазаабрадавай песні пра каханне” ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі Навук БССР.

Па размеркаванні трапіла на Астравеччыну. Першым працоўным месцам Валянціны Коўтун павінна была стаць

Гудагайская вячэрняя школа, але маладую настаўніцу рускай мовы і літаратуры перанакіравалі ў Варнянскую сярэднюю школу.

Усё свядомае жыццё жанчына працавала ў галіне літаратуразнаўства: у часопісах “Полымя”, выдавецтве “Юнацтва”, рэдакцыйна-выдавецкай установе “Літаратура і мастацтва”. Некаторыя работы падпісвала творчым псеўданімам Леся Беларуска.

Упершыню яе вершы пачалі друкаваць у 1966 годзе. Валянціна выдала паэтычныя зборнікі “Каляровыя вёслы”, “На ўзлёце дня”, “На зломе маланкі”, “Мы робім казку”, “Вясёлы заасад”, “Лісты да цябе”, “Свяча любові”, “Малітва да Калымы”. За кнігу “Метраном” атрымала Літаратурную прэмію саюза пісьменнікаў БССР імя Аркадзя Куляшова. Была плённым празаікам і драматургам: напісала шэраг твораў, прысвечаных выдатным беларускім асобам, у тым ліку Алаізе Пашкевіч (Цётцы), Еўфрасінні Полацкай, Яўгеніі Янішчыц і іншым. Перакладала з рускай, балгарскай, літоўскай і іншых моў. Стварыла Усебеларускі жаночы фонд Еўфрасінні Полацкай, які праіснаваў да 2005 года.

Валянціна Коўтун падтрымлівала стасункі з былымі калегамі і вучнямі, завітвала на імпрэзы і творчыя сустрэчы ў Варнянскую сярэднюю школу.

****

Вясна сваім крылом атуліць
Бярозы шчырую душу…
Я ліст вясновы да матулі
Імклівым раўчуком пішу.

Аловак мой звініць,
                                спявае,

Закрэслівае злыя дні
І стрыжань-прамянёк хавае
У патаемнай глыбіні.

Здаецца ўсё такім нязвыклым
У вольным небе,
на вадзе.
Над полем шпачыных крыкаў
Зялёны дым угору йдзе.

Птушыны сум –
гняздо радзімы –
З маленства ў сэрцы я нашу…
Пяром зялёнае шыпшыны
Я да матулі ліст пішу…

**Еўдакіі Лось**
Зрываюць песні, як з бяроз бяросту…
Палаюць вёсны. Крышацца сады.
Мы ўсе ідзём да той мяжы і ўзросту,
Калі сказаць нялёгка праз гады.
А я твой шлях кароткі бласлаўляю.
І хто там скажа, што паўторыць шлях?!
Не спіць, не гасне і не памірае
Святло жанчыны ў студеных вачах.
Плывуць крыжоў гарачыя аблокі,
Кіпіць трава на мове каранёў.
Бяссмерце – там…
А крок будзённы – лёгкі!
Мы твой пагорак, пэўна, абмінём.
Але ў агні, у горкім азарэнні,
Калі рукой дастаць да адкрыцця,
Перацярпеўшы ўзлёты і падзенні,

Мы зразумеем сімвалы жыцця.
Сярод імхоў бетоннага прагрэсу,
Калі душа з тваёю на мяжы, -
Дай бог дажыць да ўзросту паэтэсы,
Дай бог да паэтэсы нам дажыць!

**Паэзія**
Бяссонне назаўсёды… Як калісці,
Прыйду у сад да першага святла.
І буду зноў здзіўляцца, што праз лісце
Я, нібы промень месяца, прайшла.
І ўсім святлом сваім, начным, азяблым,
Я асвятляю гэты дзіўны сад,
І яблык у маіх руках – не яблык,
А толькі цень яго тугіх зярнят.
І пачуццё, як сум па нейкім доме,
Вядзе мяне у засень ад галля…
А хтосьці да мяне ўжо быў, як промень,
І не дажыў да дзённага святла.

****
Белы гром над маёй галавой,
Што ты ходзіш па цёмнаму небу?
Што хочаш ад спелага хлеба,
Белы гром над маёй галавой?

Белы дзень за маёю спіной!
Прыйдзе час нематы і знямогі,
Ды падыме праменні з дарогі
Белы дзень за маёю спіной.

Белы конь у трывозе маёй, -
Ты ляціш раніцою да сына.

Хто цябе асядлае ўспамінам,
Белы конь у трывозе маёй?!

Прывячаю вясеннім агнём
Кожны подых і кожнае слова…
І жыццё пачынаюць нанова
Белы дзень…
Белы конь…
Белы гром…

****
На сустрэчу запальваем свечку
У храме змучаных сонцам палян.
Вось і мне раптам кінуў вуздзечку
Позірк твой, нібы чорны цыган.

Я не знаю, за што мне адплата,
Я не знаю, навек ці дарма
Маё царскае "эго" распята
На тваё, з хрыпатцою, імя.

На імя тваё… (Літасці трэба.)
На палын развітання і гнеў.
Смакам страсці, надзеі і хлеба
Ты вяртаеш мяне да мяне.

І шалёная тая карэта
Раптам, глянь, з вышыні ды ў прыбой.
Я адна, але ўся – перад светам.
Не адна і не ўся – прад табой!

**Курыла Станіслаў Антонавіч** нарадзіўся ў 1957 г. ў в. Ігнацова Астравецкага раёна. У 1975 г. атрымаў атэстат у Варнянскай сярэдняй школе. Менавіта у школьныя гады адбыўся яго паэтычны бенефіс: верш пра матулю надрукавала “Астравецкая праўда”. Пасля школы працаваў загадчыкам сельскага клуба. У 1976-1978 гг. служыў у арміі. Працаваў на заводзе у Вільнюсе, затым 22 гады жыў у Ленінградзе, цяперашнім Санкт-Пецярбургу. Вершы прадоўжыў пісаць, калі вярнуўся на радзіму на пастаяннае месца жыхарства.

Станіслаў Антонавіч – аўтар двух самвыдатаўскіх зборнікаў вершаў: “Зоркі гараць” і “З неба я да вас зваліўся”. Вершы друкаваліся ў газеце “Астравецкая праўда”, “Знамя юности”.

Вершы Станіслава Курылы лірычныя, праўдзівыя, у кожным з іх адчуваецца погляд аўтара на жыццё, адлюстраваны асабістыя пачуцці і адчуванні, прысутнічае і пачуццё гумару, вельмі трапнае і абвостранае, патрыятычныя, цёплыя, лёгкія для ўспрымання. Жыве ў в. Ігнацова.

****

Я калісь нарадзіўся
пад сузор’ем Стральца,
Каля Млечнага шляху блізка,
На радасць бацькам,
што такога хлапца
Нарадзілі, люлялі ў калысцы.
Зімовыя ночы, амаль без канца
Цягнуліся. Мама спявала –
І песні ляцелі ў сузор’е Стральца,
Якія яна мне пяяла.
Поўныя ласкі й пяшчоты былі

Песні з водарам жытняга хлеба.
У сузор’е маё паміж зорак плылі,
Адляталі ў высокае неба.
І сузор’е, узяўшы мяне пад крыло,
Пад надзейную лёсу ахову,
Берагло,
Каб жыццё, як рачулка, плыло,
Каб шчаслівы я быў і здаровы.
Зберагае сузор’е ад усякіх нягод
І жыццёвы мой лёс асвятляе.
Толькі песня матулі
ужо многа год
Да сузор’я майго не ўзлятае.
Ты свяці мне ў небе,
сузор’е Стральца!
На зямлі майму лёсу дарогу
Пакажы. І з табою я да канца
Прайду ўсё –
і адпраўлюсь да Бога.
****
Здымайце шапку
перад лесам
Узмахам ветлівым рукі!
Мы ў яднанні з ім
сумесным –
Не будзе ў гэтым грэх які.

… І сустракае лес маўкліва,
Між дрэў хавае цішыню.
Глядзіць – заўважце –
палахліва:
Ці не прынеслі вы агню?

Ці не прынеслі вы сякеру,
Каб дрэўца юнае ссячы?
Хай па-сяброўску
лес паверыць,
Што вы прыйшлі дапамагчы.

І прывітае з інтарэсам,
Узмах прыкмеціўшы рукі.
Здымайце шапку
перад лесам –
Ці ж будзе ў гэтым грэх які?!

****

Хочаш цішыню кранучь?
Рукой павольна правядзі…
Навокал,
вокам як зірнуць,
Снег белы кружыць…
Паглядзі!
Ён цішыню злёгку люляе,
Яе у бель сваю бяляе,
І ціха на зямлю лажыцца,
І дазваляе датуліцца…
Ты гэтай белай цішыні
Сваёй далоняй зачарпні.
І буду кроплі
з рукі капаць…
І цішыня ўмее плакаць!

**Захапленне**

Ты й раней была – не наглядзецца
І цяпер вачэй не адарваць.
І куды гады змаглі падзецца? –

Знешнасць маладую захаваць.
Як яны цябе не зачапілі?
Размінулі, пэўна, лёс з бядой.
Прыгажосцю вечнай адарылі.
Каб была заўсёды маладой.
Як табе пашчасціла з’явіцца,
З божым дарам дзіўнай прыгажосці.
Бескарысна зможаш падзяліцца,
Тым сакрэтам вечнай маладосці.
Ашчасливіць лёс з табой сустрэцца.
Захаплення няма сіл схаваць.
Ты й раней была – не наглядзецца
І цяпер вачэй не адарваць.

**Анюта**
Якою моваю сказаць,
Каб мною ты была пачута?
І з пачуццём якім связаць –
Ганна, Анечка, Анюта.
Каб казыталі словы слых
І іншай мовы не шукалі.
Знайшоўшы шчасце на дваіх.
Сваім каханнем наталялі.
Каб пераблыталі дзень з ноччу
І час спыніўся бы для нас...
І блізка-блізка былі б вочы
І з вуснаў піць салодкі квас.
О! Ганна, Анечка, Анюта!..
Мы ў паветры нечакана.
Да шчасця Бог стварыў маршруты –
На небе браць шлюб закаханым
**Галінка**
Ні вецер галіны хістае,

Бэзу ламае дзяўчынка.
Шчасце сваё шукае.
Знойдзеш яго, Галінка.
Толькі патрэбна верыць,
Моцна надзею трымаць.
Да шчасця дастукацца ў дзверы,
Ні бэзу галінку зламаць.
Перабірае суквецце,
Кветак старанна Галінка.
Чакае ў вясне, ці ў леце,
Кахання твайго, палавінка.
Злёгку яе ап’яняе,
Бэз сваім пахам чароўным.
Дзверцу душа адчыняе,
Перад пачуццём галоўным.
Абодва сп’янеўшы ад паху
І шчасця свайго на хвілінку,
Моцна прытуліць падпаху,
Твая палавінка, Галінка.
І прапануе вянчанне,
З бэзу вялікім букетам.
Сэрца запоўніць каханне –
Можа вясной, можа летам.

**Загадкавыя жанчыны**
Нашы дзяўчаткі, каханкі-жанчыны:
Словы якія вам лепей сказаць?
Гэтак нялёгка бывае мужчынам,
Калі настае час каго выбіраць.
З хваляў марскіх рыбкі вы залатыя.
Выканаць зможаце нашы жаданні.
Калі недаступны – амаль што святыя,
Пакуль не кране ваша сэрца каханне.

Шчасце – у вашых уласных руках.
Каханне з цёплай іскры разгарыцца.
Злучыцца з некім жыццёвы ваш шлях –
Гэтым усім давядзецца дзяліцца.
І, аб'яднаўшыся, дзве палавіны –
Сэрца і душа быць разам павінны.
Толькі загадкавасць вашу, жанчыны,
Не здольны ўсю разгадаць мужчыны.

**Мая вёсачка**
Як яблыні й вішні,
Зацвіталі вясною,
Табе, мая вёсачка,
Не было ўжо спакою.
Як тая нявеста,
У вэлюме белым,
За некага замуж
Ты, мусіць, хацела.
Лета і восень,
І зімы ляцелі.
Другія гулялі з табою вяселлі.
Кляліся ў каханні
Табе гэтак шчыра
І адляталі –
нібы птушкі ў вырай.
Асірацела, зусім занядбала
І жыхароў засталося ўжо мала.
А ты ўсё чакаеш:
Прыедуць у госці,
Ці назаўжды
Можа вернецца хтосьці!...



**Кухарэвіч Людміла Іванаўна** (1946), ветэран педагагічнай працы, паэтка. Нарадзілася ў Мінску, але ў гадавалым узросце разам з бацькамі-настаўнікамі прыехала на Астравеччыну, дзе і правяла ўсё сваё свядомае жыццё. Закончыла Гродзенскі педагагічны інстытут. Людміла Іванаўна шмат гадоў аддала Варнянскай сярэдняй школе: выкладала беларускую мову і літаратуру, сусветную мастацкую культуру. Арганізавала літаратурна-мастацкае аб’яднанне “Спадчына”, якое с цягам часу стала называцца “Варнянская хатка”. У гэтай гасцёўні пабывала шмат знакамітых беларускіх пісьменнікаў. Ветэран педагагічнай працы.

Людміла Іванаўна таксама піша музыку, спявае, працяглы час была ўдзельніцай калектыву “Світанак”, зараз актыўна спявае сольна і ў народным хоры ветэранаў.

Вершы Л. Кухарэвіч друкуюцца ў “Астравецкай праўдзе”, надрукаваны ў зборніках “Астравецкі край”, “Астравецкай зямлі галасы”, “На крыльях вдохновения”, “Восхождение”

Жыве ў аграгарадку Варняны.

**На могілках на “Дзяды”**

Адгаварылі, адспявалі,
Адпрацавалі і адваявалі,
І ў цішыні пад небам чыстым
Яны ў вечнасці ўрачыстай
З нябес глядзяць на нас маўкліва.
- Дзяды, дзяды! Дзе ваша сіла,
З якой вы жалі, пралі, ткалі,

Зямліцу шчыра абраблялі?
І, як адказ, гучыць ад неба:
“Яна ў зямлі, у роднай глебе,
Яшчэ ў зярнятках, ды ў вадзіцы
Срабрыста-чыстай ад крыніцы.
У кожным дрэўцы і ў раслінцы,
У кветцы гожай і ў расінцы,
У ясным сонейку, зіхотным,
У снапочку спелым, умалотным,
У далонях моцных, працавітых,
Любоўю, шчодрасцю налітых,
У памяці, што нас шануе,
Патомкам моц, жыццё даруе.
Вы свечку ціха запаліце,
Аб нас малітву распачніце!”

****

Дакраніся да сэрца
Сваёю красой,
Дарагая мая, адзіная.
Адзавіся светлай,
Празрыстай душой
Песняй вясны салаўінаю.

Неба блакітам
І спевам крыніц,
Шэптам лесу,
Гаючымі праскамі,
Яркім сполахам
Начных зарніц,
Палыном і сваёю ласкаю.

Будзь мне матуляй,

Радзіма мая,
Ад калыскі і ў жыццёвых завеях
Да цябе прыхінаюся
З любасцю я
І ў абдымках тваіх маладзею.

Веру – прыйдзе часіна твая,
Светлая, добрая, зорная.
Аб табе мае думы і песня мая,
Старана мая непаўторная.

**Шчасце, пакліч!**
Шчасце, дзе ты, скажы,
Дзе жывеш,
Па якіх ты дарогах ідзеш?
Ты пакліч і з сабою вазьмі,
Ласкай сэрца свайго атулі.
Хай палае касцёр давідна,
Вып'ем чаркі свае мы да дна,
З песняй к зорам узляцім у вышыню,
Хваль разбудзім вакол цішыню.

Хто сказаў, што імчацца гады,
Што шчаслівы, пакуль малады,
Маладосць, як паходня, згарыць
І жар-птушкай у неба ўзляціць.
Хай палае касцёр, як зара,
Нашых стрэч і растанняў пара,
Сэрца з сэрцам з'яднаем у цішы,
Каб прачнулася радасць у душы.

Дзесці блізка ля шчасця былі,
Цёмнай ночкай на хвалях плылі.

Дожджык слёзы праплакаў свае,
Чуў ён: шчасця для нас не стае.
І касцёр адпалаў, прызатух,
А ля вогнішча толькі ўдвух.
Не сумуй і не плач, цішыня,
Ты – не мой, я – твая? – Не твая!

Шчасце, дзе ты, скажы, дзе жывеш,
Па якіх ты дарогах брыдзеш?
Ты пакліч і з сабою вазьмі,
Толькі шчыра пакліч, не змані!

**Вясновая музыка**

Граюць музыкі высокага неба,
Славячы сонца, зямлю і вясну,
Кормяць палеткі азімага хлеба,
Лашчуць рачулку, кусты і траву.
Свішчуць у дуды – вятры ўздымаюць,
Хмарак-дзяўчынак вядуць карагод.
А калі ж разам у цымбалы зайграюць.
У поле выходзіць святочны народ.
Песні-вяснянкі ляцяць аж да сонца,
Ім падпяваюць буслы, жаўрукі,
І ў залацістай прасторы бясконцай
Скібы палёў наразаюць плугі.
Музыка працы – яна наймілейшая,
Ёю жыве і ўпрыгожаны свет.
Выйдзі ж у поле, у дзень найяснейшы, -
Каб на зямлі ты пакінуў
Свой след!

**Летнім вечарам**

Дагарае дзень –

І ў ціхім садзе
Млявы ветрык
Шапаціць ліствой.
Сёння я сама
З сабой ў ладзе,
Мроі-думкі
Усе мае са мной.
Купал неба
Цёмна-сіні, ў зорах,
Мне на плечы
Хустку падае,
І ў важкай
Ад цяпла пpасторы
Салавей залівіста пяе.

**Ля храма**
Дакраніся да храма сцяны,
Дакраніся – і ў ёй растварыся.
Чуеш – у сэрцы звоняць званы,
У вечнасць клічуць – і ты адзавіся.
Усёй істотай адчуў палёт
Мажных сценаў і вежаў высокіх.
Праз стагоддзі – душы ўзлёт
Да нябёсаў у сівыя аблокі.
Ты адчуеш агонь і лёд,
Смерць – забвенне ад цяжкай мукі,
Жыццядайнага сонца ўзыход
І жыцця працавітыя рукі.
Цені продкаў і іх галасы
Прад тваімі плывуць вачыма….
Слухай ўважліва іх, не спяшы,
То мінулае нашай Радзімы.
Нават час сцішае тут крокі свае,

Каб малітвай святой наталіцца,
Светла, зладжана хор у храме пяе,
Як струмень жыватворнай крыніцы.

**Маленькая радзіма**

(песня)

Дзе шэпчуць лозы ля ракі,
Дзе салаўі пяюць усю ночку,
Там туманы ў лугах усплылі
І заблудзіліся ў садочку.
*Прыпеў*: Мая маленькая радзіма
Святлом любві сваім узрасціла.
Твая вялікая душа,
Мая маленькая радзіма!
Дзяцінства зорнага ўзлёт,
Юнацтва яснае світанне,
І светлых мар маіх палёт,
Кахання першага растанне.
*Прыпеў:* Мая маленькая радзіма
Святлом любві сваім узрасціла.
Твая вялікая душа,
Мая маленькая радзіма!
Тут ногі босыя мае
Цяпло дарог тваіх адчулі.
О, як цяпер мне нестае
Усмешкі роднае матулі.
*Прыпеў*: Мая маленькая радзіма
Святлом любві сваім узрасціла.
Твая вялікая душа,
Мая маленькая радзіма!
Тут мой пачатак і працяг,
К табе я сэрцам парываю,
Зямля бацькоў, дзядоў зямля, -

Ты для мяне зямля святая.
*Прыпеў*: Мая маленькая радзіма
Святлом любві сваім узрасціла.
Твая вялікая душа,
Мая маленькая радзіма!


מסכת
בבא קמא
מן
תלמוד בבלי
ווילנא

**Ааўраам Бер Лебензон** (1787-1878), паэт, драматург, педагог, выдавец, рэлігійны рэфарматар. Нарадзіўся ў в. Катлоўка. Атрымаў адукацыю ў віленскіх яўрэйскіх вучэльнях і ўжо з 11-ці гадоў праславіўся ў Вільні выбітным талмудыстам. У 1800 г. скончыў курс у яўрэйскай вучэльні ў Міхалішках, але працягваў вывучаць кабалістыку і філасофію рэлігій. У 1808 г. ён атрымаў месца яўрэйскага духоўнага суддзі ў г. Ашмянах і пачаў вучыць яўрэйскіх дзяцей. У 1848 г. быў прызначаны старэйшым настаўнікам яўрэйскай і халдэйскай моў пры былым Віленскім равінскім вучылішчы і заставаўся на гэтай пасадзе да 1864 года.

Яго “Новае тлумачэнне да некаторых кніг Біблії” з'явілася ў 1858 г .; іншыя яго экзэгетычныя працы былі выдадзены ў Вільні ў 1849-1853 гг. У 1867 г. з'явілася таленавітая алегарычная драма “Праўда і Вера”, таксама па-яўрэйску. Акрамя гэтых прац, ён змяшчаў артыкулы ў яўрэйскіх газетах; напісаў малітву з нагоды каранавання імператара Аляксандра II, за што атрымаў брыльянтавы пярсцёнак, і ў 1861 г. сярэбраны медаль на Станіслаўскай стужцы.

Памёр у Вільні.



**Антон Мальшэўскі** нарадзіўся ў Маладзечна. Вучыўся ў 3-й школе з паглыбленым вывучэннем французскай мовы. Ва ўзросце 10 гадоў разам з сям'ёй пераехаў жыць у Смаргонь, дзе закончыў гімназію No 4.

З 2005 года працаваў у Смаргонскай газеце «Светлы шлях». У 2006 перабраўся ў Астравец, працаваў журналістам у раённай газеце «Астравецкая праўда», завочна закончыў БДУ, факультэт журналістыкі.

Зараз працуе журналістам у газеце "Ашмянскі веснік".

Ад маці і бацькі пераняў любоў да сваёй зямлі, роднай мовы і маленькіх утульных гарадкоў, дзе ты сапраўды адчуваеш сябе дома. Ад бабуль і дзядуль — уменне працаваць і адпачываць. Ад малодшых братоў — любоў і цярпенне да малодшых.

* * *

Я иду к тебе по крышам,
Каждый шаг как можно тише,
И невидим, и неслышен
Я.
Я иду к тебе по звёздам
И приду не слишком поздно,
Если буду осторожен
Я.
Я иду в лучах заката
По дороге, что мне свята.
И к тебе дойду когда-то
Я.

Я спешу к тебе навстречу,
Я бегу как можно легче.
И тебя случайно встречу
Я.
Я приду к тебе по травам,
По цветам да по дубравам,
Пробегу по мрачным скалам
Я.
Я приду к тебе из книжек
Про девчонок и мальчишек,
Средь любви и страсти пышной
Я.
Я лечу с попутным ветром,
Сарафан, расшитый светом,
Обнимаю нежным летом
Я.
Я спущусь к тебе грозою,
Пеленой дождя косою,
Ноги орошу росою
Я.
Ты сидишь и смотришь в небо,
Доверяешь ты мне слепо,
Высоко там очень где-то
Я.
Ты увидишь знак мой тайный,
Так тобою долгожданный,
Для всех прочих буду странным
Я.
* * *

А для шчасця шмат не трэба:
Бутэлька піва ды кавалак хлеба.
Рукі родных і сяброў,

Ды на сэрцы любоў.
Шчасця-птушку шукаюць здаўна,
Ніхто яе не бачыў. Ды ці ёсць яна?
Кожны шчасце сваё чакае
Любою парою, дзень то ці ночка.
Камусьці багацце,
камусьці здароўе,
Каму — асілак сын,
каму — красуня дочка.
Хто знаходзіць — той мацнее,
А хто не — таму не спіцца,
Ён вандруе недзе ў свеце,
На радзіме не сядзіцца.
Азірніся: навокал шчасця
Хопіць усім, табе і мне.
Рэчкі, поле і дубравы —

У нашай роднай старане.
Мудрасць бацькі, ласка маткі,
Меншы брат твой ці сястра,
Вочы любай, яе вусны,
З сябрамі песні ля кастра.
* * *

**Что есть жизнь?**

Что есть жизнь?
Лишь крик твой первый,
Лишь последний вдох.
Что есть жизнь?
Лишь шаг твой смелый
От родных ворот.
Что есть жизнь?
Веселый праздник,

Где ты просто гость.
Что есть жизнь?
Веселый дождик,
Семицветный мост.
Что есть жизнь?
Уста любимой

Да твой верный друг.
Что есть жизнь?
Бокалов звонких
Кристально тихий звук.
Что есть жизнь?
Трава у дома,
Зелень светлых дум.
Что есть жизнь?
Прощальный шорох,
Последний сердца стук.
* * *

На часах уже двенадцать,
Ночь разбилась новым днем,
Мы сидим над кружкой кофе
И не знаем, что мы ждем.
Забвенью время предавая,
Гулко тикают часы.
Мы сидим над кружкой кофе,
Внимая песне тишины.
Гудит негромко холодильник,
Тихо капает вода.
Мы сидим над кружкой кофе,
Стынет на плите еда.
Комарихи тонкий голос,
Цветы-картины на стене,

Мы сидим над кружкой кофе
И внимаем тишине.
Каждый вечер так на кухне,
От темна и до темна.

****

Спаси мою веру,
сохрани мою память.
Всё золото возьми,
оставь мне только лапоть,
Что б щей похлебать,
чтобы вечер скоротать,
Что б не так обидно
было помирать.
Взором своим ясным
на меня взгляни,
Об одном прошу: спаси и сохрани,
Спаси моего брата,
мать сохрани,
Ради их двоих
что хочешь забери.
Не требую металла,
каменьев не хочу,
Пусть только рядом будут те,
кого ценю.
Последняя песня,
но не печальны сны.
Зов будет услышан:
“Спаси и сохрани!”

****

Чаму ты сумуеш, дзяўчына,

У гэткі цудоўны дзень?
Чаму ў люстэрках душы
Хаваецца нейкі цень?
Каго ты чакаеш з дарогі?
Каго выпраўляла ў яе?
З кім твае мары і думкі,
Каго не хапае табе?
Чаму не адводзіш вачэй,
Углядаешся ў далеч пораз.
Той, хто схлусіў
табе аднойчы,
падмане яшчэ і не раз!
Не чакай свайго "шчасця",
дурнічка,
І шляхі скрыжаваць не спрабуй.
Твой каханы зараз далёка
Іншай шэпча
"Мацней пацалуй!"
Ён пайшоў,
абяцаў вярнуцца.
Толькі сэрцам
цябе не кахаў,
І смак свайго пацалунка
Ён на іншыя смакі змяняў.
Дык кінь сумаваць,
прыгажуня!
І нявернага хлопца кахаць.
Ты аднойчы шмат
лепшага знойдзеш –
Трэба верыць у гэта –
і проста чакаць.



**Маркоўская Людміла Міхайлаўна** (1956), нарадзілася ў в. Альхоўка. Пасля заканчэння Альхоўскай васьмігодкі ў 1971 г. паступае ў Мінскае педагагічнае вучылішча, якое заканчвае з адзнакай. Пасля заканчэння вучылішча паступае на філфак БДУ. У 1978 г. працягвае завочнае навучанне і працуе настаўнікам малодшіх класаў у СШ № 2 г. Мінска, затым – у СШ № 127, настаўнікам рускай мовы і літаратуры. Педагагічную працу прадоўжыла ў Мінскім педагагічным вучылішчы імя Максіма Танка ў якасці намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце. Распрацавала аўтарскую выхаваўчую сістэму па фарміраванні будучага педагога, якая ўключае шэраг праграм. Па ёй працавалі 7 гадоў. Праграма была зарэгістравана ў РІПА.

Пераможца міжнароднага літаратурнага конкурсу “Преодоление” у намінацыі “Апавяданне”.

У 2020 г. была выдана кніга Л. Маркоўскай “Забыть невозможно вернуться”. Творы Людмілы Міхайлаўны друкаваліся ў газеце “Астравецкая праўда”.

Жыве ў Мінску.

## Тринадцать километров

Рассказ

*(Моей матери, Валентине Алексеевне Марковской, посвящается)*

Валентина Алексеевна выглянула в окно кабинета и покачала головой: за теплицей курил рослый семиклассник Михеев. Учиться Витя не хотел, учителя еле натягивали ему дежурные «тройки», но в жизни мальчишка был расторопным и смышлёным.

Однако сейчас директрису занимали другие мысли. Закончилась короткая вторая четверть, начались зимние каникулы. На пятое января она заказала 30 билетов в цирк. Для сельских ребятишек поездка в город – событие. До столицы – 160 километров. Не так и много, но, когда везёшь детей, всегда волнуешься. Валентина Алексеевна сходила к шефам на кирпичный завод, там выделили автобус. Правда, водитель ей не понравился, но директор сказал, что другого нет и не будет. Ну что же, выбирать не приходится.

С погодой не повезло: в субботу с самого утра порывистый колючий ветер гонял крупные хлопья снега. Вместе с пионервожатой Алёной проверили, тепло ли одеты дети, – и в путь. Выехали рано, поэтому успели в музей, пообедали в кафе, а в 3 часа началось цирковое представление. Поглядывая краем глаза на акробатов, Валентина Алексеевна больше посматривала на своих детей. Лица их светились счастьем. Когда на арене появлялись клоуны, оглушительный хохот простодушного Михеева взлетал под самый купол.

Обратно выехали уже в сумерках. В автобусе было тепло и весело, Михеев изображал укротителя, корчил зверские рожи. Но через час усталость взяла своё, все затихли, задремали. Валентина Алексеевна не спала, озабоченно посматривала в окно. Когда до их деревни оставалось километров 50, мотор внезапно взревел, чихнул и заглох. Водитель сплюнул:

– Во цирк! Сломались! Постепенно автобус остывал, все задвигались, зашушукались, стали застёгиваться.

– Адам! Нужно что-то делать, иначе дети замёрзнут! – бросилась директор к водителю.

– А я при чём? Это ваши дети.

– Ну знаете! А автобус, между прочим, ваш. И я не умею его чинить! И не ухмыляйтесь, не та ситуация.

– А чё мне – плакать? Оплата у меня почасовая. Часики тикают, денежки капают. Кожух и валенки тёплые, рукавицы меховые. Хоть всю ночь могу сидеть. Да и генератор ремонту не подлежит.

– Адам! Вам нужно пойти за помощью. Двадцать градусов мороза! Пожалуйста, я вас очень прошу. Мы не можем рисковать здоровьем детей.

– Га-га-га! До ближайшего посёлка 13 километров. Метель разгулялась. Я что, похож на идиота?

– На этот счёт я оставлю своё мнение при себе. Дети! Встали! Давайте попрыгаем! Раз, два, три! Раз, два, три! Адам, время идёт. Через час мороз усилится, собирайтесь, вы ведь мужчина, в конце концов!

– Сказал: не пойду.

– Вы, конечно, продвинутый человек, я слышала, что долго сидели, о многом передумали… Вот и подумайте…

– Не трави баланду. Я только год быком отпахал, а потом меня оправдали вчистую!

Валентина Алексеевна задумалась – но только на минуту.

– Ну, раз так, тогда за помощью отправлюсь я! – решительно сказала она. – А вы пойдёте в ближайший лес, нарубите дров, разведёте костёр возле автобуса и будете греть детей. Вы будете следить, чтобы никто из них не обморозился, станете бегать с ними, будете рассказывать им сказки, чёрт побери! И если хоть с одним ребёнком что-то

случится, я железно обещаю вам второй срок! Как там у вас говорится? Зуб даю!

– Дети, – обратилась директор к притихшим школьникам. – Слушайте мой приказ! Всем слушать Адама Антоновича! Спать нельзя. Каждый присматривает за своим соседом. Михеев! Витя! Ты остаёшься за старшего. Я вернусь на другом автобусе часа через 3.

–Алексеевна! Ты что? Совсем сдурела? Куда ты в таком прикиде собралась? Наклонись, я тебе что-то скажу. Ты не думай, я не бездарный фраер. Да я сразу пошёл бы, но я только после операции, грыжу удалили, сетку подшили, стеснялся сказать. Не дойду…

– Тем более не обсуждается. Кожух не возьму – это детям. Всё, я пошла.

Она быстро зашагала по дороге, прикидывая, когда доберётся до Ворнян.

…Между тем сумеречные дали с еле различимой полосой смутно синеющего леса сначала заквасились жидким грязным клейстером, как будто занавесились захватанной серой кисеёй, а затем потонули в мутном, медленно зыблющемся желе. В голове вертелись планы спасения. Легче было цепляться за мысли старые и проверенные, чем изобретать новые. Она так и делала, берегла силы и с надеждой глядела вперёд, надеясь увидеть хоть какой-нибудь признак жизни: огонёк, лошадь, избу… Но ничего не могла различить, кроме мутного круженья снежных вихрей. В будний день хоть какая-нибудь машина проехала бы. А так остаётся надеяться только на себя. Позёмка вихрилась и кружила по дороге, выписывая замысловатые кренделя. Экономя входящий в лёгкие

колючий воздух, стала, подлаживаясь под ритм ходьбы, вспоминать стихи:

***

Метели летели, метели мели,
Метели свистели до самой земли…

***

Мело, мело по всей земле
во все пределы…

***

Гуляет ветер, порхает снег,
Идут двенадцать человек…

***

Мёртвое поле, дорога степная!
Вьюга тебя заметает ночная…
Тьфу, тьфу, тьфу!

Совсем стемнело. Не было видно ни туч, ни звёзд. Путь в кромешной темноте казался нескончаемым. Вокруг не было других ориентиров, кроме сугробов по обеим сторонам дороги высотой в половину человеческого роста. Через какое-то время Валентина Алексеевна притомилась. Её знобило. Снег косо мчался с однообразной тёмной небесной свободы и устраивал дикую пляску. В поднимающемся водовороте ветер не давал идти, горстями швырял в лицо колючие льдинки так, что захватывало дыхание. В снежной круговерти слышались только шипящий свист и подвывание, напоминающее волчье.

…Старая волчица тяжело бежала по полю вдоль дороги. Час назад она удачно поохотилась, тяжёлый живот с набухшими сосками волочился по снегу. Проследила взглядом за тёмной фигурой, бредущей по дороге, вспомнила своих волчат, заторопилась к логову…

Начался буран. На земле и в небе выло и ревело. Холодный стальной ветер дул всё неистовее, обжигая лицо и дыхание. Рук и ног она уже давно не чувствовала, модные ботики почти не грели. Ресницы и волосы заиндевели. От усталости она перестала обращать внимание на холод. Силы оставляли. Поскользнувшись на ледяной колее, спрятанной под снегом, упала. Вот оно, блаженное состояние покоя… Лень шевелиться, лень думать… Она проваливалась в тёмную нирвану.

Снились подвалы инквизиции. Испанский сапожок, изощрённый инструмент пытки, тисками сжимал левую ногу. В подземелье горел огонь. Нестерпимый холод отступил. Согреться – и спать, спать…

…В горнице тихо, только мерно тикают ходики. Во дворе надрывается рыжий петух Генерал. Пора вставать. Сегодня нужно сеять озимую рожь. Стукнула в сенях дверь, послышались лёгкие шаги, звяканье подойника. Мать вошла в избу с молоком. Завязала в тряпицу обед на поле: картошка в мундире, соль, лук, огурцы с огорода, нарезанная черняшка. Хлеб пекут сами – большие ржаные ковриги килограмма на 3 лежат под полотенцем с петухами. Батя любил такой хлеб.

Память об отце тисками сжала сердце, перенесла в далёкий июльский день, когда он уходил на фронт. Сильный и крепкий, тятя сидит на коне, Сонька с Иркой цепляются за его сапоги, плачут, Мишка ревёт белугой на руках у матери.

– Ну вот что, девчата, отставить ето мокрое дело. Скоро побьём немца, и вернусь. А пока что вы мамке помощницы. Валя, ты старшая. Остаёшься за меня.

А в 1944-м пришёл серый конверт: Филиппов Алексей Дмитриевич в июле 1943 пал смертью храбрых на Курской дуге. И всё. Теперь уж не успокоишь сама себя: вот вернётся отец, будет полегче. Не вернётся…

…Валя косит, жнёт наравне со взрослыми, и борону-волокушу таскает, и тяжеленный плуг. Если уж совсем невмоготу, не плачет, только крепче стискает в кулачки натруженные руки…

…Лютый мороз сковал лицо. Снег пышно и жёстко, как серебряная парча нарядного гроба, по-хозяйски ложился на пуховый платок, на всё её скрючившееся тело.

…Раздаётся голос матери: «Ну, Валя, впрягайся. Знаю, что тяжко. Но тебе уже 15». Валя тянет соху. Сошники крошат почву, ноет поясница. Увязая в холодной земле, упираясь изо всех сил, она идёт вперёд...

Но что это? Где-то плачут дети! Соня, Ира, Мишенька, белобрысая Галя, кудрявая Оля, Люда с тоненькими косичками, вихрастый Михеев, рыжая веснушчатая Люся, голубоглазый красавчик Коля, нежная тихоня Лена, серьёзный Петя в очках… Что случилось? Почему они плачут? Я старшая, я должна им помочь!

Неимоверным усилием воли разлепив смёрзшиеся ресницы, открыла глаза. Дорога лежала перед ней, белая и стерильная, как марля. Господи, куда идти? Кажется, в эту сторону. С трудом поднялась, сжала одеревеневшие руки в кулаки и тяжело зашагала, увязая в снегу, еле волоча непослушные ноги. В голове стучало: «Я – старшая… Нужно дойти! Доползти! Спасти детей!» Вдруг ветер сменил направление и, продувая насквозь тонкое пальто, стал подталкивать её вперёд. Из противника

он неожиданно превратился в союзника. Внезапно что-то серое возникло из белой мглы. Подойдя ближе, поняла: это кирпичная стена, источающая ледяной холод. Опираясь на неё, дотащилась до двери и в тусклом свете лампочки прочитала: «Ворнянская музыкальная школа». Посёлок спал, светил только фонарь у магазина. Она долго стучала в окно директора местной школы-интерната и, когда он распахнул дверь, упала ему на руки и захрипела:

– Скорей! Там дети! Срочно нужен трактор, тёплый автобус, горячий чай, одеяла, валенки, врач!

– Э, милая моя, врача тебе самой нужно, ты, видать, щёки отморозила. Сколько ж ты прошла, девонька? Маша, тащи спирт скорее!

…Всё закончилось благополучно. Помощь прибыла. Детей перевели в нагретый автобус, напоили горячим. Они, перебивая друг друга, рассказывали, как Адам Антонович развёл костёр до самого неба, как все по очереди грели ноги, запихивая их в его громадные меховые рукавицы, как шофёр научил их петь «Мурку», а когда он надолго ушёл в лес за очередной охапкой сучьев, огонь чуть не погас, но Михеев догадался проколоть запасное колесо и поджечь его…

Валентина Алексеевна, смеялась и плакала, обнимая своих родненьких перебинтованными руками.



**Марозаў Аляксандр Іванавіч** (1969), вучоны, пісьменнік, выдаўца. Нарадзіўся ва Украіне, г. Дэбальцава. У сувязі з ваеннымі падзеямі на Данбасе, у 2014 г. пераехаў на Астравеччыну. Аўтар 26-ці мастацкіх і навукова-папулярных кніг. Лаўрэат літаратурных прэмій ім. Ул. Сасюры, Б. Грынчанкі, шэрагу рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў, конкурсаў і форумаў паэзіі. За значны ўклад у развіццё рускай літаратуры ўзнагароджаны медалём імя Міхаіла Шолахава, у 2018 г. медалём імя Яўгена Замяціна. Узначальвае раённае літаратурнае аб'яднанне "Астравецкай зямлі галасы".

У 2021 г. выйшла кніга Аляксандра Марозава «Вельмі заблытаная гісторыя: казка для дарослых», якая летась заняла 2 месца на Міжнародным фестывалі «Славянскія традыцыі». У 2022 г. Аляксандр Іванавіч заняў другое месца на IX Адкрытым фестывалі-конкурсе паэзіі і аўтарскай песні "Муза Новороссии" у намінацыі "Грамадзянская і духоўна-філасофская лірыка".

Жыве ў в. Філіпаны.

**Пра слова**

Пад нагамі мяккай пярынай –
мох…
Захавалася тут
для нашчадкаў мова.
На самотным капішчы
мудры бог

На святых скрыжалях
выводзіць слова.
Слова птушкай
скокнула з языка,
Паляцела дзыгою
сярод праталін.
І збірае слова з ільдзінак Кай,
І з ускраін словамі цэліць Каін.
Захапляе спадчына ўмелых рук
Мудрасць словаў застыла
ў стагоддзях глінай.
Не змаглі смаўчаць
і сышлі ў друк –
Для нашчадкаў іх захаваў
Скарына.
Ці каштоўней праўда
за воз манет?
Той, хто шмат пажыў, -
усяго пабачыў.
На зямлі цяпер
электронны свет –
І нічога словы амаль
не значаць…
Выдаецца менш
папяровых кніг,
Віртуал засмоктвае
праз мабільнік…
Захаваем мудрасць
часоў былых,
Калі нехта выключыць нам
рубільнік?

**Радуга**

Время сжималось, как будто снежок в руке,
Уж не плетётся – несётся курьерским поездом.
В детстве мы пели песню о ямщике,
Ну а сегодня она никому не запомнится.

Деньги не пахнут, мы знаем – они шуршат.
Гонка за благами плебос всё меньше радует.
Эх, отмотать бы мне тридцать годков назад…
Много болтали – зато не ломали радугу.

Это чуть позже качали богатства недр.
Чтоб на счетах не рубли – единицы условные…
Радуга сломана, сузился цвета спектр.
Не починить – жизнь покатится монохромная.

И без того нам болезней и бед не счесть,
Хоть и твердят о благоденствии и изобилии.
Видно, придётся мне снова на небо лезть
И обновлять цвета, изгибая линии.

Не голодаем. Но как-то живём не так…
Много желаний – а звёзды всё реже падают.
Кто-то покрутит пальцем: «Смешной чудак…»
Если не я, то кто ж вам починит радугу?

**А я живу на Филиппинах**

А я живу на Филиппинах,
Оговорился — в Филипанах.
Где перед домиком старинном,
Цветут нарциссы и тюльпаны.
Здесь крапива растет до неба,
Крот окопался в огороде
От них избавиться хотел бы,

Они упорно не уходят.
Три печки в доме – это круто,
А значит — я живу богато.
В прикольном деревянном срубе
И сплю, как барин – на полатях.
До пенсии еще не скоро.
Сейчас рабочий день, суббота.
А значит – нужно ехать в город
Где ждет меня моя работа.
Дались всем эти Филиппины,
Подумаешь, какой-то остров.
Вы что, не видели дельфинов?
Не жарили на солнце кости?
Вы приезжайте в Филипаны —
Здесь романтично-экзотично.
У леса в огороде — баня
Мы в ней попаримся отлично.
А летом — ягоды в корзинах,
Грибов лукошко соберете.
Скажите, разве в Филиппинах
Вы так прекрасно отдохнете?

* * *

Возьму фотоальбом и сам помолодею,
Здесь память о былом вещает со страниц.
Не подносила жизнь цветов оранжерейных,
Но было вдоволь дат и много юных лиц.
Вернуться бы туда, здоровым и весёлым,
К своим живым друзьям, младых, беспечных дней,
Чтоб встретил школьный класс и дорогая школа
Своих учеников, своих учителей.
На пустяки порой беспечно время тратил,
Транжирил я года, не пряча про запас.

Из юности былой мне подмигнёт приятель,
Гляжу на выпускной, весёлый шумный класс.
Закрою я альбом и положу на полку,
Простой немой архив из памятных страниц.
Хранит фотоальбом воспоминаний столько –
Бесценный капитал за прожитую жизнь.

* * *

Ставни на окнах, старенький домик,
Пёсик лохматый сидит у ворот.
Сад с огородом, ухоженный дворик –
В домике этом старушка живёт.
Яблочко печёное с противня
И сама, как яблочко – сморщена.
Жизнь пролетела в трудах и заботах.
Мужа и братьев забрала война.
Словно, давно дожидаясь кого-то,
Бабушка долго сидит у окна.
Яблочко печёное с противня
И сама, как яблочко – сморщена.
В рамках портретных родимые лица –
Сын и невестка, дочка и зять.
Дети и внуки живут за границей,
Звали с собой, да куда уезжать?
Яблочко печёное с противня
И сама, как яблочко – сморщена.
Противень яблок печёных достанет –
Так они мягче — легче жевать
Дёснами. На ночь закроются ставни –
Это привычка. Здесь нечего брать.
Яблочко печёное с противня
И сама, как яблочко – сморщена.
Снова окошко откроется утром,

Вновь к сельсовету протопает власть.
И улыбнется бабушка мудро –
Жизнь пролетела – она удалась.
Яблочко печёное с противня
И сама, как яблочко – сморщена.

**С неба посыпалась манна**

С неба посыпалась манна,
Вспыхнул багрянцем рассвет –
В городе сером и странном
Вдруг появился поэт.
Брел не спеша, улыбаясь,
Мимо унылых дворов,
И сквозь асфальт пробивались
Брызги весенних цветов.
Стали улыбчивей лица,
Серый, угрюмый прохожий
Вдруг услыхал пенье птицы –
Понял, что слышать он может.
Бабочка в небе порхала,
К речке неслась стрекоза,
Люди, закрыв опахала,
Вдруг открывали глаза.
Будто волшебник из сказки
Так по земле много лет
Шествует, звуки и краски
Дарит всем людям поэт.
Серость и холод не вечны,
Битвы страстей и стихий,
Чтобы нам быть человечней,
Пишут поэты стихи.

**О поэтах**

Посмотри: какое полнолунье!
Слышен у палаток звон гитары.
Для кого-то я, конечно, юный,
Для кого-то я ужасно старый.
Рассуждать о степени таланта
Очевидно, нужен дар особый.
В чём-то я похож на дилетанта,
Ну, а в чём-то я поэт матерый.
Чтоб попасть на «верх» – не лез из кожи,
Получалось жить не сильно гладко.
Не старался быть для всех хорошим,
По ночам кропал стихи в тетрадку.
В лабиринте жизненных вопросов
Зыбко все и неопределенно...
Для кого-то я – поэт-философ,
Для кого-то – белая ворона.
Государства – это те же зоны,
Бьют порой по темени копытом.
Я не собираю стадионы –
Не предпринимал таких попыток.
Если б замолчали в мире пушки
От моих простых стихотворений...
Кто-то усмехнется: «Да, не Пушкин…»
Кто-то, прочитав, воскликнет: «Гений!»
Хоть былые раны кровоточат,
Но упорство нам дарует силы.
Снова мы проходим тест на прочность:
Не сломались, не сложили крылья.
…Наступает новый понедельник,
Дорожают перья и бумага...
Кто-то скажет, что поэт – бездельник.

Нет, скорее – пахарь-работяга.
Километры строчек за плечами,
Ничему нас жизнь, увы, не учит...
Для того поэт не спит ночами,
Чтобы сделать мир немного лучше.



**Мікола (Мікалай Міхайлавіч) Мятліцкі** (1954-2021) — паэт, перакладчык, лаўрэат некалькіх літаратурных прэмій. Член саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіўся ў вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля дзесяцігодкі Мікола Мятліцкі паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на філалагічны факультэт, бо вершы ўжо складаў у школе, у старэйшых класах. Працаваў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», выдавецтве «Мастацкая літаратура». З 2002 года па 2014 год з'яўляўся галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Друкавацца пачаў у 1969 годзе. Першыя зборнікі «Абеліск у жыце» (1980), «Мой дзень зямны» (1985) паспелі ўбачыць свет да чарнобыльскай навалы. Чорны 1986 год аказаўся трагічным, лёсавызначальным як для ўсёй Беларусі, так і для Міколы Мятліцкага. Жыццё падзялілася надвое — да і пасля Чарнобыля. Гэтая акалічнасць перайначыла ўвесь характар творчасці паэта, яго светаўспрыманне. Мікола Мятліцкі выступае як летапісец чарнобыльскай трагедыі, якой прысвечаны нямала глыбокіх, прачулых кніг і асобных твораў. Зборнік вершаў «Бабчын» (1996), які аўтар назваў «кнігай жыцця» — адна з самых моцных кніг Міколы Мятліцкага, своесаблівы паэтычны помнік роднай вёсцы, адселенай у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. Аўтар зборнікаў паэзіі

«Горкі вырай», «Шлях чалавечы» (абодва 1989), «Блаславенне», «Палескі смутак» (абодва 1991), «Чаканне сонца» (1994), «Хойніцкі сшытак» (1999), «Жыцця глыбінныя віры» (2001), «Мой боль вырастае да зор» (2016), Прысутнасць (2017) і інш.

Астравеччына – радзіма жонкі Міколы Мятліцкага. Яна стала і яго другой радзімай, і творчым натхненнем.

**Быстрыцкі касцёл**

Лясная ціша навакол
І крутабокі бераг стромы.
Тут размяняў ужо век сёмы
Славуты Быстрыцкі касцёл.

Калісь закладзены Ягайлам,
Ускінуў гордыя крыжы.
З забытай прошласці імжы
Сягоння ў новы дзень сягае.

Звіняць нядрэмныя званы,
Зіхцяць пабеленыя сцены.
Тут подых вечнасці нятленны
І сакавіты пах вясны.

Іграе велічна арган
Кантату Божага ўслаўлення.
І хор касцельны песнапеннем
Вярэдзіць памяць Божых ран.

Тут з веку ўвек ідзе імша
Па тых, хто рушыў на нябёсы.

І выкрасае памяць слёзы,
І смуткам поўніцца душа.

У дзень святога бежмавання
Ідуць да Бога юнакі,
І крыжык з біскупа рукі
Ім, быццам лёсу дараванне.

Тут у спакоі з веку ў век
Пад годна ўзнесеныя зводы
Да Божай ласкі і лагоды
Ўзыходзіць духам чалавек.

**Вілія**
Ёсць рэкі на зямлі куды шырэй, глыбей,
Ды мне мілей твая лясная прыгажосць.
Тварылы гэты цуд старанні добрых фей.
І вось – віруе плынь і сэрцу
шэпча штось.

Цячэш, мая рака, з даўно забытых дзён
У дні, якім яшчэ заняцца над зямлёй.
І я малю твой лёс, каб так было спакон,
Каб хтось і ў далі той ступіў
на бераг твой.

Ён скажа: шмат вады
з дзён даўніх уцякло,
Зірне на плын-брую паглядам юнака.
І ўскіне па-над ім узмашыста крыло
Твой бусел-клекатун, павечная рака.

І тут, дзе я цяпер, вітаючы зару,
Над хваляю тваёй, узрушаны, стаю,
Бясконцая, як ты, прабудзе Беларусь,
П'ючы жывой вады прачыстую брую.

О, як жадаю я на сходзінах зямных,
Каб так яно спрадвек пад небам і было.
Каб хвалі плёскат чуў тут
чалавечы слых,
Каб секла гладзь вады парыўнае вясло.
Кранае плынь тваю празяблая рука,
Царуе навакол світальны супакой.
З даўно забытых дзён цячэш, мая рака,
У дні, якім яшчэ заняцца над зямлёй.

**Святаянская крыніца**
Дзе за быстрыцкія хаты
Адышліся вербы ніца,
Са жвіроў, вякамі сцятых,
Б'е празрыстая крыніца.

Раўчуком струменіць
чыстым,
І цячэ Быстрыцкай рэчкай.
Поўны месяц урачыста
Загарыцца Божай свечкай.

Мкне з пары яшчэ паганскай,
Не вада – жывыя лекі.
І крыніцая Святаянскай
Называецца адвеку.

Ля яе стаіць капліца
І малітвай славіць Яна.
Мне вады святой напіцца
Выпадала тут з каханай.

І павесці ў храм да шлюбу
У прачыстую нядзелю,
Ад вады крынічнай губы
У каханай саладзелі.

Я даўно перакананы:
Памагла мне ажаніцца
Ў светлы год тады на Яна
Святаянская крыніца.

****
Вёсачкі лясное Астравеччыны
Па лагах, надрэчных берагах,
Шчырыя, гасцінныя, сардэчныя,
З раніцы ўвішнай на нагах.

Колькі мною вёрстаў перамерана,
Сходжана запыленых дарог.
Колькі сэрцу таямніц даверана,
Каб у слове трапным іх збярог.

Па-над вамі рукі Шляху Млечнага,
Перад вамі – несупынны шлях,
Вёсачкі лясное Астравеччыны
Па лагах, надрэчных берагах,
Ціхія, прыветныя і вечныя.

****
Дубнікі. Да Генрыка Сянкевіча
Рушыў я дарогай палявой.
Панская калішняя аселіца
Пырнікам забіта, крапівой.

Дом цагляны выбітымі вокнамі
Смутна пазірнуў, як хмуры дзед.
Толькі дзверы крэкнулі,
бы войкнулі.
Не чутно ні брычак, ні карэт.

Пуста ўсцяж, бы часам пакалечана –
Тлен жылля і адзічэлы сад.
Не шануеш памяць, Астравеччына,
І пра тое ведаеш наўрад,

Што калісці тут у ранкі летнія
Гасцяваў адзін варшаўскі пан,
У часіны ціхія дасветныя
Дапісаў, натхнёны, свой раман.

І раман той, славаю азораны,
Крочыць сцежкай часу праз вякі.
З самымі праслаўленымі творамі
На адной паліцы "Крыжакі".

Смутна вецер над сядзібай хліпае,
То пачне надрыўнае выццё.
Старадаўняю алеяй ліпавай
Падступіла блізка забыццё.

## Часлаў Казіміравіч Навіцкі



(1931-2004) нарадзіўся ў вёсцы Альгіняны. Вучыўся ў Альгінянскай чатырохгодцы, Гервяцкай сямігадовай школе, у 1948 паступіў у Ашмянскае педагагічнае вучылішча. На трэцім курсе яго прызвалі ў армію. У гэты час і праявіўся яго паэтычны талент. У 1956 г. вярнуўся ў Альгіняны.

Працоўную дзейнасць Часлаў пачынаў у роднай школе, потым узначаліў навучальную ўстанову ў вёсцы Ігнацова, сюды ён прыехаў ужо са сваёй жонкай – Ірынай Францаўнай. У 1956 годзе Часлаў Казіміравіч паступіў у Калінінградскі педагагічны інстытут на факультэт рускай мовы і літаратуры. Узначаліў Гірскую васьмігадовую школу. У 1968 годзе Часлаў Казіміравіч узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны". Праз два гады Навіцкія пераехалі ў Варняны – Часлаў Казіміравіч стаў дырэктарам мясцовай школы, пазней працаваў настаўнікам. На заслужаны адпачынак выйшаў у 1991 годзе.

Па сведчанні людзей, якія яго ведалі, ён быў таленавітым паэтам, сапраўдным настаўнікам, заўзятым пчаляром, гаспадаром і Чалавекам з вялікай літары. Пісаў вершы на лірычную і грамадзянскую тэматыку, творы для дзяцей, байкі, у якіх высмейваў чалавечыя заганы…

**Мой край**

Зялёны рай.
Дзе знойдзеш лепшы?
Ды і нашто яго шукаць?
Радзімы край,
Ты ў думках – першы.
Мне па лясах тваіх блукаць,

Збіраць грыбы, трасці арэхі,
Сядзець на рэчцы раніцой
Ды забаўляцца з гулкім рэхам,
Прайсціся звонкаю касой,
Як некалі, на сенажаці,
Праехаць быстраю шашой
Ці проста так пабыць у хаце,
Сам-насам са сваёй душой.
Пасля ізноў ісці сцяжынай,
Якая ўецца праз палі,
Паслухаць, як над канюшынай
Гудуць паважныя чмялі.
Ды хараством тваім дзівіцца,
Жыць без навалы-злыбяды.
Напіцца з роднае крыніцы
Твае гаючае вады.

****

Збіраю радасці крупінкі,
Даўно збіраю, дзень у дзень.
Тут, ля калматае ялінкі
Ізноў прабег лясны алень.
А ў кустах пяе салоўка,
Шчупак падскочыў на вадзе.
Махае мак сваёй галоўкай
Усім, хто ля яго ідзе.
Духмяны куст
                    пчалу прывабіў.
Трава купаецца ў расе.
Зусім збялеў зялёны язмін:
Пах лета цёплага нясе.
Лужок дурманіць
                    пахам кветак.

А як сінеюць васількі!
І водар збажыны з палетак,
І прахалода ля ракі –
Усё тут – радасці крупінкі,
Усё тут – нашыя сляды.
Усё тут – нашыя сцяжынкі,
Жылі тут нашыя дзяды.

**Дождж ык**

Дождж ідзе па вуліцы,
Мые шапкі дрэў.
Мые ды любуецца:
Ліст зазіхацеў.
Шчочкамі паблісквае,
Быццам падміргне.
Нешта сэрцу блізкае
Вабіць зноў мяне.
Я іду пад дожджыкам,
Падстаўляю твар..
Ён калючым вожыкам
Лашчыцца, штукар.

**Дзве сястрыцы**

Дзве сястрыцы, сасна з ёлкай,
Моцна абняліся.
Іх галінкі і іголкі
У адно спляліся.
Так лягчэй ім супраць ветру
Устаяць на ўзлеску.
Іх вясной цудоўным пахам
Радуюць пралескі.
Ім улетку ранак росны
Вецце аздабляе.

Трэба бачыць, як зіхотка
У кроплях сонца грае.
І ўвосень, і ўзімку
Яны рады долі.
Ім зручней так, у абдымку
Ва ўсім наваколлі.

****

Что-то снова сегодня не спится мне.
Виноват ли опять соловей?
Снова солнце встречаю лучистое
На заветной тропинке моей.

А она по росистой излучине
Побежала за быстрой рекой.
Я стою над высокою кручею
И машу ей вдогонку рукой.

Лепестки опадают пахучие,
Словно в сад залетела метель.
И опять моё сердце певучее
Бередит соловьиная трель.

Рад я встече с тобою, утро раннее,
Жадно пью с твоего родничка.
Словно в юность свою, на свидание
Позвала меня снова река.

****

Ну й залева, дык залева!
Льецца справа, льецца злева.
…Напаткала ў дарозе,
добра, што шчэ на парозе,

Апынуўся я ля хаты,
Дзе гадуюцца дзяўчаты.
Словам, мне пашанцавала:
Адна дзеўка жонкай стала.
Стала роднай гэта хата –
Тут залева вінавата.

****

Падаюць травы на лузе,
Трэ іх зубастае жэрла.
Быццам завязвае ў вузел
Тое, што толькі пацерла…
Падаюць кветкі на лузе,
Долу ляцяць іх галовы.
Знову іх хутка не будзе
Болей не будзе іх знову.
Ім бы квітнець усё лета,
Ім бы так пахнуць мядзвяна,
Высушаць – будуць шкілеты,
Моцна ў мяхах звязаны.
Будуць таміцца на складзе
Дзе не блішчаць нават зоркі…
Тое ж і з намі бывае:
Покуль квітнеем, як кветкі,
Покуль натхненне прыяе,
Покуль маленькія дзеткі –
Цешымся кожнай ўдачай,
Некалі думкі ўзважыць.
Носімся з сэрцам гарачым,
Покуль яно не адкажа…

**Ветер**

Гонит ветер листья,

Кружит в переулке,
Воет у забора,
Бьёт по крыше гулко.
Хлопает калиткой,
Приоткрыл ворота,
По всему заметно:
Злится на кого-то.
Я спросил у ветра,
На кого он злится.
- Пересохли губы:
Негде мне напиться.
Обмелела речка,
Высохло болото.
Вот и надо злиться
Ветру на кого-то.

**Вновь иду по полю**

Вновь иду по полю
Чистым утром ранним,
И опять искрится
Свежий белый снег.
Я к тебе, природа,
Вышел на свиданье.
Я, который любит,
Да, один из тех.
Добреду до леса,
Выйду на поляну.
Пусть сидит там заяц –
Не сниму ружьё.
Ясным тихим утром
Я стрелять не стану.
Я даю вам слово
Честное моё.



**Пешка Марыя Паўлаўна** (1944-2022), настаўніца вышэйшай катэгорыі, ветэран педагагічнай працы, нарадзілася на Гомельшчыне, ў Петрыкаўскім раёне. Вучылася ў Мінскім музыкальным вучылішчы імя М. І. Глінкі на дырыжорска-харавым аддзяленні. Першая яе спецыяльнасць – кіраўнік харавых калэктываў мастацкай самадзейнасці. Пасля вучобы працавала ў роднай вёсцы настаўнікам. Завочна паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэтэт імя Я. Купалы, які скончыла ў 1979 г. Яшчэ ў час вучобы пераехала на Астравеччыну, дзе і настаўнічала ўсё працоўнае жыццё. Беларускую мову і літаратуру выкладала ў Карвэльскай, Варнянскай, Трокеницкай школах, найбольш — 27 гадоў — у Варонскай базавай, сям’я Пешка атрымала жыллё ў вёсцы Варона. Пісаць вершы пачала, працуючы ў школе. Вершы, замалёўкі, нарысы, апавяданні Марыі Пешка друкаваліся ў раённай газеце «Астравецкая праўда», рэспубліканскіх выданнях «7 дней», «Звязда», «Настаўніцкая газета», часопісах «Гаспадыня», «Беларуская мова і літаратура», «Роднае слова». Апублікаваны яе творы і ў зборніках “Астравецкай зямлі галасы”, “На крыльях вдохновения”.

Марыя Паўлаўна пераможца паэтычных конкурсаў. У 2019 годзе стала адным з пераможцаў абласнога конкурсу паэзіі сярод настаўнікаў устаноў адукацыі Гродзеншчыны.

**...І зноў зацвітуць каштаны**

Яны былі маладыя, прыгожыя і шчаслівыя. А яшчэ — таленавітыя. Спявалі разам так, што на канцэрты сыходзілася ўся вёска — яблыку не было дзе ўпасці ў клубе. Спявалі і кахалі адзін аднаго. Здавалася, так кахаць больш ніхто не ўмее. Разлука на дзень для іх здавалася вечнасцю. Беглі насустрач адзін аднаму пры сустрэчы, ён хапаў яе ў абдымкі і кружыў... кружыў... кружыў... А яна, здавалася, узлятала ад шчасця ў аблокі. Сэрца млела ад пяшчоты і радасці, і каханню не было мяжы.

На працу — разам, з працы — разам. Абое вучыліся на завочным аддзяленні, але ў розных гарадах.

...Аднойчы на вуліцы Тоню сустрэла загадчыца сельскай бібліятэкі:

— Тонечка, зайдзі сёння ў бібліятэку, я хачу з табой параіцца, як лепш сцэнарый скласці да свята.

Антаніна паабяцала дапамагчы і пабегла дадому.

Васіля дома не было, на стале ляжала запіска: «Сонейка, абедай сама, я на рэпетыцыі».

Дзе? Калі? Што? — не ўдакладняў.

На рэпетыцыях яму часта даводзілася быць, бо іграў ён амаль на ўсіх музычных інструментах і яго часта запрашалі быць мастацкім кіраўніком. Тоня ганарылася сваім мужам. Але ж і яе ён заўсёды браў з сабой. Бо які ж канцэрт без яе, які ж хор без такой запявалы?

Тоня паклала запіску на стол. Абедаць расхацелася. Настрой знік. Стала перабіраць кніжкі на паліцы. З нейкай выслізнуў фотаздымак. Падняла... Сямён, яе аднакласнік, у вайсковай форме глядзеў са здымка даверліва і пяшчотна. Жанчына правяла рукой па фотаздымку і сказала ўслых, нібы Сямён яе мог пачуць:

— Даруй, што не дачакалася. Сэрцу не загадаеш. Знойдзеш сабе лепшую, а я, выходзіць, не твая. Так заўгодна Богу.

Васіль яе не раўнаваў да мінулага. Але, каб не рабіць яму непрыемна, Антаніна сабрала ўсе фотаздымкі, пісьмы ад сяброў і аднесла маці на захоўванне.

Маці з дакорам паглядзела на дачку, цяжка ўздыхнула. Яна недалюблівала Васіля. Ды што там казаць — не любіла. Часта казала:

— Ох, дачушка, чуе маё сэрца, што дабром не скончацца твае любошчы. Вельмі ж прыгожы твой Васіль. З твару вады не піць. Не шчасце гэта тваё, а няшчасце. Хай муж будзе, як лапаць, ды каб за ім не плакаць. Сямёна лепш чакала б. Свой хлопец, бацькі яго цябе любяць, чаго яшчэ хацець? Адумайся...

«Ага, адумайся, — думала Тоня. — Што тут думаць, калі я без Васіля і дня не магу пражыць».

Яны пажаніліся неяк вельмі хутка. Сямёну ў армію напісалі пра замужжа Антаніны, і ён пасля дэмабілізацыі дамоў не вярнуўся. З’ехаў, казалі, некуды на новабудоўлю. Нават калі захварэла і раптоўна памерла яго маці, цётка Валя, хлопца не дачакаліся на хаўтуры і нахавалі маці без яго. Чуткі хадзілі ўсялякія, адна другой не лепшыя, і ва ўсім аднавяскоўцы вінавацілі Тоню.

Тоня яшчэ раз глянула на фотаздымак Сямёна і палажыла ў кнігу.

...Час цягнуўся марудна. Штораз яна паглядвала на гадзіннік, потым апранулася і пайшла ў бібліятэку.

— Тонечка, — лагодна сустрэла яе Валянціна Іванаўна, загадчыца. — Ты толькі не хвалюйся, а паслухай мяне. Дапамога мне не патрэбна. Я хачу цябе напярэдзіць. Жонкі звычайна апошнія даведваюцца... Васіль здраджвае табе. Усе аб гэтым гавораць.

— Хопіць! — рэзка абарвала Тоня. — Я і слухаць не хачу. Хай гавораць, што хочуць, усе гэтыя плёткі — ад зайздрасці.

— Ну, як знаеш, — паспяшыла апраўдацца загадчыца бібліятэкі. — Тваё жыццё — табе і распараджацца ім. Я хацела зрабіць, як лепей, — вінавата ўсміхалася Валянціна Іванаўна.

Яна хацела неяк згладзіць няўдалую гутарку, але Тоня паспяшалася да выхаду.

На ганку яна раптам адчула моцны штуршок пад сэрцам. Радасць якая — сынок, яе і Васіля сынок — даў аб сабе знаць! Ён прачнуўся, застукаў ножкамі, першы раз павярнуўся.

Гэтае радаснае пачуццё адрынула ўсе нядобрыя думкі, акрыліла яе. Яна ішла дамоў і сама сабе ўсміхалася, ціхенька напявала. Сёння яны разам будуць слухаць, як стукаецца ў свет дзіцятка...

— Здраджвае, здраджвае, здраджвае, — лезла змяёй у сэрца пачутае.

— Не можа быць!.. Людзі нагавораць, што хочаш. Ды Васіль не наглядзіцца на яе, здувае пылінкі, патакае кожнаму капрызу, гатовы на ўсё, каб дагадзіць ёй, — перабірала ў памяці Антаніна сваё кароткае замужняе жыццё.

Тоня так задумалася, што не заўважыла, як стаў накрапваць цёплы вясенні дождж. Раптам бліснула маланка і грымнуў першы вясенні гром. Тоня толькі хацела прыспешыць крок, як адчула знаёмы дотык рук. Васіль, яе каханы Васіль, дагнаў Тоню, абняў, прыцягнуў да сябе і пяшчотна пацалаваў. Ні маланка, ні гром, ні дождж не перашкаджалі ім...

Пра тую гутарку з Валянцінай Іванаўнай Антаніна мужу не сказала — выкінула яе з галавы. На яе Васіля заглядваліся і жанчыны, і дзяўчаты — ці нараўнуешся да ўсіх? Тоня проста верыла свайму мужу. Верыла і зачаравана

глядзела, як спрытна перабірае ён чорныя і белыя баянныя гузікі, слухала цудоўную мелодыю — і млела ад шчасця.

З наступленнем цеплыні кожны вечар на лавачцы пад ліпай збіраліся вяскоўцы, спявалі, Васіль іграў да стомы. І далёка за поўнач плыла песня, будзіла палеткі, наваколле, клікала ўвысь, узлятала над вёскай... І ажывала ў пацалунках закаханых: забывалася стома ад будзённай працы — песня дапамагала жыць.

...Беглі дні за днямі. Тоня з Васілём лічылі час да сесіі. Расставацца не хацелася. Васіль быў на апошнім курсе, а Тоня будзе здаваць экзамены за першы. Маладыя дамовіліся, што Тоня пасля экзаменаў прыедзе ў горад акацый і каштанаў — Чарнігаў.

— Пакуль Васіль на вучобе, я буду адпачываць на Дняпры, хадзіць па гораду, любавацца яго прыгажосцю, набірацца сіл. Гэта цудоўна — быць побач з каханым, — думала яна.

Тоня здала апошні экзамен раней на два дні. На вакзал ляцела птушкай. Толькі б наспець на цягнік, толькі б білеты ўзяць... Нават цяжару сумкі не адчувала. Засумавала...

Села ў цягнік, уладкавалася і тут жа заснула: адбіліся бяссонныя ночы. У сне ўсміхалася. Сніўся Васіль... Ловіць яе — а яна бяжыць па росным лузе сярод разнатраўя, уцякае ад каханага. Той хоча злавіць, абняць, а Тоня вы слізвае з яго абдымкаў...

Цягнік прыбыў рана. Толькі-толькі пачаў хадзіць гарадскі транспарт.

Усмешка, радасная і шчаслівая, не сыходзіла з яе вуснаў. Яна ўсміхалася сама сабе. Вадзіцель аўтобуса глядзеў у люстэрка, бачыў Тонін твар — і таксама ўсміхаўся шчыра і адкрыта: не кожны дзень пачынаецца з усмешкі.

Прыпынак быў далекавата. Шафёр прапанаваў падвезці яе да дома, дзе кватараваў Васіль.

У прадчуванні доўгачаканай сустрэчы Тоня адкрыла веснічкі, ступіла на сцяжынку, што вяла да ганка.

Раптам на парозе з’явілася гаспадыня з пустымі вёдрамі. І знямела. Яны былі знаёмыя,

Тоня часта сюды прыязджала разам з Васілём. Тоня выхапіла пустыя вёдры, пабегла да студні, набрала вады...

Гаспадыня па-ранейшаму стаяла на ганку — нават з месца не кранулася і не прамовіла ні слова.

Тоня ўвайшла ў хату, паставіла вёдры на ўслончык і накіравалася ў пакой, дзе спаў яе каханы.

Увайшла і... аслупянела. Усмешка застыла на твары. Хацелася крыкнуць — голасу не было. Паспрабавала крануцца з месца — ногі быццам прыліплі. Праз хвіліну-другую перавяла дыханне. Слёзы ручаём брызнулі з вачэй. Васіль, яе Васіль, якога яна кахала больш жыцця, спаў моцна і бестурботна, абняўшы жанчыну з белакурымі кучаравымі валасамі.

У гэты час штурхануўся пад сэрцам яе сынок. Антаніна схамянулася, прыйшла ў сябе. Крыху пастаяла, а потым выскачыла з пакоя, узяла ў рукі вёдры, поўныя халоднай вады — і выліла на галавы Васіля і той, якая назаўсёды зрабіла Тоню няшчаснай. Куляй выляцела з хаты і пабегла на прыпынак.

Аўтобус яшчэ стаяў. Ззаду пачуўся Васілёў голас, але яна нават не азірнулася. У яе было адно жаданне: хутчэй пакінуць гэты горад!

Ускочыўшы на прыступкі аўтобуса, убачыла знаёмы твар шафёра і хутчэй скамандавала, чым папрасіла:

- Хутчэй! Хутчэй адсюль! Той чалавек не павінен мяне дагнаць!..

Шафёр, здаецца, усё зразумеў і націснуў на газ...

На вакзале Тоня падбегла да акенца касы і папрасіла даць ёй білет на першы цягнік, які будзе адпраўляцца.

— Да якой станцыі? — удакладніла касірка, спачувальна гледзячы Тоні ў вочы. Яна працягнула грошы, што засталіся ад сесіі, і вымавіла:

— На ўсе...

Куды ехаць, колькі часу — ёй было ўсё роўна. Яна нават не глянула на білет — сунула яго ў кішэнь і пайшла на перон. Слёзы па-ранейшаму без супынку цяклі з вачэй. На яе звярталі ўвагу, спачувалі, прапаноўвалі дапамогу. А яна хацела аднаго: растварыцца, збегчы на край зямлі, каб Васіль ніколі не знайшоў яе...

«Здраджвае, здраджвае», — стыла кроў у жылах.

«Здраджвае, здраджвае», — білася параненае сэрца ў грудзях.

«Здраджвае, здраджвае», — свістаў вецер за вокнамі цягніка.

«Здраджвае, здраджвае, здраджвае», — выстуквалі калёсы вагона, які вёз Тоню прэч ад горада, дзе так прыгожа квітнеюць каштаны і дзе назаўжды засталося яе шчасце.

Цягнік вёз усё далей і далей... Куды? Яна і сама не ведала... У жыццё, якое яна пачне з новага ліста...

І ў якім некалі зноў зацвітуць каштаны.

* * *

Паклон Беларусі
Ой ты, ветрык мілы,
Ветрык дарагі,
Раскажы мне, дружа,
Аб чым спяваеш ты?
Мо аб тым, гады што
Хуценька лятуць?
Ці аб тым, што шчасце
Назад не вярнуць?
Мо аб тым, што ў лузе

Восенню каліна
Плача і сумуе,
Быццам бы дзяўчына?
Мо аб тым, што ў маці
Кроў у жылах стыне,
Бо ўсе думкі-мары
У яе аб сыне?
Ляці туды, ветрык,

Дзе сынок мой служыць,
І скажы, што маці
Па ім моцна тужыць.
На далёкі поўдзень
Вы ляціце, гусі,
Паклон перадайце
Сыну з Беларусі.

* * *

Астравеччына – край дарагі
Астравеччына- край любы,
Прыгожы, шчодры, дарагі.
Тут скрыжаваліся надоўга
Мае сцяжынкі і шляхі.
Такіх цудоўных краявідаў,
Напэўна, больш нідзе няма,
Таму я сэрцам і душою
Злілася з імі нездарма.
Люблю сады, лясы, узлескі,
У стракатых фарбах сенажаць,
І тыя гонкія таполі,
Што гасцінца ўздоўж стаяць.
Люблю, люблю да слёз
Сукенкі белыя бяроз,

І той дубок, што на мяжы
Нядаўна з жолуда прарос.
Люблю Карвэльскія дубровы,
Дзе весела грыбы збіраць.
І неба чыстае над хатай
Я кожны дзень хачу абняць.
Любіць мне гэты край не дзіва,
Бо тут маіх сыноў Радзіма!

* * *

Беларуская зіма
Астудзіў мароз зямлю,
Сцёр ён восені сляды.
Белай коўдрай пухавой
Накрыў хаты і сады.
Закружыла завіруха
У танцы снежныя віхры,
Начапіла на парканы
Серабрыстыя махры.
Замяла сцяжынкі ў лесе,
У полі гурбы намяла,
Пабяліла стаў за вёскай –
Усё прыбрала дабяла.
Так цудоўна, так дзівосна –
Прыгажэй нідзе няма.
Тчэ сцяжыначкі на кроснах
Беларуская зіма!



**Пракаповіч Ігар Міхайлавіч** (1960), пісьменнік, краязнаўца, педагог. Нарадзіўся у г. Паставы. Закончыў Пастаўскую сярэднюю школу № 2, геаграфічны факультэт БДУ і аспірантуру Нацыянальнага Інстытута Адукацыі. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат літаратурнай прэміі часопіса “Маладосць” (1994), літаратурнай прэміі імя У.Караткевіча (2015). Аўтар звыш 50 краязнаўчых, празаічных і паэтычных кніг. Зборнікі паэзіі: “Рэха малітваў” (1993), “Намагнічаны космас” (1996), “Шляхі наканаванага бязмежжа” (1999), “Я Вас каханнем растрывожу…” (2005), “Луска вечнасці” (2005), “Белая Панна: паэма” (2007), “Калядны ранак: вершы” (2007), “Хірургічная адысея дзядзькі Антона: паэмка” (2009), “Снежны вылюм шыпшыны: чорныя і белыя вершы” (2011), “Геаграфічныя лімерыкі ад Кірыбаці да Амерыкі” (2016), “Казка пра ваяўнічага камара” (2017).

Аўтар кніг па краязнаўству: “Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна”(1994), “Адкуль паходзяць назвы. Назвы рэк і азёр Пастаўскага раёна”(2000), “Крыжы і камяні”(2003), “Манькавічы” (2004) (у сааўтарстве), “Насельніцтва Пастаўскага краю” (2004), “Ваколіцы Паставаў” (2004), “Мястэчка каля пушчы: Груздава і ваколіцы” (2005) (у сааўтарстве). Аўтар тэкста фотаальбома “Паставы” (2006), укладальнік кнігі “Дзе Мядзелка песні пяе” (“Пастаўшчына літаратурная”) (2006). Творы друкаваліся ў шматлікіх рэгіянальных і рэспубліканскіх выданнях. На працягу многіх гадоў друкуецца на старонках “Астравецкай праўды”.

Член-карэспандэнт міжнароднай Акадэміі арганізацыйных і упраўленчых навук. Член Вучонага савета беларускага геаграфічнага таварыства. Фіналіст рэспубліканскага конкурсу “Настаўнік года-95”.

Жыве ў Паставах.

****

Калі за вокнамі лажыцца зноўку снег
І далячынь счарнелая святлее,
Душы так хочацца змяніць прывычны бег
І паляцець.
Няхай ушчэнт здрабнее
Вялікі стос нязрушаных праблем,
І пачуццё, што ўжо зусім не грэе.
Да новых высяў!
Без жыццёвых схем
Без трафарэтаў, без сустрэч пустэчы
Да новых слоў і нераскрытых тэм,
Да новых даляў!
Там, сярод сінечы,
Бліжэй да Бога, Сонца і цяпла,
Узвысяцца памкненні, справы, рэчы
І ў пыл  рассыплецца скала…
Восень ідзе
Яснее прастора, пусцеюць палі,
У рэчцы вада халаднее.
Чарговая восень ідзе па зямлі,
Сукенка на ёй чырванее.

А вочы халодныя поўныя слёз,
Якія дажджамі пральюцца,
Глядзяць у зіму і ўжо бачаць мароз,
Баяцца назад азірнуцца.

А там, за спіной, зяляніна травы
І птушак вясёлыя спевы.
Наперадзе ж – вуханне соннай савы
І голыя-голыя дрэвы…

**Мае браты**

Мае старэйшыя браты,
Мне так вас сёння не хапае.
Спагады вашай, дабраты –
Са мною вецер уздыхае.
Са мной схіляецца трава
Прад вашай памяццю ў паклоне.
У многім дзякуючы вам
У дзяцінстве сонечна было мне.

З усмешкай добраю часцей
І поўня ў вочы мне глядзела.
І на душы было чысцей,
Бо ў ёй часцей была нядзеля...

Няхай вам неба Бог дае.
І, пэўна, Франусь, Яська з Фрэдзем,
Каб на зямлі шляхі мае
Даўжэлі, – моліцеся недзе.

Ці ў тым няма маёй віны,
Што зараз Млечнаю Дарогай
Прыходзіце так рэдка ў сны

І там вы госціце не доўга?..

**Дзесьці там**

Вечар… Ціха… На пялёсткі
Падае раса.
Дзесьці там, на ўскрайку вёскі,
Дзінькае каса.
Дзесьці там густыя травы
Лягуць у пракос.
Будзе добры воз атавы,
Будзе ладны воз.
Дзесьці там каровы с пасты
Важна йдуць дамоў
І нясуць у дзень сучасны
Смак малочных сноў.
Тых чароўных летуценняў,
Што калісь былі, -
Казку, сшытую з імгненняў
Неба і зямлі.
Дзесьці там праз водар мяты
Успамін плыве,
Дзесьці там і рай, і свята,
Ды няма мяне…

****

Вёска спіць
пад музыку зімы,
Пад напевы
сцюжнай завірухі,
І па вёсках ціхія дамы
Спяць спакойна
без агню і скрухі.

Не буджу,
не рушу цішыню,
Проста сэрцам
адчуваю свята:
Разумею, што люблю…
Люблю!
Гэты свет,
што каля роднай хаты.

Гэты свет,
адкуль ідзе мой род,
Дзе радня
і дзе магілы продкаў,
Дзе круціла бабка калаўрот,
Дзе дзядуля ставіў
сеткі з лодкі.

Мне не трэба
новы свет шукаць –
Ён са мною,
ува мне заўсёды.
Сэрцу зноў
прыемна адчуваць
Прыгажосць
тутэйшае прыроды.

Не буджу, не рушу цішыню.
Буду слухаць лёгкую завею.
Пасяджу я ў хаце ля агню,
Успамінам зноў
душу сагрэю.

****

Першы марозік
і шэрань на дрэвах.
Абледзянелае шкло
ў машыне.
Восень прайшла ў вятрах
і завеях,
І вось паветра заўважна
так стыне.
Крыгі раллі сівізна атачыла,
Лужына зіхкім блішчыць
крышталём,
І ручаіны блакітная жыла
Бліскае зырка
іскрыстым агнём.
Як жа ўсё гарманічна
на свеце:
З'явы жыцця захапленне
нясуць.
Першы мароз зледзяніць
у паэце
Ржавых пачуццяў
згусцелую муць.
Яркае неба абудзіць
узнёсласць,
Думкі і мары ў свет паляцяць.
Сэрца забудзе гады
і даросласць –
І будзе зноўку кахаць…



**Пятроўская Капіталіна Цімафееўна** (1947), паэтка**.** Нарадзілася ў Кіраўскай вобласці (Расія). Жыла, вучылася і працавала ў Пермскай, Чалябінскай вобласцях. Пасля заканчэння тэхнікума лёгкай прамысловасці выйшла замуж за беларуса і трапіла на Астравеччыну. Працавала на мясцовым радыёзаводзе рабочай, майстрам, загадчыцай інтэрната для супрацоўнікаў завода, ўзначальвала завадскі прафком. Узнагароджана медалём “За трудовую доблесть”. Друкуецца на старонках газеты “Астравецкая праўда”, таксама яе вершы надрукаваны ў зборніку “На крыльях вдохновения”.

Жыве ў Астраўцы.

**Май**

В мае все черёмухи невесты
А у яблонь — вечер выпускной.
Май на красоту выдерживает тесты
Самый лучший месяц — май весной.
И сирень цветёт, и в небе звёзды.
Месяц, хоть иголки собирай.
Для любви и радости ты создан
Я люблю тебя, мой месяц май.
И хотя виски уж поседели
И уже на пенсию пошла.
Счастлива — метели отшумели

Счастлива — весна опять пришла.
И из уст невольно песня рвётся
В ней желаю я людям добра.
Пусть же всем вам счастливо живётся
Нынче — май, январь же был вчера.

**Соловей**

На черёмушке соловей поселился
И всю ночь до утра веселился.
Пел подружке своей серенады
Вы не слышали? —спать меньше надо.
Так, порхай с веточки на кусточек
Песни той, не жалей голосочек.
Так люблю твои трели я слушать
Забываю совсем спать и кушать.
Очень скоро закончатся трели
Мы наслушаться их не успели.
Если б целое лето хоть пташечка пела
Я бы точно немножечко бы похудела.
А пока распустила черёмушка
В цвете белом тонкие ветви.
Распевает в ветвях соловушка
Про любовь свои звонкие песни

**Черёмуха**

Черёмуха роскошная
У дома расцвела.
И цветами сплошь она
Укрыла соловья.
Соловушка в черёмушке
Во глубине ветвей.

Поёт звонко сударушке
Гимн о любви своей.
Весна — садов цветение
Чудесный месяц май.
И ты про невезение
Скорее забывай.
Цветам и солнцу радуйся
На лучшее надейся.
И будет в небе радуга
И тучи все развеются.

**Тюльпаны**

Под окном тюльпаны, словно пламя
Не смотря на холод, расцвели.
И хозяюшку, не зная сами
Красотой своей с ума свели.
Куда ни пойду, остановлюсь, любуюсь.
Позабыв про все свои дела.
Вспоминаю песню старую такую —
Сразу жизнь становится мила.
Я их так люблю и так лелею
Не хочу их ни дарить, не продавать.
Что там говорить — себе жалею
Три цветочка в вазочку сорвать.
А налюбовавшись, трепеща и млея
Эту несравненную красу.
Каждый год, нисколько не жалея
В Радуницу в церковь я несу.
А потом, как будто спохватившись,
Начинаю я цветы друзьям дарить
Понимаю, сильно устыдившись,

Кто же будет жадину любить.

**Мой сад**

Когда гортензия, как пена белая
Так пышно расцветёт в моём саду.
Бросаю сразу всё, чтоб я ни делала
И любоваться на неё иду.
Там флокс лиловый рядом с королевою
Ромашек белых незатейливый узор.
Весь этот хоровод меня счастливой делает
Всё услаждает, радует и тешит взор.
Вот яблочки, боки подставив солнышку
Румянятся, как будто от стыда.
А вишенки — багряные судёнышки
В зелёном морюшке снуют туда-сюда.
А вот календула зажгла здесь свой пожарище
И там и тут пылают огоньки.
А бархатцы в тени, они не зарятся
Сияют словно звезды-маяки.
Ах, Боже! Создал ты цветов такую радугу
Такие создал линии, такие кружева.
Что глядя на неё, я полнюсь радостью
И благодарностью за то, что я жива.

**Две родины**

Я тебя уважаю, ты — моя Беларусь
Я тебя обожаю, я тобою горжусь.
И с Россией моею я тебя не делю
Как сестёр вас обеих очень сильно люблю.
Назначено мне судьбою
В Белоруссии жить.

Повстречаться с любовью
Деток здесь народить.
Эту сладкую муку
Мне ни с чем ни сравнить.
Здесь дождалась я внуков
Дал Бог счастья дожить.
По России тоскую,
Так хочу побывать.
И землицу родную
И могилки обнять.
Там в тени тополиной
Силы вновь наберусь.
И с головою повинной
Возвращусь в Беларусь.

**Матерь Божья Казанская**

Матерь Божья Казанская –
В уголке висит икона.
На коленях, по-спартански
В тишине ей бью поклоны.

Милосердная, прощения
За грехи свои прошу
И от всяких бед спасения
В уголке этом ищу.

Мне ли смелой, безрассудной
За грехи мои бояться?
Только что же мне так трудно
Вдруг с колен своих подняться…

**О Полинке**

- Куда одна идёшь пешочком?
- Я не одна, я с рюкзачком.

В рюкзачке моём - игрушки,
Я иду играть к подружке.

**О котике**

Одноглаз, всего три лапы –
Это котик бабы Капы.
Баба капа – это я,
Ко мне приходит кот, друзья.
Котика зову я Мао,
Еды ему всё время мало,
Но инвалида я жалею:
Даю поесть всё, что имею.

**Пяшко-Базюк Алена** нарадзілася ў вёсцы Маркуны. У 1987 годзе скончыла Міхалішкаўскую сярэднюю школу, затым – філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, акадэмію паслядыпломнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, магістр педагагічных навук. Працавала настаўніцай ў беларускай сярэдняй школе імя Ф. Скарыны горада Вільнюса.

Вершы Алены змяшчаліся ў "Астравецкай праўдзе", у літаратурна-мастацкім выданні "Дарункі бацькоўскай зямлі" (Мінск, 2001).

**А ты ідзі…**

А ты ідзі насустрач мне
У снегапад і ў яснае надвор'е.
Пачуцці, што затоены на дне,
Ты ажыві – для нас і наваколля.
Адкінь бяду,
пазбаў пакут сумленне,
Ідзі з надзеяй на паразуменне
І ачышчай душу супакаеннем
Для заўтрашніх надзей
і для людзей.
Каб быць патрэбным
у вялікім свеце,
Не выбірай чужых дарог,
Адкрый душу насустрач мэце,
Што змалку ў сэрцы ты бярог.
Бярог для спраў вялікіх
і адкрыццяў,
Для радасці жыцця і для яго турбот,
Чакаючы кахання ніцяў,
Каб ажывіць душы палёт.
Прыйшло, здзяйснілася нарэшце –

Мы лёсам паяднаныя з табой;
Хвілінаю падасца жыццялецце,
Бо ты са мной, бо ты са мной.

**Роздумы**

Мяцель-завіруха ахутала далеч,
Дарогу заносіць
страшэнная замець.
За гурбамі снегу віднеюцца хаткі,
Дзятву не пускаюць
пакоўзацца маткі…
Я лямпу ўключыў і сяджу ў цяпле,
А думкі плывуць і плывуць
паўз мяне.
Пара бы за справу ўзяцца якую,
Бо заўтра за гэта сабе не дарую.
Я поглядам сталым акіну жыццё,
Выснову зрабіў,
што дарма не прайшло:
Імкнуўся, стараўся
кудысці паспець,
Камусці даць рады,
другому – паесць.
За ўсё ў гэтым свеце плаціць
мы павінны:
За ўчынак надуманы
і ненаўмысны,
За слова ліхое
і жарт-недарэчнасць,
За праўду, няпраўду
і бессардэчнасць.

**Маці-настаўніцы**

Гады – як нітачкі, як павуцінкі –
Так незаўважна сетачкі бягуць.
Але заўсёды мілыя маршчынкі
Упэўненасць і радасць нам даюць.
І як бы цяжка, крыўдна і балюча
Падчас на сэрцы ні было ў цябе,
Матуля здыме боль рукой гаючай –
Адразу ж пацяплее ад яе.
Так кожны дзень
спяшаецца ў школу,
Заўсёду йдзе ўпэўненай хадой.
Гады-сняжынкі ападаюць долу…
Дык дай жа Бог
пражыць ёй сто гадоў.

**Вальс у прыродзе**

Як прыемна ісці басанож
Летнім ліўнем размытай
сцяжынкай…
Кроплі-расінкі ўпадаюць у Сож –
Напаўняюць прастору жывінкай.

Краскі лясныя расправілі грудзі,
Вяз у абдымку танцуе з сасной!
Хоць на хвілінку спыніцеся, людзі,
І палюбуйцеся дзіўнай гульнёй.

Так пастараўся магутны Даждбожа
Даць наталенне прыродзе лясной;
Хто ж, як не ён, ёй цвісці дапаможа,
Зробіць прыгожай і вечна жывой?



**Рыбалка Антаніна Адамаўна** (1948) нарадзілася ў вёсцы Смятанічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1966 г. скончыла Смятанічаўскаю школу і паступіла ў Бабруйскі сельгастэхнікум, атрымала прафесію эканаміста.

Вершы пачала пісаць у сталым узросце. Вершы друкаваліся ў газеце “Петрыкаўская ніва”, “Астравецкая праўда”, “Беларуская ніва”, “Друг Пенсионера”, у часопісе “Вожык”. Аўтар зборніка “Радуга чувств” (2018).

Фіналіст абласнога конкурсу “Мая Перамога. Моя Победа”. Вершы «На аллее Славы», «В памяти матери», «Сынок, я верю, ты живой» прысвячаюцца вядомым і невядомым, жывым і якія пайшлі з жыцця, датычным і неабыякавым землякам.

Антаніна Адамаўна сцвярджае, што паэзія гэта бачанне незвычайнага ў штодзённым. Паэтка верыць - свет створаны для дабра. Але і таксама лічыць, што не ўсё ў гэтым свеце афарбавана вясёлкавым колерам, у свет нахабна ўрываецца жорсткасць...

Вершы адзначаны Ганаровай Граматай Міжнароднага Саюза Славянскіх журналістаў.

Жыве ў п. Муляроўка на Гомельшчыне.

**Малая радзіма**

Прайшла ў жыцці
няхай фартуна міма.
Адной заўжды шчаслівы
будзеш, браце.
Ты – чалавек,
як на малой радзіме

Яшчэ святло гарыць
у роднай хаце.

З дарогі маці на пароге стрэне,
З пяшчотаю твае абніме плечы,
Настольніцу святочную засцеле,
Са скваркамі
дастане бульбу з печы.

Нагбом з глячка
нап’ешся сырадою,
Як адпачнеш – сяброў адразу
знойдзеш.
Да студні ранкам
з чыстаю вадою
З салодкім смуткам
па дарожцы пойдзеш.

На гэтай сцежцы,
як павечарэла,
Спаткаў аднойчы
першае каханне…
Расце таполя, дзе была арэля
І дзе зрабіў
нясмелае прызнанне.

У лесе дружна зацвілі ажыны,
Рунее жыта і гамоніць
з ветрам,
А на мяжы ля маладой каліны
Надыхаешся
водарным паветрам.
Вялікі скарб –

маленькая радзіма…
Забудзеш тут усе свае нягоды.
Звязала нас ад роду пупавіна,
Цябе бязмежна
любім мы заўсёды.

**Мать солдата**

Вечер проходит, и полночь минула,
А мать солдата ещё не уснула.
Сердце – сплошная открытая рана:
Страшную весть получила с Афгана…
Кажется ночь беспросветной
и длинной,
В руки берёт фотографии сына.
Маленький, к матери тянет ручонки…
Вот он стоит возле юной девчонки.
Статный, красивый выходит из дому,
Скоро наденет военную форму…
Может, случилась какая ошибка?
Вдруг неожиданно скрипнет калитка.
Только под утро она засыпает,
Только во сне её сын обнимает.
Вы нам простите, солдатские мамы,
За сыновей, что погибли в Афгане…
В армию с гордостью их провожали,
«Цинковых мальчиков» вам возвращали.

**На аллее славы**

Блестят на храме золотые главы,
Народ гуляет в парке городском.
Она ж приходит на аллею Славы,
Подолгу разговор ведёт с отцом.
Не поднял глаз,

не обменялся взглядом –
По сердцу снова полоснула боль.
Застыл навечно вместе с автоматом,
Так мало дней отсчитано судьбой.

Война во всём, бесспорно, виновата.
Испытываю гордость за отца:
Бесстрашным был
и доблестным солдатом,
В бою свой долг исполнил до конца.

Качала колыбельку мою мама,
С фашистами сражалась вся страна.
Она тебя, родимый, долго ждала,
Одна меня растила, берегла.

Твоей любви, заботы не узнала,
Не дай нам Бог когда-нибудь войну!
Отроду слова «папа» не сказала
За много лет ни разу никому.

Поклон отцу отвесила учтиво,
Слезу утёрла горькою рукой:
«Ты отдал жизнь,
 чтоб солнце нам светило,
За небо голубое надо мной!»

**Нельга ў небе журавак лічыць**
У даліне трава зелянее,
Ручаёк з пераразвонам бяжыць.
Весні вецер на вуліцы вее,

Хмарка з’явіцца – гром загрыміць.

Пералётнае птаства вітае,
Нізка цуг над зямлёю ляціць.
А чаму, дык цяпер не ўзгадаю,
Журавоў пачала я лічыць?

Будзяць далі трывожныя песні,
Сінявою зіхціць далягляд.
Журавы закружылі на месцы…
Чарада павярнула назад…

Мне здалося, замоўклі ўсе гукі,
Хоць не вернеш былыя гады,
Памятаю, як матчыны рукі
Прыгарнулі пяшчотна тады:

- Гэта вельмі прыгожая птушка,
Ты, малая, расці, табе жыць.
Па народным павер’і, дачушка,
Нельга ў небе журавак лічыць.

Пасля той незвычайнай нагоды
Журавы не лічыла вясной,
Бо я вельмі хачу, каб заўсёды
Над радзімай ляцелі маёй!

**Зімовая пара**
Завіруха заўжды адступае,
Як накруціць сумётаў і грыў.
Вецер потым у лесе страсае
Срэбра з сосен
і стромкіх ялін.

Зіхаціць далягляд белізною,
Пад халоднаю коўдрай
ляжыць.
Задрамаў маладзік
над зямлёю,
А мароз нават ноччу не спіць.

Падбярэцца
да нашай сядзібы,
Калі моцны адолее сон.
І нябачным пэндзлікам
шыбы
Размалюе да раніцы ён.

Маразы больш
лагоднымі сталі,
З шызай хмары
сняжынкі ляцяць.
Траскуны, як раней,
перасталі
Па сцяне і па гонце страляць.

Не крыўдуем, бадай,
на пагоду –
Усяму ў прыродзе свой час.
Вось каб толькі
халоднага лёду
Не ляжала на сэрцы у нас.

**Сильная женщина**
С виду хрупкая и красивая –
Даже взгляд отвести нельзя.
«Эта женщина очень сильная!» -

Говорят про неё друзья.

Молодая была, успешная,
Ей казалось всё нипочём!
Что за жизнь эта наша грешная!
Словно кто рубанул мечом.

Человека, сердцем любимого,
Никогда не почувствует
взгляд…
Эх, метель, метель тополиная
Замела дорогу назад.

Вроде, всем она обеспечена,
Ей бы жить да жить,
не тужить…
Только эта сильная женщина
Очень хочет слабою быть.

Когда путь впереди ухабистый,
Если ветер ещё в лицо,
Чтобы кто-то верный,
порядочный
Ей подставил своё плечо…

О судьбе, что она несчастливая,
Вряд ли будет кому говорить.
Но я знаю,
что женщина сильная
Очень хочет слабою быть…



**Рыбік Алена Пятроўна** нарадзілася ў 1985 г. у г. Хойнікі Гомельскай вобласці. У 1989 годзе пераехала з бацькамі ў Астравец. Закончыла 9 класаў Астравецкай СШ № 2, затым вучылася ў ліцэі БДУ, на філалагічным факультэце БДУ, займалася ў магістратуры. У розныя часы жыла, вучылася і працавала ў Мінску, Берліне, Канстанцы. Зараз жыве і працуе ў Швецыі.

Вершы Алены Рыбік друкаваліся на старонках газет “Астравецкая праўда”, “Гродзенская праўда”, у часопісу “Полымя”, у зборніках “Галасы”, “Астравецкі край”, “Астравецкай зямлі галасы”, “Прайсці праз зону. Кн. 2”.

У 2016 г. была выдана кніга вершаў А. Рыбік “La Nina”.

**Маме**

Мой маленькі анёл,
што назваў мяне імем
анёла,
і З табою нам – стома,
а БЕЗ –
нават большая смага;
ты не ведаеш сілы,
што плешчацца ў пальчыках кволых,
дай жа Божа не ведаць,
якая жыве ўва мне прага.

Недзе вельмі глыбока,
далёка – навошта і ведаць? –
калі ты сніла сны,

дзе гулялася з сонечнай плямай,
калі я зашнуроўвала
белыя лёгкія кеды, -
недзе там назаўжды
мы з табой размінуліся,
мама.

І навошта тады мне
шукаць нейкай думкі
ў цудзе
(да жаночай рукі прыкладаючы
лісцік-далоньку) –
па-над кніжкай тваёй
ціха плачуць чужыя людзі,
а мой сшытак гартае адна твая
гора-донька.

Мой маленькі святы!
Мой сакрат беласценнай элады!
Ты адкрыла закон,
найгалоўнейшы ў лёсавым маі –
у Сусвеце адна,
нават самая хворая, -
праўда.
Я ж у іншай дарозе
сваю, мама, праўду, шукаю.

**Гародня**

Мой любы брук! –
Наднёманскі куток –
Над вастрынёй тваёй узыдзе поўня.
Закальцаваны думкі ў выток –

Запаланёныя табой, Гародня!

З дачкі каменняў вырастаеш ты,
З Максімавай ліхтараванай Вільні,
Між душамі натхнёныя масты
Узводзіш, быццам майстар
рупны, пільны.

Разветраныя вуліцы наўстяж
Сустрэнуць недалюбленых
блудліўцаў.
Ты паспрабуй і думкай ў вецер ляж,
Каб з горадам душою хворай зліцца.

І аж да болю, кроўю ўсёй, адчуй
Глыбокі ўздых –
тваёй і ўсіхняй – волі..
Ты гэты горад бачыш уваччу!
Для шчасця, вер,
ніштo не трэба болей.

Ад мокрых, брукаваных тваіх сноў
Я збегла, каб вяртацца кожнай ноччу.
І сёння, горад казак мой ізноў
Я прылячу, калі ты толькі хочаш.

І захліпнуся ўжо забытым – Не!
Не здолела яго забыцца! – ветрам,
І закрычу, каб ён, як звон, звінеў,
Каб перахрышчваў
цёмных вуліц нетры…

* * *

Ты маёю душою быў,
Прыцягненнем да крохкай пяшчоты,
Маёю сілай.
Па дробненькіх кроплях
Выдыхаю —
Цёплае, важкае,
што так доўга ў сабе я насіла.
Прысутнасць маю тонкую
Ты яшчэ адчуеш
У імені,
Выбітым на тваіх вуснах,
У падушачках пальцаў нячутных
На зорачках-вейках,
У глыбінным уздыху,
Што вырвецца
І ў паветры марозным застыне
Вузенькай белай змейкай.

* * *

Сонца пра нас думае
Жоўтымі промнямі,
Нашы бяздонныя погляды
З ветрам носяцца.
І ўсё,
Да фіранак на вокнах,
З табою помнім мы.
І ўсё,
Да смаку гарбаты,
Назад у нас просіцца.
І ведаем: некалі разам затопчам рыску,
Што раздзяліла тую і гэтую восень.

І ты — цёплымі вуснамі
У сонцавых пырсках
будзеш лічыць рабацінкі
У мяне на носе.

* * *

Я люблю ісці з бібліятэкі
Ўніз па ціхай вуліцы паціху.
Рукі ў кішэнях лёгкай курткі.
Рукі – гэта лепшы паказальнік
І таго, калі цябе кахаюць,
І што травень гэтым годам цёплы.
Я сціскаю кулакі ў кішэнях –
Два наскрозь халодныя нулі.

**Балтыка**

У пацалунку з морам спляліся нябёсы,
Ціха злуецца бурлівы, раўнівы прыбой...
Балтыка, мара! Дзяўчынкай, натхнёнай і босай,
Я прыбягаю штовечар спаткацца з табой.
І назбіраўшы паўнюткія прыгаршчы зорак,
Іх ахвярую тваёй тваёй цёмнахвальнай красе,
Каб у глыбінях таемных бязмежнага мора
Сталі празрыстым бурштынам яны пакрысе.
Вецер кранае мне вусны марской прахалодай,
Ціха змываючы след пацалункаў былых...
Балтыка, казка! Дай мне крышталік свабоды,
Іх жа так многа ў цесных далонях тваіх...

****

Снег ціха беліць твае валасы,
Перш чым на дол назаўсёды легчы…
Мама, душы няма большай красы.
Паабяцай мне, што будзеш вечнай!
Узросты заблыталі думкі мае –
Ім трэба спяшацца, стаяць і бегчы.
Мама, як скроні іней кране, -
Паабяцай мне, што будзеш вечнай!
Калі апускаюцца рукі ў журбе,
Нясе мне спакой тваёй ласкі свечка.
Мама, я, ведай, люблю цябе.
Паабяцай мне, што будзеш вечнай!

****

Такім святлом напоены пакой,
у кубках астываюць нашы думкі,
І сонца з ценем крохкія карункі
з павекаў не змахнуць ніяк рукой,
і гукі заплятаюцца ў спакой,
і дзверы не прапусцяць
                                    іншых крокаў,
і да ўсяго-ўсяго яшчэ далёка
і толькі да цябе – падаць рукой.



**Рыбік Ніна Аляксееўна** (нар. у 1962 г.), беларуская пісьменніца, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў. Нарадзілася ў в. Уласы Хойніцкага раёна Гомельскай вобл. У Астравец трапіла пасля аварыі на ЧАЭС. Журналіст з 40-гадовым стажам. З 1989 года працавала ў газеце “Астравецкая праўда”, на працягу 26 гадоў была галоўным рэдактарам газеты.

З’яўляецца пераможцам шматлікіх абласных, рэспубліканскіх і міжнародных творчых конкурсаў. Прызнавалася чалавекам года Гродзеншчыны, жанчынай года Беларусі.

Былі выданы кнігі Н. Рыбік “Права на адсяленне” (2001), “Свае і Чужыя” (2008), “Скрыжаванне” (2013), “Кожны стрэчны нам настаўнік” (2021), “Праз гады і газетныя старонкі” (2022). Творы Ніны Аляксееўны друкаваліся на старонках рэспубліканскіх часопісаў і газет, у калектыўных зборніках.

**Радуніца** (апавяданне)

Узімку Валянціна прыхварэла: разбалелася спіна, стала аддаваць у нагу, ноччу круціла суставы… Усю вясну, лета і восень яна корпалася ў агародзе, у кветніку, на падвор’і, у хаце: садзіла, падкормлівала, палола, перасаджвала, збірала, сушыла, закатвала, варыла, прыбірала – круцілася, што тая вавёрка ў коле. А калі ўсе работы былі пароблены, арганізм даў збой, бы вырашыў: хопіць! І як ні пераконвала сябе кожны ранак Валянціна, што сёння ёй ужо лепш, што трэба падымацца ды займацца

справамі, цела, абзываючыся то вострым, як лязо нажа, то тупым, як скавытанне ветру за акном, болем, нібы пасміхалася: не, не сёння... Хачу яшчэ адпачыць… Дзеці гналі ў бальніцу. Але Валянціна штораз знаходзіла прычыну, каб адмовіцца: ведала, што ўрач і лякарствы ёй не дапамогуць – арганізму проста патрэбен адпачынак, ён ужо неаднойчы «бунтаваў», калі яна кідалася ў работу без перадыху. Але дзень і другі, і тыдзень, і месяц не давалі чаканай палёгкі.

Крыху адпусціла яе толькі вясной, перад Вялікаднём. Хату да свята яна прыбрала, а вось на могілкі не выбралася: не хапіла сонца, як некалі напаўжартам казала ў такіх выпадках бабуля. Толькі на Радуніцу – Пасху памерлых, паклаўшы ў кошык з дзясятак спецыяльна пафарбаваных да гэтага дня яек, пайшла праведаць сваіх. Святар забараняў класці яйкі, цукеркі на магілы, казаў, што гэта перажыткі язычніцтва, – Валянціна з ім пагаджалася, але ўсё роўна рабіла так, як спакон веку павялося ў іх вёсцы. Да восеньскіх Дзядоў, хоць спіна ўжо абзывалася пагрозлівым болем, паспела, хоць праз сілу, прыбраць магілкі. Ды на свята, кажуць, усе спачылыя чакаюць родных. Трэба прынесці пачастунак, паставіць кветкі, запаліць свечкі, памаліцца, пагаманіць з імі, для яе – па-ранейшаму жывымі…

…Усё яшчэ накульгваючы, хадзіла яна ад адной роднай магілы да другой. Паўшчувала да часу пакінуўшага яе Андрэя, што рэдка праведвае: не сніцца, як раней, не папярэджвае пра небяспеку, не дае парады. «Ты глядзі там, – сказала, углядваючыся ў маладыя, са смяшлівай іскрынкай, каханыя вочы мужа, – даведаюся, што пакінуў мяне, – і на тым свеце дастану!»

Расказала маме, якая неўзабаве пайшла ўслед за зяцем, падбавіўшы дачцэ сардэчнага болю, пра пацешнага праўнучка, якога яна так і не пабачыла: памерла за тыдзень да яго нараджэння.

Пагладзіла халодныя гранітныя кучары брата, якога заўчасу з'еў рак: «Не сумуй, Міколка, твае таксама прыйдуць. Павінны прыйсці! Радуніца ж…»
І збочыла да магілкі колішняга суседа, Пятровіча. Сэрца зайшлося-затрымцела ад болю і сораму. Не хапіла ёй ні часу, ні сіл навесці тут парадак восенню – і бур'ян амаль закрыў здымак на пахіленым помніку. Значыць, ні жонка яго, ні дзеці так і не выбраліся на могілкі за гэты час.
«Прабач, Пятровіч, – Валя нахілілася, каб сарваць самыя нахабныя бадылі чарнабылу, адначасова прыслухоўваючыся да спіны, якая тут жа пагрозліва заныла. – Прыхварэла я… Не паспела да свята… Абяцаю: як толькі трохі злягчэе – прыйду, прыбяруся і ў цябе. А пакуль – прабач…»

Пятровіч з медальёна ўсміхаўся добра, прабачальна – як і ў жыцці. Ён ніколі ні на кога не крыўдзіўся – і на яе, спадзявалася Валя, не сярдуе, як заўсёды, зразумее і даруе. Толькі ёй даравань сабе было цяжка…
…Яны жылі па-суседску. Нягледзячы на розніцу ва ўзросце, Пятровіч непрыкметна і трывала ўвайшоў у іх сям'ю. Ён быў негаваркім, не любіў шумныя кампаніі, але заўсёды імкнуўся дапамагчы. Трэба адлучыцца, а няма на каго пакінуць малых – Пятровіч выручыць. Патрэбна Андрэю лішняя пара рук на будоўлі – стары тут як тут. Налавіў ранкам карасікаў – тут жа падсмажыў і прынёс суседзям: частуйцеся! Валя здагадвалася, што Пятровічу сумна і адзінока ў сваёй сям'і, таму і прыходзіў да іх сусед пры

найменшай нагодзе і без яе, каб пагрэцца ля чужога цяпла…

Чаму яму было холадна ва ўласным вялікім і прыгожым доме, Валянціна даведалася выпадкова. Аднойчы яны з Андрэем пасварыліся – сёння яна разумее, што з-за глупства, і ўспамінаць смешна. А тады здавалася: усё, сумеснае жыццё скончылася! Няма іншага выйсця – толькі развод. Андрэй зазлаваўся не на жарт: ранкам выходзіў з хаты, не паснедаўшы, на абед не прыходзіў, вечарам з’яўляўся нападпітку. Валя ж перастала варыць есці і, дэманстратыўна нафарбаваўшы вусны яркай памадай, ішла… На самой справе – да сяброўкі, што жыла на суседняй вуліцы, але з такім выглядам, нібы на спатканне: маўляў, хай ведае, што не адзін ён у свеце!

У адзін з такіх вечароў і прыйшоў Пятровіч. Бутэльку з сабой прынёс, сала шматок, цыбуліну. Валя ў той вечар нікуды не пайшла і перш хацела вытурыць суседа: ці не першы вечар, калі Андрэй цвярозы з’явіўся, і тут зноў… Ды нешта падказала, што не дзеля выпіўкі зайшоў Пятровіч – не ўлягаў ён у гэтую справу. Мужчыны разлажылі ў двары агеньчык, сталі смажыць сала на ражнах – такі водар разнёсся па наваколлі, што Валя памкнулася было падысці да іх, папрасіць, каб і яе пачаставалі. Прыадчыніла ўжо дзверы, але словы Пятровіча прымусілі спыніцца.

– Ты што, браце, надумаў? Які развод – звар’яцеў, ці што? Думаеш, іншая жанчына лепшай, раднейшай будзе, чым жонка? Думаеш, нехта лепш пра цябе клапаціцца стане? Гэта яна цяпер ад злосці і крыўды носіцца як кіпенем абвараная, а на самой справе яна ж харошая жанчына. Сапраўдная. І цябе любіць. А ты – яе… Я ж бачу, пра гэта гаварыць не трэба – вочы ўсё скажуць. Дзеці ў вас. Ты пра

іх падумаў? Казалі старыя людзі: дай бог адным кавалкам падавіцца… Не ламай жыццё ні сабе, ні ёй, ні сынам. Не паўтарай маіх памылак! Хочаш ведаць, што я натварыў, за што цяпер расплачваюся? Чаму цяпер хаджу жанатым бабылём і толькі каля вас душой адаграюся? То слухай…

…Так і прастаяла Валя ў той вечар за дзвярыма гадзіну ці болей, баючыся зварухнуцца, каб не выдаць сябе і не перарваць, не спалошыць выпакутаваную споведзь Пятровіча…

...Першае каханне ўварвалася ў яго жыццё, калі ўжо атрымаў позву ў ваенкамат. Раней ён не звяртаў увагі на суседскую цыбатую Зінку. Ды неяк у клубе яна, чырванеючы, запрасіла Аляксея на белы танец. І ўсё – прапаў хлопец! Ямачкі на шчоках, заўсёды затуманеныя таямнічай павалокай вочы… Ён не мог ні спаць, ні есці, хацеў зранку да вечара трымаць Зіну за руку, глядзець у гэтыя затуманеныя вочы, адчуваць цяпло яе дрыготкіх плячэй.

– Будзеш чакаць мяне з арміі? – ледзь не штохвіліны перапытваў ён Зіну.

– Канешне, дурненькі, – усміхалася яна ў адказ. – Я ж цябе кахаю…

Зіна чакала два гады. Але Лёшу забралі ў марфлот, на тры. Іх агульны сябар, Пецька, які прызваўся ў адзін дзень з Аляксеем, але трапіў у танкавыя войскі, вярнуўся раней… Калі да дэмабілізацыі заставалася паўгода, ад яго прыйшло пісьмо «Лёша, не крыўдуй на нас… Я кахаю Зіну. І, як высветлілася, яна мяне таксама. Сэрцу не загадаеш… Прабач, сябар!»

Прабачыў Аляксей ці не, але дахаты не паехаў. Ды ніхто яго ў роднай вёсцы і не чакаў: гадаваўся хлопец без бацькі, а маці памерла неўзабаве пасля таго, як яго забралі ў

войска. Пісала цётка Дуня, прасіла прыязджаць, клікалі сябры, але шчымела балючая рана ад двайной здрады каханай і сябра. Яшчэ да дэмабілізацыі падаў дакументы ў ваенна-марское вучылішча: прыязджалі адтуль «сваты», абяцалі залатыя горы. Паступіў лёгка, вучыўся без асаблівага старання, але і без праблем. На апошнім курсе ажаніўся, у далёкі гарнізон паехаў з маладой жонкай. Там у іх адзін за другім нарадзіліся дачка і сын… Жылі, час ад часу злёгку перасварваючыся ранкам ці ўвечары і палка прыміраючыся ноччу. Дзеці раслі, ён памалу рухаўся па кар'ернай лесвіцы… Пра Зінку з Пецем амаль забыўся.

***

Прайшло гадоў дзесяць, калі цётка Дуня напісала, што крыж на матчынай магіле зусім згніў, яна адзіная на могілках стаіць без абгародкі… Аляксею стала сорамна: маці гадавала яго адна, не дасыпала, не даядала, а ён нават магілу яе ў парадак не прывёў, яму, ці бачыце, не хочацца сустракацца з першым каханнем. Падумаеш, Зінка! У яго жонка. І дзеці…

У чарговы адпачынак Аляксей сабраўся на радзіму. Сям'ю не браў: дачка яшчэ малая, ды і хацінка ў цёткі Дуні маленькая, дзе там ім чатыром размясціцца… А мо, таму, што ведаў: у вёсцы ён абавязкова сустрэне Зіну… І не хацеў, каб тую сустрэчу бачыла Таня…

…Яны спаткаліся ў першы ж дзень. Аляксей вяртаўся з могілак, ішоў праз жытняе поле па сцежцы – напраскі было бліжэй. Хоць і заворвалі яе кожную вясну, вяскоўцы ўсё адно да Радуніцы пратоптвалі ў пасевах вузкую, як прайсці, стужку.

Зіна ішла насустрач – у паркалёвай квяцістай сукенцы,

накінутай на плечы хусцінцы, валасы колеру спелага жыта рассыпаліся па плячах… На сцежцы было не размінуцца, камусьці трэба было збочыць у жыта. Ён спыніўся. Спынілася і Зіна. Глядзела на яго, не міргаючы, тымі ж сінімі вачыма з павалокай, ад якой туманіўся розум…

– Прыехаў, – яна першай парушыла маўчанне. – Нарэшце… Я чакала! Крыўда, якая, здавалася, ужо забылася, накрыла з галавой.

– Я заўважыў, – адказаў ён з’едліва.

– Ты… Ты нічога не ведаеш… – хутка, задыхаючыся, нібыта баючыся не паспець, стала гаварыць Зіна. – Ты думаеш, мне лёгка было? Вы ж там, у войску, – адны хлопцы, ніякіх спакус. А тут… То вяселле, то провады, то танцы.. І ўсе пасміхаюцца: «Ой, салдата яна чакае, паглядзіце на яе – гераіня! Пабачым, што ты скажаш, калі ён з маладой жонкай вернецца, як Сашка Матрунчын! А тут Пецька вярнуўся… Ён быў адзіны, з кім я магла пагаварыць пра цябе, пайсці на танцы, не баючыся размоў, – гэта ж твой сябар! Аднойчы мы былі разам на вяселлі, шаферамі. Цалавацца прымусілі за сталом – нібыта жартам. А я, як цябе праводзіла, ні з кім ні разочку не пацалавалася! Павер, праўду кажу! Аж галава закружылася ад таго пацалунка... Ці ад шампанскага? Пасля, калі ён праводзіў мяне дахаты, зноў пацалаваў каля веснічак. Ну і… Я сама не разумею, як усё здарылася! А калі даведалася, што цяжарная… Ну што было рабіць? Цябе з арміі з пузам сустракаць? Пецька сказаў: я сам ўсё Алёшу напішу, ён зразумее. Так вось… Сталі жыць… Дачушка нарадзілася, Танюшка. Потым яшчэ адна, Марынка… Ты не ехаў… Пеця співаўся.. Утапіўся неяк па п’янцы ў возеры, табе ж, мусіць, цётка Дуня пісала. Але я не таму чакала, калі ты прыедзеш… Хацела, каб без жонкі, каб

пагаварыць… Я знарок цябе стрэла тут, бачыла, што на могілкі пайшоў. Так, я вінаватая. Але хачу, каб ты ведаў: цябе кахаю. Заўсёды кахала. А Пецька – гэта так… Памылка маладосці…

– Але ж я… Аляксей хацеў сказаць, што жанаты, што ў яго таксама двое дзяцей, але Зіна закрыла яму рот прагным пацалункам:

– Маўчы… Маўчы… – шаптала яна, прагна цалуючы.

– Потым… Потым усё раскажаш. А зараз я хачу напіцца цябе, насыціцца табой. Якая дурніца была, што тады, перад арміяй, не аддалася табе – тады б ты быў мой, і ніякі Пецька б не перашкодзіў. Я хачу цябе! Аднаго цябе, больш мне ніхто не патрэбен, – Зіна цягнула хлопца, які ўжо не меў сіл супраціўляцца, падалей у толькі што закаласіўшаеся жыта…

– Зіна, у мяне жонка і дзеці, – сказаў Аляксей, калі яны ляжалі на выкачанай прагнымі целамі ў жыце лагчыне і глядзелі ў высокае неба, па якім плылі рэдкія карункавыя аблачынкі.

– Я ведаю, – Зіна сарвала травінку і стала яго казытаць.

– Цётка Дуня ўсім расказвала, які ты харошы, якая ў цябе жонка цудоўная і дзеці прыгожыя, карткі паказвала… А ты ўсё роўна мяне любіш! – засмяялася яна смехам, які паралізоўваў яго рухі, думкі, словы.

– Адкуль ты ведаеш? – паспрабаваў Аляксей супраціўляцца.

– Мо, скажаш, што не? – Зіна зноў прагна, да болю, упілася вуснамі ў яго рот, не даючы прамовіць і слова.

…У той прыезд Аляксей не паставіў помнік па маці, як збіраўся: увесь адпачынак не вылазіў з Зінінай хаты – дзяцей яна выправіла да маці. А з адпачынку ў Севастопаль, дзе ён

служыў, яны паляцелі ўдваіх. Дачок Зіна пакінула з бабуляй – да таго часу, пакуль уладкуюцца на новым месцы. Цётка Дуня галасіла, праклінала верціхвостку Зінку, вяскоўцы асуджальна ківалі галовамі – Аляксею было ўсё роўна: у яе абдымках ён забываўся пра ўсё і пра ўсіх і хацеў аднаго: каб гэта ніколі не заканчвалася!

У Севастопалі яны знялі кватэру. Ён выйшаў на службу і толькі праз месяц рашыўся прыйсці да жонкі. Таня кінулася насустрач:

– Лёша, што здарылася? Дзе ты быў так доўга? Абяцаў вярнуцца праз два тыдні, а ўжо другі месяц пайшоў. Мне казалі, што бачылі цябе ў горадзе, але ж, напэўна, памыліліся, праўда?

– Таня, прабач мяне, – амаль бязгучна выдыхнуў Аляксей. – Я падаў на развод...

– Што? Які развод? Чаму? Што здарылася? Ты, пэўна, жартуеш?

– Не, не жартую… Там, у вёсцы, я сустрэў сваё першае каханне. І зразумеў, што яно нікуды не падзелася. Што ўсё гэтак жа, а можа, нават больш люблю гэтую жанчыну. Прабач…

– А я? А дзеці? – у знямозе апусцілася на зэдлік жонка.

– Як нам жыць?

– Дзяцей не кіну. Буду дапамагаць…

– А як жа я? – не чуючы яго слоў, хісталася і бясконца паўтарала Таня. – А дзеці?.. А я?.. А дзеці?..

Каб не бачыць гэтага, не тлумачыць нічога малым, якія вось-вось павінны былі вярнуцца з вуліцы, Аляксей паклаў на стол грошы і выйшаў з кватэры. «Усё ўсталюецца, – суцяшаў ён сябе. – Усё будзе добра. Таня супакоіцца. З дзецьмі я пагавару пазней. Галоўнае – я шчаслівы, як ніколі

ў жыцці! Я маю права на шчасце…»

Нічога не ўсталявалася. Таня так і не апрытомнела ад яго здрады: налажыла на сябе рукі. Дзяцей давялося забраць да сябе. Адносіны з Зінай у іх не злажыліся з першага дня: ні Наташа, ні Алік не маглі дараваць мачысе, здрады бацькі і смерці маці. Ды і Зіна не вельмі старалася наладзіць гэтыя адносіны. Гром-баба, якая прывыкла ісці па галовах, каб дамагчыся свайго, яна ні з кім не цырымонілася – ні з суседзямі, ні з яго сябрамі-саслужыўцамі, якіх хуценька адвадзіла ад дома. А ўжо тым больш – з чужымі дзецьмі! Увесь час папракала мужа – яны распісаліся адразу пасля смерці Тані, што не можа забраць сваіх дачок і яны, бедныя, гадуюцца ў вёсцы ў бабулі, а ягоныя дзеці ходзяць у лепшую школу, апранаюцца, як лялькі, толькі нічога не цэняць, няўдзячныя, ваўчанятамі пазіраюць. Пры нагодзе і без яе старалася ўкалоць малых як мага больш балюча: папракнуць, высмеяць, паўшчуваць. Аляксей падазраваў, што калі ён на службе, то малым перападае і кухталёў. Алік, які першым убачыў маці ў пятлі, стаў ноччу мачыцца. Зіна дэманстратыўна развешвала ранкам у двары мокрыя прасціны з адпаведнымі каментарыямі – каб чулі і бачылі суседзі, пакуль Аляксей не прыкрыкнуў на яе. Пра гэта ён потым моцна пашкадаваў, бо быў на цэлы месяц адлучаны ад сямейнага ложка і начаваў у прыхожцы на вузкай канапе.

Старэйшая Наташа спрабавала даць мачысе адпор, абараніць браціка. Але што магло зрабіць дзіця? Закончыўшы сяк-так восем класаў, дзяўчына паступіла ў тэхнікум і з’ехала ў іншы горад. Бацька рэгулярна пасылаў ёй грошы, але дахаты дачка не прыязджала. А калі закончыла вучыцца і ўладкавалася на работу, яго пераводы

сталі варочацца назад.

Забіты, запалоханы Алік звязаўся з дваровай шпаной, хутка навучыўся піць, курыць і яшчэ па малалецтве трапіў спачатку ў спецвучылішча, а затым і ў калонію.

– Во якія тваe дзеткі! – кожны вечар заводзіла адну і тую ж песню Зіна. – Паскуды няўдзячныя! Што адна, што другі – усе ў мамачку, псіхі ненармальныя! А ты толькі грошы на іх траціш! А мае дочкі…

– Тваім дочкам я пасылаю, мо, утрая больш, чым даю сваім! – апраўдваўся Аляксей.

– У маіх ты ўкраў самае дарагое – маці! З-за тваіх дзяцей я не магу Танечку і Марынку забраць сюды, даць ім паўнацэннае выхаванне. І бацькі яны не ведаюць! З бабуляй таўкуцца, як сіроты. А ў тваіх – поўная сям'я. А ім усё не так! Не, я не магу тут жыць! Паехалі дахаты… Твае падшыванцы мяне даканаюць.

Камень ваду точыць. Аляксей, ледзь дачакаўшыся выслугі, падаў рапарт аб звальненні. Зіна прымусіла яго прадаць кватэру. Каму яе пакідаць? Не сыну ж, што сядзіць у турме! А дачка недзе працуе, дах над галавой мае. Раз такая грошы вяртае, значыць, мае за што жыць. Не прападзе! Ужо калі ён уладкоўваў апошнія справы перад ад'ездам на радзіму, прыйшло пісьмо ад Наташынай сяброўкі. Незнаёмая дзяўчына тайком ад дачкі – тая не дазваляла – паведамляла, што Наташы цяпер вельмі цяжка: нарадзіла двайнят, бацька дзяцей кінуў яе перад самымі родамі, у яе ні грошай, ні жытла.

– Во якая верціхвостка, – крычала Зіна. – І што, мо, цяпер кватэру ёй аддасі? Дулю! А мы дзе будзем жыць? Пад плотам? Не ўздумай!

Аляксей сабраў дачцэ пасылку: сёе-тое малым, у каробку з

цацкамі засунуў грошы. Праз тыдзень пасылка вярнулася нераспакаванай, а ўслед прыйшло пісьмо. «Некалі я любіла цябе больш за жыццё, – пісала Наташа. – Але ты разбурыў не толькі маю любоў, але і маё жыццё! З-за цябе загінула мама. З-за цябе і тваёй жонкі трапіў у турму Алік. Ты здрадзіў не толькі маме, але і нам, ты выракся нас, прамяняў на ведзьму, якая ператварыла наша жыццё ў пекла. Лепш бы ты аддаў нас у дзіцячы дом! І цяпер ты хочаш адкупіцца гэтымі падачкамі? Не трэба! Не было ў мяне бацькі – хай не будзе ў маіх дзяцей дзеда. Але і ты ведай, што ў цябе няма ні дзяцей, ні ўнукаў».

Прачытаўшы гэты жорсткі прысуд дачкі, Аляксей адчуў такі безнадзейны адчай, такую адзіноту і цяжар на душы, як было толькі аднойчы – калі памерла мама. Ён глядзеў на Зіну, якая распакоўвала вернутую пасылку, напаўголаса прымяркоўваючы, каму і за якую цану прадаць дзіцячыя кофтачкі, шапачкі, касцюмчыкі – і не мог зразумець: няўжо гэтая сварлівая сквапная баба – тая самая жанчына, якую ён так адчайна, да беспамяцтва любіў, з-за якой кінуў жонку і асіраціў дзяцей?

Тады ён яшчэ спадзяваўся, што час залечыць гэтую рану і калі не каханне, то спакой і лад вернуцца ў сям'ю. Але не – адзінота, якая пасялілася ў сэрцы, больш яго не пакідала… Чужыя дзеці не сталі роднымі ні яму, ні нават сваёй маці: дзяўчынкі любілі і шкадавалі толькі бабулю, якая іх выгадавала, ад яго ж патрабавалі толькі грошай, прывыклі да штомесячных шчодрых пераводаў.

Але на новым месцы жыццё не ладзілася. Праца, якую ён знайшоў пасля дэмабілізацыі, не давала такіх грошай, да якіх прывыклі і якіх чакалі Зіна і яе дочкі. У калектыве, што складваўся гадамі, не хацелі прызнаваць сваім чужака. На

радзіме, якая за гэты час стала чужой, цяжка было знайсці хавайку для душы – сяброў, аднадумцаў, паплечнікаў. Адпускаўся ён толькі на рыбалцы ці ў лесе, збіраючы грыбы. Там і пазнаёміўся з Андрэем, а пазней – і з яго жонкай. «Жывуць жа людзі! – з добрай зайздрасцю глядзеў на іх Аляксей. – Аказваецца, можна быць шчаслівым – і не разумець гэтага. Напэўна, гэтак жа, у спакоі і пяшчоце, у клопаце, побач з дзецьмі і ўнукамі, мог бы дажываць старасць і я… Калі б некалі на жытняй сцяжынцы не сустрэў Зіну…»

…Калі Аляксей цяжка захварэў, у бальніцы яго праведвалі толькі Андрэй з Валяй. Зіна была занятая: шукала варыянты абмену дома «ў гэтай правінцыі» на сталічнае жытло. На шчасце, Аляксей памёр раней, чым знайшоўся падыходзячы – яму не давялося зноў зрывацца з наседжанага месца і ехаць у невядомасць, ведаючы, што дні яго злічаныя…

Зіна пакінула іх горад праз тыдзень пасля пахавання Аляксея. Праз год паставіла па мужу сціплы помнік. І на тым палічыла свой абавязак выкананым. У яе было шмат іншых спраў і захапленняў. Дочкі яе не прыходзілі на магілу айчыма нават у памінальныя дні – на Радуніцу, Дзяды. Навошта? Ён жа не бацька ім. Зрэшты, у яго ёсць свае дзеці! І адзіным чалавекам, якому балела душа за тое, ці гарыць лампадка ў свята на магілцы Аляксея Пятровіча і ці абарваная трава каля яго помніка, была яго колішняя суседка…



**Саковіч Вольга Іванаўна** нарадзілася 26 жніўня 1973 года ў вёсцы Індрубка Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла сярэднюю школу № 2 г. Астраўца, затым факультэт беларускай філалогіі і культуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і магістратуру Акадэміі паслядыломнай адукацыі г. Мінска па спецыяльнасці "Педагогіка". Працуе ў гімназіі № 1 г. Астраўца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Вершы друкаваліся з 2005 года ў газетах "Астравецкая праўда", "Настаўніцкая газета". У 2010 годзе ў рэспубліканскім часопісе "Маладосць" апублікавана апавяданне "Падары мне пахі травы...". Вершы Вольгі Іванаўны надрукаваны ў калектыўным зборніку "На крыльях вдохновения" (2017). Фіналістка абласнога конкурсу паэзіі сярод настаўнікаў.

Жыве ў Астраўцы.

**Народная песня**

Над ракой туманнаю дыяменты-зоркі
Зіхацяць–купаюцца ў рачной вадзе.
І ляціць удалеч спеў дзявочы звонкі,
Нібы ў песні споведзь аб жыцці ідзе.

Адкрывае песня ночы цёплай, зорнай,
Таямніцы думак, светлы боль душы.
Закране мелодыяй мяккаю, чароўнай,
Расхвалюе сэрца ў начной цішы.

У праўдзівых словах мудрасць захавана,
Што сумленна, праца – каштоўнасці зямлі.
І калі каханне вам падаравана,
Каб сагрэць любімых вы цяплом змаглі.

Велікодным святам, ночкаю купальнай,
На жніво, Каляды і ў звыклы будзень
Услаўляюць дом свой працаю стваральнай
І прыносяць песняй радасць у яго людзі.

Заціхаюць словы над ракой маўкліваю…
На сцяжынцы з кветкамі – дзяўчына адна…
Няхай Бог падаруе ёй долю шчаслівую,
Як у песні і сэрцы прасіла яна…

**Вёсцы майго дзяцінства**

Край зялёных лясоў і высокіх узгоркаў,
Што прывабліва клічуць у сваю далячынь.
Край жытнёвых палёў і бялюткіх рамонкаў,
Што глядзяцца ў бязмежную цёплую сінь.
Край дзівосных легенд аб палацы на ўзвышшы,
Дзе схавана нібы многа скарбаў у зямлі.
Край бабуліных казак, што ніхто не напіша,
Толькі мы ў сваёй памяці іх зберaглі.
Тут бацькоўская хата ў дрэвах цяністых
Запрашае прыйсці на знаёмы парог,
Наталіцца вадою гаючай, празрыстай,
Адпачыць пасля пройдзеных у свеце дарог.
Дакрануся да яблыні, цёплай ад сонца –
Тут стаяла маленькай у духмянай траве...
І прайду, як раней, па сцяжынцы бясконцай
Да далёкага лугу ў незямным харастве.

Аб забавах маленства жывуць успаміны
У кветках, у травах, люстраванай вадзе...
І схіляе вярба да рачулкі галіны,
Нібы ціха размову аб вечным вядзе...
Краю родны! Ужо нельга вярнуцца
Да бацькоўскага дому, да сонца ў лугах...
Толькі сэрцам хачу да цябе прыгарнуцца
І ўзяць усю любоў у жыццёвы свой шлях.

**Памяці Казіміра Сваяка**

Святар, чый лёс – служэнне Богу.
Ты людзям нёс Яго Святло.
Праз словы, справы ўказаў дарогу,
Каб сэрца ім асвечана было.
Паэт. З каштоўных скарбаў мовы
Ты браў натхненне, мудрасць, чысціню.
Гучаць твае праз вечнасць словы
Пра родны край, духоўнасць, дабрыню.
Змагар за мову. Малітвы ў касцёлах
Па-беларуску з верай вымаўляў.
Вучыў дзяцей у беларускіх школах
З імем Бога ў свет благаслаўляў.
Адкрый, сучаснік, дзённіка лісты —
І перад прагай жыць і болем Чалавека
Схіліся ў маўчанні і павазе ты.
Хай яго думкі застаюцца жыць навекі.
Пагасла зорка, што магла б яшчэ гарэць.
Застаўся свет душы, нязгасны праз стагоддзі.
Душа і талент будуць вечна зіхацець
І стануць памяццю ў народзе.

**Падары**

Падары васількі залацістага жыта
І званочкі, рамонкі кваццістых лугоў.
Што дарага сэрцу – не будзе забыта,
Да яго мы ў памяці вернемся зноў...
Падары слодыч ягад на цёплых далонях
І пяшчоту духмяных вуснаў і рук.
Быць шчасліваю дай мне сягоння –
Цеплынёю сагрэй кожны міг, кожны рух...
Падары водар траў у жнівеньскі вечар
І любоў у знаёмых і родных вачах.
Хоць хвіліны кахання не доўжацца вечна,
Хай закружыць галовы нам кветкавы пах.
Падары шчырасць слоў – самых лепшых у свеце,
Апячы ласкай рук да світальнай зары.
Ты застанься са мною ў сонечным леце
І вернасць пачуццяў сваіх падары...

**Купалле**

Загараюцца зоры над ціхай зямлёю
І згасаюць у начной вышыні...
Абдымае туман над азёрнай вадою
Таямнічага свята агні.
Адплываюць вянкі па сярэбраных хвалях...
Ці сыходзяцца разам, ці разводзіць іх плынь...
Заварожаны песнямі цёмныя далі.
Ты пад дзіўныя словы вяночак свой кінь...
І злучаюцца разам каханых далоні
Ля святога Купалля агню...
Ачышчальная сіла схавана ў ім сёння:
Ён словам і думкам дае чысціню.
За чароўнаю папараць-кветкаю
Павядзе нас сцяжынка ў гушчар...

Прывітаюць яліны — маўклівыя сведкі
Прыцягнення двух сэрцаў, іх мар...
У далёкага зорнага неба
Будзем вечныя скарбы прасіць:
Дабрыня і любоў сэрцу блізкаму трэба.
Іх так важна ў жыцці не згубіць.

**Лета кахання**

Абяцай, што паўторыцца лета…
Шчымліва-шчаслівым яно мне было.
Пяшчотай тваёю, як сонцам, сагрэта.
У памяці – вуснаў і сэрца цяпло.

Абяцай, што зноў будуць сустрэчы
У зорнай начной цішыні…
Ты мякка атуліш мне тонкія плечы,
Я буду ўдзячна тваёй дабрыні.

Абяцай, што сагрэюць пяшчотаю вочы,
Апячэ мне душу дотык ласкавых рук…
І закружацца зоры ў ліпеньскай ночы,
І прыпыняць хвіліны свой рух…

Хай салодкія кветкі і травы ў росах
Падаруюць дваім свой мядункавы пах,
Каб у позніх расстайных і зімах і вёснах
Была слодыч мёду на нашых губах…

Хоць дарогі і розныя ў нас у жыцці,
А ў верасні – дождж і з дрэў лістапад,
Я прашу, каб змог ты заўсёды прыйсці,
І вярнулася лета кахання назад…



**Стары Улас (Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі),** беларускі паэт, нарадзіўся у 1865 годзе ў г. Валожын Мінскай вобласці, у сялянскай сям’і. У 1874 годзе, калі Уладзіславу было дзевяць гадоў, памірае бацька. Тым жа летам не стала і маці. Круглага сірату у сваю немалую сям’ю прыняла цётка. Неўзабаве Уладзіслаў ідзе ў памочнікі кухара да графа Тышкевіча, потым прызначаюць кухарам. Калі яму было каля трыццаці гадоў, ён становіцца аб’ездчыкам і, урэшце, ляснічым.

Кожны дзень Сівы-Сівіцкі конна аб’ядзжаў бясконцыя лясы графа, абшары Налібоцкай пушчы. Родныя краявіды цешылі сэрца, узнімалі настрой, абуджалі прагу творчасці. Праца аб’ездчыка і ляснічага давала магчымасць глыбей спазнаць і само жыццё: клопаты і скупую радасць сялян, мітусню засцянковай шляхты, панскія забавы, пыхлівую разбэшчанасць царскіх чыноўнікаў. Усё гэта давала тэмы для вершаў і вершаваных апавяданняў. Штодзённыя зносіны з дзесяткамі людзей насычалі лексікон Старога Уласа моўнымі самародкамі, абагачалі яго памяць і ўяву пярлінамі вусна-паэтычнай творчасці.

У 1914 годзе Сівога-Сівіцкага перавялі на службу ў Варняны. Праз нейкі час пераехаў з сям’ёю ў Вільню, а ў 1920 годзе перабраўся ў Сужаны Віленскага павета. У 1934 годзе атрымаў ад графа Тышкевіча кавалак зямлі ў суседніх Шашэльгішках і тут дажыў апошнія гады.

Першыя публікацыі Старога Уласа адносяцца да 1909 года: допіс пра Валожын, верш “Сонейка прыгрэла”. С таго часу ён стаў актыўным аўтарам “Нашай нівы”, апублікаваў

у гэтай “народнай газеце”, бадай, усё лепшае, што належыць яго пяру.

Па характары таленту Стары Улас паэт эпічнага складу. Лірычных твораў у яго адносна няшмат, ды і многія з іх вызначаюцца апавядальнасцю, падзейнасцю. Такія малюнкі вясны, восені, начнога пажару, сцэнкі сватаўства, здарэнне на вясковай вуліцы, на кірмашы і г. д. Сустракаюцца ў яго (праўда, нячаста) і радкі чыста лірычныя. Шмат пісаў паэт пра сялянскае жыццё, даваў парады, як лепш весці гаспадарку, нават стварыў вершаваны беларускі каляндар. Яго пяру належыць болш за тысячу вершаў, хаця пры жыцці паэта яго кніжка так і не выйшла. Толькі ў 1990 г. была выдадзена кніга “Год беларуса”.

Памёр Стары Улас ад запалення лёгкіх 30 верасня 1939 года.

**Сватаўства**

Раз зімоваю парою,
Мусі, ў мясаедзе,
Сабраліся між сабою
Нашыя суседзі.
А ці ўлетку, ці зімою
Так па людзях ходзіць,
Што старыя між сабою
Сватаўство заводзяць.
Дык як выпілі даволі
Крэпкай саматужкі,
Янка наш хваліць паволі
Стаў свае дачушкі.
«Старша, — кажа ён, — гадамі
Мая Кацярына.

Каб вы, братцы, зналі самі —
Анёл, не дзяўчына!
І паслушна, і набожна,
Ціхая, як рыба,
Дык хто возьме, сказаць можна,
Скарб дастане хіба!
А малодшая Мар'яна
Да ўсякай работы,
Як да шыцця, так да ткання,
Мае шмат ахвоты.
Мо на горб яе другія
Звернуць з вас увагу,
Але я ёй дам за тое
Сто рублёў пасагу».
Учуўшы гэта, ад парога
Юрка Мікалаеў
Падыходзіць да старога
Ды скора пытае:
«Ведаеце што, татуля,
Можа, ў вас часамі
Ёсць Тацяна ці Настуля
Ды з двума гарбамі?!»

**Зімою**

І страху мала,
Дзіва няма,
Што ўжо настала
У нас зіма.
Снегу ў калена
І белы шлях.
Там дзядзька сена

Вязе ў санях.
А другі — дровы
Прэ на убой.
Гоняць каровы
На вадапой.
Ніхто зімою
Не зол нічуць.
Дзеці капою
Са школкі йдуць.
Гоман і смешкі
У іх гарой,
То зноў у снежкі
Б'юцца парой.
То лепяць дзеда,
Хоць ў рукі — зноб.
А у суседа
Малоцяць боб.

**Кумоўскія магілкі**
Ў нашым краі, недалёка, ў Беларусі мілай
Ёсьць мясцовасьць адзінока - "Кумавы магілы".
Поле і каменьня кучы; верас пакруціўся;
А калісь праз бор драмучы там гасьцінец віўся.
Таго бору цяпер годзе, - нямаш і галінкі, -
Толькі ходзяць у народзе такія ўспамінкі:
Што калісьці, мой ты братка, зімняю парою
Ад хрысту вязьлі дзіцятка неяк кум з кумою;
Ды спазьніліся на ліха пасьля падвячорку,
І у лесе грэшну сьціха завялі гаворку.
Кум дурэці пачынае, кума слухаць рада,
Аж на іх тут нападае ваўкоў цэла стада.

Кум спалохаўся да сьмерці, ды ўжо жартаў досіць! -
Пугай стаў каня ён дзерці, конь пачаў уносіць.
А ваўкі не астаюцца, але даганяюць,
Зубы скаляць, разяюцца, за сані хапаюць.
Кума ў голас: "Мусіць, згінем, прападзём, нябожа!
"Хіба воўкам дзіця кінем, самі ўцячом можа?
І, ня думаўшы, шпырнула ў мяккі сьнег дзіцятка;
Ды ваўкоў не абманула хрышчоная матка,
Бо яны ўсе неяк сьціха ды страшна завылі,
А тут санкі, як на ліха, да зямлі прыстылі.
Конь, хоць стаў, але ад пугі даў ў хамут парадна,
Дык тут выкрутні з натугі лопнулі абадва.
Конь тады віхром памчаўся, рваў ізь сіл астатка,
А там кум з кумой астаўся, санкі і дзіцятка...
***
Заржаў конік ля парога, прыляцеўшы ў мылі,
Тут паднялі ўсе трывогу і загаманілі.
Рынулі ўсе да астатка, кінуўшы бяседу,
Знайшлі санкі і дзіцятка, а кумоў - ні сьледу!
Толькі сьнег стаптаны дужа, ў тое мейсца йдучы,
Ды крыві стаяла лужа і касьцей дзьве кучы.
Іх у лесе там схавалі, дзе быў дуб пахілы,
Пасьля мейсца то празвалі "Кумавы магілы".
І з тых пор на гэтым мейсцы, гаварылі людзі,
Нешта ў ночы падарожным часта коні пудзе;
То ў канаву цябе згоніць, лопне гуж, атосы,
Парве упраж і паломіць сані ці калосы.
І баяцца людзі сталі гэтых мейсц да сьмерці.
Завяліся там, казалі, хіба толькі чэрці.
Раз зімою, - не забыўся - едуць людзі нашы,
Дай і я, але запіўся неяк на кірмашы -

(Не тайно ж гэта нікому: то зь бяды, то з гора);
А, як кажуць, то п'яному па калені мора.
Месяц сьвеціць, хмаркі мчацца, сам я прыпяваю,
Зоркі сьвецяць ды іскрацца; еду ані дбаю.
Параўняўся з тым курганам я, здаецца, шпарка,
Аж тут месяц, як туманам, засланіла хмарка.
Стала цёмна неяк зразу; я патрос ляйцыма,
Бо мой конь - знай ты заразу! - стаў стрыгчы вушыма,
Ды у бок, забыўшы пужку, як лінуў хто варам;
Я у сьнег, як у падушку, уваліўся тварам,
І з канавы пакуль вылез, як мядзьведзь зь бярлогу
Дык тут яснасьць асьвяціла прада мной дарогу.
Зірк - аж сані на дарозе; думаў: мае гэта;
Гляджу - не: сядзяць на возе з мужчынам кабета,
А кругом іх абступіўшы, як абручам душаць
Ваўкоў стада, - палічыўшы: з сарачніў іх мусіць.
Ўсе хівы панадуваўшы і хвасты, як трубы,
Языкі павыстаўляўшы, страшна скаляць зубы.
Валасы мне падняліся, хмель адразу згінуў,
Рукі, ногі затрасьліся, чуць ізьноў ня рынуў;
У вушах зьвінела нешта, перасохла горла;
Перайшоў мароз па плечах і у грудзях сьпёрла.
Нагі зь мейсца не парушу і рукой ня сьцісну;
Стаяць трудна, але трэба, і слаўца ня пісну.
Стаю гэтак я і ныю, так як у магіле,
Аж ка мне вось людзі тыя так загаварылі:
- Чалавеча! Помніць будзеш добра мейсца гэта!
Знай жа тое, што мы людзі ня з гэтага сьвета:
Тры вякі над вашым сьветам ужо праляцелі,
Як калісь мы ў мейсцы гэтым саграшыць хацелі,
А затое тут час доўгі кару адбывалі:

Людзей зводзілі з дарогі і коні пужалі.
Тры вякі на гэтым мейсцы былі, як прыкуты;
Трыста год прайшло нарэшце, і канец пакуты!
Чалавеча! Едзь да хаты і скажы там людзям,
Што зь сягоньняшняе даты страшыць вас ня будзем!
Тут у ночы ці ў дзень белы свабодна дарога,
Едзьце цэлы і здаровы, мы ідзём да Бога!
Усё, пакуль зьміргнулі вокам, зьнікла і прапала
Ні людзей тых, ані воўкаў, ні санак ня стала.
Запеў певень дзесьці чутна; зьніклі хутка мары;
Бедны месяц неяк смутна выплыў із-за хмары.
А ў мяне перад вачыма стаяў, азіраўся
Конь мой, бо у куст ляйцыма неяк ублутаўся.
Працёр вочы я, паслухаў ды перахрысьціўся,
Сеў на воз і добрым трухтам да хаты пусьціўся.
Дома трэсьлі бабы нашы вушмі быццам козы,
Што прыехаў па кірмашы я дамоў цьвярозы.
Ў тым жа мейсцы больш ніколі, ці хто йдзе, ці едзе,
Аніякіх страхаў болей нідзе не угледзе.

**Цікавы**

Зь ліку сьвятоў у цэлым годзе,
Мусе, для нашага брата
Адзін Вялікдзень ў нашым народзе
Будзе найбольшае сьвята.
Бо йшчэ прычына будзе такая,
Што яго ждуць ўсей душою,
Бо яно з веку так прыпадае
Заўсёды раньняй вясною;
Будзіцца са сну наша зямліца;
Расьце на кусьце лісточак

І зелянее тады травіца,
Аджыў жучок, матылёчак.
Шэра зязюля зранку і ў вечар
Ярка кукуе у садзе,
Павее ціхі і цёплы вецер,
Пойдзе скацінка у стадзе.
І акром таго ў нашым народзе
Ёсьць успамінкі такія:
Сеўшы на сонцы ды пры пагодзе
Часта гавораць старыя,
Што раз да году адна бывае
На цэлым сьвеце часіна.
Вось, як тыкела поўнач настане
Прад гэтым сьвятам вялікім
Ў памяць Хрыстова зь мёртвых устаньня,
Людзкім скаціна гаворыць языкам.
Учуўшы гэта мову такую
Адзін цікавы знайшоўся:
Хацеў падслухаць гутарку тую,
Ды ў хлеў на вышкі забраўся, -
А яму ждаці прыйшло нямала,
Бо час паволі цягнуўся;
Аж неяк жутка ўжо яму стала:
Пад шапкай волас уздуўся.
Як толькі поўнач глуха прабіла
Цішына стала нямая,
І уздыхнуўшы загаварыла
Сьціха кабылка гнядая:
- Ой, цяжка праца на мае грудзі!
Маю работу нямілу:
Гаспадара бо мне трэба будзе

Заўтра вязьці у магілу.
Ён, як асінка увесь затросься,
Хоць быў і сьмелай натуры,
Зусім бяз духу ў хату панёсься
Мароз пачуўшы на скуры.
Прыпёр да хаты, паў на криваці,
А там сямейка ўжо спала.
Застагнаў толькі: "Ой дзеткі! Маці!
Надта ж нядобра мне стала".
Знахара зь вёскі пакуль пазвалі
І варажбітку кабету,
І хоць курылі і шмат шапталі
Ён кончыў жыццё да сьвету.
Галосяць дзеткі, галосіць матка,
Плача сямейка, ўздыхае,
Радні, суседзяў прыйшла грамадка -
Труну павезла гнядая.
Доўга аб гэтым усе даволі
Успаміналі, прызнацца,
Але затое ў хлеў слухаць болей
Людзі хадзіці баяцца.

**На вяселле сваяку**
Маючы часу крыху нядзеляй,
Дык пішу строчку адну, другу.
І выбачайце, што на вяселле
Да вас прыехаць я не магу.
Хоць мне бяседы вашай, прызнацца,
Як на сягоння дык будзе жаль,
Але не можна памеркавацца,
Калі нас дзеліць спорая даль.

Каб я меў крылы лёгкае пташкі,
Дык як, здаецца, у гэты час
Шпарка ляцеў бы, хоць стар і цяжкі,
У сваю старонку, туды да вас!
Дык пасылаю да вас па слове
З шчырага сэрца, хоць і за свет.
Прыміце, сынку, у роднай мове
Шчыра жаданне, шчыры прывет.
Дай табе, Божа, шчасця і долі,
Каб быць багатым, не гараваць,
Шчасця, здароўя, бяды ніколі,
Бацьку і матку каб шанаваць.
Не знаць ніколі калатні, сваркі,
Век весяліцца, не гараваць.
І пільнавацца каб гаспадаркі
Ды пры тым Бога не забываць.
І на астатку пры добрай волі
З душы і з сэрца гэтак для вас
Хлеба і солі, грошай даволі
Вам пажадае Стары Улас.



**Сямёнава Таіса Сямёнаўна** (1954), нарадзілася на Зельвеншчыне. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ. У розныя часы працавала ў Ваўкавыскай, Воранаўскай, Лідскай «раёнках», загадчыкам Канюхоўскай сельскай бібліятэкі, у літоўскім і ўкраінскім выданнях. У ліпені 1988-га была накіравана ў Астравецкі раён у якасці намесніка галоўнага рэдактара.

Менавіта тут, на Астравеччыне, Т. Сямёнава раскрылася не толькі як таленавіты журналіст, але як яшчэ паэт і празаік. Вершы на беларускай і рускай мовах публікаваліся не толькі на старонках "Астравецкай праўды", але  таксама ў абласной газеце "Гродзенская праўда", у "Беларускай ніве" ("Беларускі ручнік"), "Белорусской лесной газете", часопісе "Полымя". Апавяданні друкаваліся ў газеце "Звязда", адно з іх, "Давясёлкі", стала пераможцам конкурсу, які праводзіла рэдакцыя газеты. Падборкі вершаў змешчаны ў альманаху "Нябесны знак", які быў выдадзены аднаіменным Гродзенскім грамадскім аб'яднаннем, і літатарурных зборніках-штогодніках "Галасы", выдадзеных рэдакцыяй газеты "Гродзенская праўда". Таксама вершы Т. Сямёнавай друкаваліся ў зборніках "Астравецкі край", "Астравецкай зямлі галасы" і інш.

У 2008 годзе Таіса Сямёнаўна стала лаўрэатам прэміі імя А. Дубко ў намінацыі "Журналіст года".

На працягу многіх гадоў работы ў рэдакцыі "Астравецкай праўды" Таіса Сямёнаўна была нязменным рэдактарам самага старэйшага праекта газеты – "Літаратурнай старонкі".

У 2017 годзе з друку выйшла кніга Т. Сямёнавай “Давясёлкі” – вынік творчасці таленавітай журналісткі, паэта і празаіка на працягу многіх гадоў. Жыццё і лёсы людзей, іх адказы перад самімі сабой на адвечныя пытанні: што такое дабро і зло, як жыць у згодзе са сваім сумленнем, глыбокае асэнсаванне простых з’яў і учынкаў – усё гэта ў творах Таісы Сямёнаўны.

Жыве ў Астраўцы.

**Ля іконы Багародзіцы**

У храм заходжу
ў самоце і скрусе
Адпачыць ад нялёгкіх дарог.
Багародзіцы памалюся,
Палячу боль пякучых трывог.

Адзавецца на слёзы малітвы,
Амафорам сваім ахіне,
І суціхнуць душэўныя бітвы,
Благадаць разальецца
ўва мне.

Прад любімай іконай застыну
З верай,
што у жыццёвай імгле
Багародзіца не пакіне,
Неспадзеўную радасць
пашле.

**Самотны птах**

Зусім маленькім рваўся ён з гнязда —
Яшчэ ў пушку, не ў пер’і, былі крылы.
Слабое цельца пэўна б, раззгвраздаў,

Каб маці на ляту не падхапіла.
Рос гордым птах пад навальніцаў шум,
Пад нудны спеў халоднага вятрыскі.

Крычаў нябёсам:
“Я вас папрашу,

Каб воблакі мне гойдалі калыску”.
Застацца ў небе вечна быў гатоў —
Зямныя не датычылі турботы.
Забыўшы дом, бацькоў, сясцёр-братоў,
Ён прагнуў вышыні і адзіноты.
Салодкі, як віно, самападман,
Што пражывеш без паху роднай глебы...
Бы нечы лёс, усё кружыцца груган,
Самотны птах у навальнічным небе.

**Старая бяроза**

Старая бяроза ў куточку двара
Над пуняю голле схіліла.
Як маці даўней сырадоем з вядра,
Вясной мяне сокам паіла.
З далёкай дарогі ў маркоце прыйду
Ці з блізкай — устоме і скрусе,
Шчакою да цёплай кары прыпаду —
Да татавых плеч прытулюся.
І недзе падзенуцца Сум і нуда,
Упрочкі адыдуць трывогі...
Тут сэрца маё застанецца ў ладах
Са светам, бярозай і Богам.

**Малая Радзіма**

Яшчэ лета на згасла –
Сонца трохі і лашчыць, і грэе.
Састарэлыя хаты
У вяночках вяргіняў стаяць.
Ды ў кронах садоў
Ужо маркота асенняя спее,
І рыхтуецца вёска
Да чарговай вясны дажываць.
Колькі вёснаў яшчэ
Ёй, старэнькай, чакаць давядзецца,
Колькі песціць надзей,
Абяцанак дарэмных пачуць...
На радзіме малой
Сэрца моцна ад болю зайдзецца,
Што не выбрала часу
На бацькоўскі я пляц зазірнуць.
Ты даруй, мая вёска,
Што пакінула, у свеце прапала.
У пакаранне пашлі
Непазбыўнай тугі пачуццё...
Тут дзяцінства маё
Басанож па пясочку скакала,
І здавалася вуліца
Доўгай-доўгай, нібыта жыццё.

**Край мой**

Лястрацца аблокі
У азёрнай сіні...
Краю мой далёкі, умацуй мне сілы,
Каб зноў маладою
Па зямлі хадзіла,
Паху сырадою

З дому – не забыла.
Каб у чыстым полі
Снег таптаці першы,
Сэрца каб кахала
І ліліся вершы...
Краю мой далёкі, Бог цябе не кіне!
Люстраца аблокі
У азёрнай сіні.

**Ода Астраўцу**
Я вітаю цябе, Астравец,
У гэты радасны сонечны дзень.
Тваёй славы праменіць вянец,
Шчасцем поўняцца сэрцы людзей.

У атачэнні бароў векавых,
У абдымках рачное вады
Паўстаеш ад стагоддзяў сівых,
Старажытны ты наш й малады.

Шмат пабачыў ты і перажыў –
Працаўнік, абаронца, баец.
Сваёй годнасцю даражыў
Горды, велічны Астравец.

Тваіх вуліц шырокіх прасцяг
І вясновую квецень садоў
Хачу бачыць да скону жыцця,
Наймілейшы з усіх гарадоў.

**Возраст осени**
Возраст осени золотой,
Неразгаданный, непонятный:

То поманит игривой мечтой,
То скомандует на попятный.
Как сквозь марево хмурых утр
Проявляются дни благодатны,
Так и в зеркале – стар и мудр,
А дела говорят об обратном…
Листьев алых букетик набрать
И поставить в любимой вазе,
Да про возраст себе наврать,
Покружиться в хмельном экстазе.
А ведь жизнь-то ещё хороша:
Комплиментов звучат славословья
И в смущеньи томится душа,
Не заполненная любовью…



**Сянкевіч Генрых**, польскі пісьменнік.

Нарадзіўся 5.05.1846 г. ў Польшчы.

У 1880 годзе прыязджаў на Астравеччыну ў в. Дубнікі, дзе на ўскраіне вёскі знаходзіўся яго маёнтак. Тут ён працаваў над раманам “Пан Валадыеўскі” (1887-88), прысвечаным барацьбе з турэцкім нашэсцем 1672-73 гг. Сваякі і знаёмыя Г. Сянкевіча, што жылі ў вёсцы, сталі прататыпамі герояў яго твора. Тут у пісьменніка ўзнікла задума рамана “Патоп” (1884-86) пра вызваленчую барацьбу палякаў супраць шведскай інтэрвенцыі 1655-56 гг.

У 1905 годзе Г. Сянкевіч атрымаў Нобелеўскую прэмію.

Памёр 15 лістапада 1916 года.

**Ігар Туршаў** (1953-16.04.2019), паэт. Нарадзіўся ў Гродне. Скончыў Гродзенскі політэхнічны тэхнікум і па размеркаванні прыехаў у Астравец. Працаваў у будаўнічых арганізацыях, індывідуальным прадпрымальнікам.

Як саліст-выканаўца эстрадных песень, паспяхова выступаў не толькі на раённай, але і на абласных і рэспубліканскіх сцэнічных пляцоўках.

З паэтычнай спробай пяра дэбютаваў у газеце "Астравецкая праўда", вершы друкаваліся ў калектыўным зборніку "Астравецкай зямлі галасы".

**Не отпускай меня, судьба**

Не отпускай меня, судьба,
Ведь дует тёплый южный ветер,
Весь мир прекрасен,
чист и светел.
Не отпускай меня, судьба…

Я много в жизни недоделал
И не успел в ней всё сказать.
Мой жизни лист хоть и не белый,
Но место есть, где дописать.

Мне не страшны любые хвори –
Оставь меня ты на плаву.
И я тогда в житейском море
Не утону. Я – доплыву!

Ведь я в тебя фатально верю
И об одном моя мольба:
Ты дай мне шанс,
по крайней мере.
Не отпускай меня, судьба!

**Наш корабль**

Наш корабль пройдёт
сквозь штормы,
Не погибнет, не утонет.
Всем стихиям непокорный,
Многих он ещё обгонит.

Все невзгоды, все ненастья
Он пройдёт под горным флагом
И доставит в бухту «Счастье»
Нас, измученных варягов.

Наш корабль – страна родная,
В его трюмах – наши души.
Мы уверены, мы знаем:
Он надёжный, самый лучший.

****

Старого коня давно списали…
Но ему ночами снятся сани.
Побежал бы по морозцу лихо,
Но жуёт он сено в стойле тихо.
Был он рысаком отменным,
И овсом кормили, а не сеном,
И возил он председателя колхоза…
Вот такая жизненная проза.
Вот и мы со временем стареем
И позволить многого не смеем.
Девушки, что в юности встречались,
Лишь приснится могут нам ночами.
И всё круче возраста арканы –
Ведь давно потушены вулканы,
Новых песен слышатся аккорды,

Ну а нам – разгадывать кроссворды.

* * *

Не жалейте друг другу сердечности,
Посмотрите в глаза внимательно
Своим детям, любимой матери.
Доброта — это ценность вечная.
Убегаем от всяких условностей,
Устаем от забот и безденежья...
Потому быть и надо бережней
На ухабах, на жизни неровностях.
Если рядом вдруг кто-то оступится,
Поддержите своим вниманием.
И участия, и сострадания
Не жалейте — ведь вам все окупится.

**Облака**

Облака, облака, облака,
Вы плывете по небу века.
Обнимите меня вы слегка,
Поддержите меня, облака.
Вам все видно с небесных вышин,
Что мы делаем, что мы вершим,
Где добро мы творим, где грешим,
Как куда-то бездумно спешим.
Нам приходится часто спешить,
Чтобы все на земле завершить
И в отмеренный жизни аршин
Хоть каких-то достигнуть вершин.
Наша жизнь на земле нелегка,
Мы наивные дети пока.
Не глядите на нас свысока,
Не судите вы нас, облака.

**Памяти матери**

Почему мы по жизни идем так бездумно-беспечно,
Забывая порой про все ценности вечные?
Самых близких людей мы не ценим, пока они с нами.
Пока рядом и можно погладить руками.
Пока можно обнять, приласкать, повиниться,
Как в пустыне воды родниковой напиться.
Когда трудно — к груди их прильнуть, прикоснуться
И несчастным уснуть, и счастливым проснуться.
Как безумный, у Бога прошу я упрямо:
Оживи хоть на час мою милую маму.
Я б упал на колени: прости мои вины,
За ошибки прости меня, грешного сына.
Может, был я с тобой недостаточно нежен,
Мог обидеть порой, был словами небрежен.
Может, сделал не все то, чего б ты хотела,
И того, что мечталось, не смог, не доделал.
Остается просить мне небесные силы,
Чтоб услышала ты, чтоб меня ты простила.

* * *

Закончились страхи и вздохи,
Ушли все сомненья, тревоги.
Ушла навсегда боль прощаний,
Несбывшихся снов, обещаний.
Пришло опьянение встречей
И снова вернулась беспечность.
И канула в прошлое, в вечность
Амбиций былых бессердечность.
Волна недоступных желаний,
Сомнений былых и терзаний
Отхлынула мутною пеной —
Мы снова одни во Вселенной.

От счастья глупея сердцами,
По-новому мир созерцая,
Мы верим: былые невзгоды
Забудем на долгие годы.

* * *

Почему ты пришла не с грозами,
Не с весенними дивными розами,
Не с дождями веселыми майскими,
Не с мечтами, как яблоки райские.
А пришла ты ко мне с сединами,
С недоступными в жизни вершинами.
Ах, любовь моя — птица странная,
И гонимая мной, и желанная.
Ты пришла, как мечта из прошлого,
В мою серую жизнь заполошную.
Разбудила давно забытое…
Ты, любовь моя – книга открытая.



**Фёдарава Святлана**, карэспандэнт "Астравецкай праўды". Нарадзілася і вырасла ў вёсцы Арыстава Апочацкага раёна Пскоўскай вобласці (Расія). Скончыла філалагічны факультэт Пскоўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта ім. С.М. Кірава. Там жа праходзіла навучанне па спецыялізацыі "Практычная журналістыка". Журналісцкую дзейнасць пачынала з Апочацкай раённай газеты “Чырвоны маяк”. У 2012 годзе пераехала ў Астравец, з 2013 года працуе ў "Астравецкай праўдзе". Сябра Беларускага саюза журналістаў. Асвятляе дзейнасць грамадскіх арганізацый, пажарнай службы. Аўтар праекта "Тэрыторыя бяспекі". Пераможца рэспубліканскага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ дзейнасці арганізацый і падраздзяленняў па НС (2018 год).

Вершы і прозу пачала пісаць у школе. На радзіме некаторыя вершы былі апублікаваны ў альманаху “Жывое слова Опочки”, у Астраўцы – друкуецца на старонках раённай газеты. Піша на рускай і беларускай мовах.

***

Спеши любить!
Пусть неумело,
Безответно,
С искрой в глазах
Иль со слезами,
И где-то с болью,
Где-то смело,
Открыто, ярко,

Вдохновенно –
Спеши любить!
Ведь все вчера –
Всего лишь пыль,
А завтра
Может и не быть...

***

Нет, ты не сильная,
Ты просто не умеешь падать –
Ты привыкла удар держать,
И сколько б беда ни косила,
Ты продолжаешь стоять.
И пусть вечерами слезы
И хочется дико кричать –
Склонив голову у иконы,
Ты будешь молитвы шептать.
И тех, кто обидел и предал,
Простишь, ведь они не со зла –
Просто каждый дает другому
То, чем богата душа.

***

Когда мне грустно, я погружаюсь в воспоминания...

Не потому, что там, в прошлом, все идеально, а потому что тогда все казалось совсем другим. Возможно даже простым и легким по сравнению с тем, что есть на самом деле.

Тогда многого хотелось и о многом мечталось. Тогда казалось, что все двери открыты передо мной.

Только вот дороги к этим дверям оказались не такими прямыми...

***

Ты сильная, это правда...

Оглянись, посмотри, вспомни: сколько прожито, пережито, пройдено. Ты прошла, не сломалась. Все позади...

Но почему же, когда на землю опускается вечер, глаза твои наполняются блеском?

Сильные тоже умеют плакать...

Сильные тоже бывают слабыми...

****

Адзіноту лісця
пакрывае снег –
Хутае пяшчотна,
нібы чалавек,
З ветрам калыханку
ледзь чуваць спяе –
І ў краіну сноў, як маці,
адвядзе…
Ціха… І, здаецца,
час спыніў свой бег –
Адзіноту лісця
пакрывае снег…



**Аляксандр Харытонаў** нарадзіўся 15 ліпеня 1948 года ў Астраўцы. Скончыў сярэднюю школу, працаваў слесарам, кіроўцам. Вучыўся ў многіх інстытутах, але скончыў Маскоўскі завочны народны ўніверсітэт мастацтваў і стаў мастаком. Запал да чытання стаў наймацнейшым захапленнем у яго жыцці.

Аляксандр Харытонаў доўгі час пісаў вершы, што называецца, у стол: ацаніць іх маглі толькі самыя блізкія сябры, ды зрэдку, калі яны публікаваліся на старонках раённай газеты, - чытачы "Астравецкай праўды".

Кожны верш – гэта твор, які нясе ў сабе настрой аўтара, раскрываючы яго талент пранікаць у сутнасць таго, што адбываецца душой і сэрцам.

Тэматыка вершаў Аляксандра Харытонава самая розная: любоў да прыроды і роднага краю, разважанні над адвечнымі каштоўнасцямі быцця, любоў і нянавісць, размовы з Усявышнім і людзьмі…

У 2020 годзе ўбачыў свет двухтомнік паэта «Кола жыцця», а ў 2021 годзе выдадзена кніга «Сцежкай розуму, душы і цела».

Вершы пра жыццё, лёс, прыгажосць прыроды і вечнасць быцця адрасаваны шырокаму колу.

Жыве ў Астраўцы.

**Признание**

Задумал, наверно, Всевышний,
Чтобы начал стихи я писать?..

А что вот из этого вышло –
Не мне в том – а вам рассуждать!

Давно ведь записывал мысли?
Их трудно так было сдержать…
В сумбуре бы дней все закисли? –
Себя захотел выражать.

Они не стояли в застое,
Бродили, как будто вино,
И сердце не билось в покое –
Стучало, горело оно!

И часто зазря обвиняли,
Назвав графоманом, язвя…
Ещё бесталанным прозвали –
Лишь только б унизить меня.

Но я, словно Феникс из пепла,
Назло им – писал и писал!..
И мысль как поэта – окрепла…
Стих мой – размышлять призывал!

Раскрою мир, душу я людям,
У них пелену с глаз – сниму…
Чтоб залпы словесных орудий
Взорвали сознания тьму!

**Дети твои, Островетчина**

Была  когда-то поговорка,
Что Островец – всему конец.
Теперь, с началом века-стройки,
Все люди едут в Островец.

Здесь новый город скоро будет
И мирный атом навсегда
Служить начнет всем нашим людям,
Чтоб лучше жизнь у нас была.

Но ведь не только этим славен
Наш добрый, старый Островец!
Талантов много здесь взрастили –
Поцеловал их всех Творец.

Тут Богуш-Шишка появился,
Тут Казимир Свояк творил…
Наш край всегда людьми гордился,
Которых миру подарил.

В стране, где солнышко восходит,
Основу дружбы заложил
Наш первый консул, наш Гашкевич,
И тем почет свой заслужил.

Тут Короткевич, приезжая,
С Адамом Мальдисом вдвоем,
О нашем крае рассуждали,
Мечтали – каждый о своем.

У нас работая в газете,
Писатель Тяжкий здесь творил;
Свои рассказы и сюжеты
Он в наших людях находил.

Александрович Виктор, график,
Мальчишкой начал рисовать,
Здесь проложил он жизни трафик,

В краю родном стал созидать.

Тут Покульницкий вырос, скульптор,
Себя в скульптуре он раскрыл.
Он белорусскую культуру
В своих работах воплотил.

А вот картины милы сердцу –
Вся Островетчина на них.
Как будто он открыл нам дверцу
Своей души, ее родник.

Олег писал их Дробышевский
Родные дали, ширь полей…
Художник он для всех известный,
Наш Островец – его Орфей!

И Воронович-мать творила,
И продолжает дочь ее
Картины сочные, живые –
Отражено в них бытие.

Профессор Пырочкин учился –
Его тут лучшая пора…
Всю жизнь к учению стремился,
Отсюда вышел в доктора.

А ксендз Нестюк в селе Гервяты
Создал такую красоту!
Со всех концов к нам, как на свято,
Спешат увидеть гордость ту.

Он сделал там легенду края,

Какую сердцем сотворил,
Зовут в народе место – раем…
Его он людям подарил.

Поэт Володько жил в Подольцах,
Навек свой край он полюбил.
В нем закрутились жизни кольца,
В любви к Отчизне стих ожил.

И Лобачевский край наш славит,
Второй Мичурин, садовод.
Трудом своим природу правит,
Выводит яблонь новый сорт.

Цвети, любимая отчизна,
Всех воспитала ты не зря,
Милей, дороже нет нам в жизни,
Чем Островецкая земля!

**Ожидание**

А мать ждала… Она устала
От ожидания давно…
Когда же вспомнит сын про маму
И постучит в ее окно?

И в грусти немощной рукою
Слезу скупую с глаз смахнет,
А вдруг вдали, за пеленою,
Спешит навстречу к ней сынок?

– А может, с ним случилось что-то?
Давно не пишет… Не звонит…

Аль заболел? Иль сгинул вовсе?
Болит сердечко, ох, болит…

Печаль сжимает больно сердце,
И все мерещится в ночи,
Что на пороге, там, за дверцей…
Сыночек снова постучит.

**Штрафники**

Мы с боем брали все высоты,
Высоты жизни и судьбы,
Шли впереди штрафные роты –
Глотая боль обиды, шли...
Нас было много – стало мало.
В земле сырой бойцы лежат...
И от Москвы до златой Праги,
Кресты на кладбищах стоят.
Прошли везде – ведь мы пехота,
Хоть смерть повсюду нас пасла,
И вспоминать нам неохота,
Как молча брала мать-Земля.
Мы шли на смерть – никто не плакал,
Привыкли к ней все на войне,
Лишь звон косы над ними звякал,
Когда брала она к себе...

**9 мая**

Туман расплакался под утро.
И день вступал в свои права.
Проснулся мирный, тёплый хутор,
Весенним звуком он внимал…

А на машине мчась, сигналя,
Охрип от крика, наверху,
Солдат, отчаянно взывая,
Кричал: – Закон-чи-ли вой-ну!
И... раскололась тишь лесная,
Взорвалась громом, до небес!
В девятый день начала мая,
Заполнит радость всё окрест!
Стреляли пушки, автоматы,
Стволы нагрелись до красна,
И, позабыв войны утраты,
Народ вокруг кричал: «Ура!»
Все испытав на свете боли,
Стоял солдат в слезах, смеясь,
Он слёзы лил – но не от горя,
От счастья плакал, не стыдясь…
И гармонист, не отдыхая,
Весельем наполняя лес,
Мехи тальяночки смыкая,
Давал товарищам концерт…
А генерал лихой со свистом,
Стал, балагуря, веселясь,
С красивой милой медсестричкой,
Под свист вприсядочку плясать…
Все пели, плакали… и знали –
Пришёл их час – конец войне!
Девятый день начала мая,
Нёс радость людям на Земле!
В Москве, над площадью взвивался
Палитрой красочной салют,
И голос в радости срывался,

Кричали: «Гитлеру капут!»
Девятый день начала мая
Навек обрёл себе права,
И всех с Победою венчая,
Стал красным днём календаря!



**Артур Цяжкі** нарадзіўся 27 ліпеня 1943 года на хутары каля вёскі Лылойці Смаргонскага раёна. Пачатковую школу заканчваў у Лылойцях, сямігодку – у Нястанішках, у старэйшых класах вучыўся ў Свіры. Пасля школы паступіў у Свірскае ПТВ. Атрымаўшы правы трактарыста, нейкі час працаваў у калгасе. А ў 1963 годзе яго прынялі на работу ў рэдакцыю Смаргонскай раённай газеты «Светлы шлях». У тым жа годзе яго прызвалі ў армію. У 1966 годзе, калі Цяжкі яшчэ служыў у войску, у газеце «Літаратура і мастацтва» надрукавалі першыя яго апавяданні «Бульба», «Пралеска», «Маленькі эцюд», «Аднойчы ноччу». Пасля службы ў арміі ў 1967 годзе Артур вярнуўся ў Смаргонскую «раёнку». Але доўга не затрымаўся: хутка яму прапанавалі пасаду карэспандэнта ў газеце «Чырвоная змена». Затым нейкі час Цяжкі працаваў у Брэсце – уласным карэспандэнтам «Чырвонкі», карэспандэнтам абласной газеты «Заря».

31 сакавіка 1975 года яго прынялі на работу ў рэдакцыю «Астравецкай праўды» карэспандэнтам-арганізатарам раённага радыё. Рэгулярна на старонках «Астравецкай праўды» з'яўляліся апавяданні Артура Цяжкага, некаторыя з іх ішлі ў некалькіх нумарах. Друкаваліся яны і тады, калі ён пакінуў Астравец.

У снежні 1977 года Цяжкі звольніўся з «Астравецкай праўды» і паехаў у Гродна. Там ён працаваў адказным сакратаром абласнога таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, затым карэспандэнтам газеты «Голас Радзімы»,

карэспандэнтам газеты «Знамя юности», рэдактарам абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці. У 1982 годзе яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР.

Першы зборнік “Сустрэча пасля вясны” выйшаў у свет у 1980 г. Як адзначылі крытыкі, аўтар валодаў выверанным і дакладным словам, сваёй мелодыкай і танальнасцю. Потым была кніга “Пара блакітных дажджоў” (1982) і “Дзе твой дом?”. Ужо пасля смерці Артура Цяжкага быў выдадзены зборнік аповесцяў на рускай мове “Смятение”.

Літаратуразнаўца Генадзь Шупенька так сказаў пра Цяжкага: “Мала паспеў ён сказаць. І ўсё ж тое лепшае, што яму ўдалося пакінуць нам, не пакіне нас раўнадушнымі – за ім боль і радасць трапяткой чалавечай душы, якая ішла насустрач нам, імкнучыся да чалавечай еднасці, да праўды і хараства”.

Памёр 5 сакавіка 1984 года.

**Сустрэча**

- Да канца паедзем ці, можа, пройдземся?
- Пройдземся! – з радасцю згаджаецца Тадзік.

І мы ідзём пешкі. Ззаду, на даляглядзе, чарнее хмара. Раз-пораз паблісквае, але грому не чуваць. Хмара далёка, падымаецца марудна, і мы не спяшаемся. Нагаварыўшыся ў райцэнтраўскай сталоўцы за куфлем піва, потым у аўтобусе, цяпер нейкі час ідзём моўчкі. Кожны думае пра сваё.

Дарога цягнецца праз заліўны луг, які з левага боку ўпіраецца ў пакручастую рачулку. Там жа рачулка прыгожай лукой абдымае невялікую кудзерку роўных і белых бяроз.

- Памятаеш? – злёгку штурхаючы мяне пад локаць, пытаецца Тадзік.

Выходзіць, мы думалі пра адно і тое ж.

Памятаю, канечне, памятаю. Некалі вясной і летам мы вельмі любілі бавіць тут свой вольны час. Мы – гэта Тадзік, Яніна і я. неразлучная тройка. Нас так і называлі ў вёсцы: “тройка-неразлівада”. Дружылі са школьнай парты і абое кахалі Яніну. Не ведаю, ці здагадвалася Яніна пра маё каханне. Можа, і здагадвалася, але яна выбрала Тадзіка, чарнявага, сціплага і крыху сарамлівага хлопца. Гэты выбар яе не разладзіў нашу моцную дружбу. Па-ранейшаму мы ўсюды былі разам.

Памятаецца, як гадоў дзесяць назад, гэтакай жа сенакоснай парой, раптоўна напаткаў нас тут на лужку праліўны дождж, як мы з віскам і смехам беглі да стога, каб схавацца.

Дождж хутка заціх. Выглянула яркае, ласкавае сонца, і ўсё наваколле ўспыхнула безліччу дыяментаў. Яніна глядзела, як над лугам, над рачулкай курылася бэзавая смуга, і ціха, шчасліва ўсміхалася. Прамоклая сукенка шчыльна атуляла яе стан. Праз тонкую крамніну прасвечваліся вішнёвыя ад загару плечы. Ільсністыя пасмы цёмна-русых валасоў ліплі да гарачага твару, да пяшчотнай шыі.

- Хараша як! – прашаптала Яніна і паклала Тадзіку на плячо руку…

Потым мы з галёканнем насіліся па цёплых лужынах і смяяліся сонцу, лугу, блакітнаму небу…

Успамінаючы, мы і не заўважылі, як увайшлі ў вёску.

- Можа, зойдзем? – неяк нясмела прапанаваў Тадзік, кіўнуўшы ў бок сваёй хаты.

- Зойдзем.

Як жа не зайсці, не пабачыць Яніну, не сустрэцца са сваёй маладосцю?!

На дварышчы, сярод пражэрлівай чарады індыкоў і курэй, стаяла поўная, крыху мажная жанчына, размінала ў пальцах вараную бульбу.

- Прымай гасцей! – гукнуў Тадзік.

Жанчына павярнулася… “Няўжо гэта Яня? Тая самая прыгажуня Яніна? – прамільгнула ў маёй галаве. – Як жа яна змянілася за дзесяць гадоў!” Выгаралая, зашмальцаваная сукенка месцамі раз’ехалася па швах. Пальцы брудныя, заскарузлыя, некалі пышныя прыгожыя валасы даўно не расчэсваліся.

- Дзень добры! – нарэшце прывітаўся я.

- Добры дзень! – адказала Яніна і скупа ўсміхнулася. Потым, кіўнуўшы ў бок сваёй “птушкафермы”, дадала: - Кармлю вось. А ты курэй не трымаеш?..

Яніна павярнулася да Тадзіка.

- Па колькі прадаў?

Тадзіку, відаць, стала няёмка ад гэтага пытання, і ён нехаця, упаўголаса адказаў:

- Па восемдзесят пяць капеек.

- Як, дзесятак яек па восемдзесят пяць капеек? Смяешся ці праўду кажаш?

- Праўду.

- Вось і даручы што такому! Вера Сташкова, вунь, па рублю за дзесятак узяла, а ён па восемдзесят пяць. Пустадомак ты, а не гаспадар!

У гэты час чырвоны, як агонь, певень, няйначай добры забіяка, выцягнуў шыю і клюнуў гаспадыні ў руку. Гэта зусім раззлавала Яніну. Яна кінула ля студні вядро і важнай

паходкай накіравалася ў хату. А разам з ёй аддаляўся, раставаў, знікаў вобраз Яніны з часу маёй маладосці…

**Даруй мне, Віка!**

Ад станцыі да пасёлка – чатыры вярсты. Палова гэтай адлегласці ўжо засталася ззаду.

Асенняя ноч, чорная, як глыбокая студня, і – дождж. Праліўны, з ледзянымі пырскамі. Плашч на Аркадзю зусім здубянеў. І цяпер бесперастанку шэргаў: шэрг-шэрг… Ад кожнага новага кроку, ад кожнага ўзмаху рукі: шэрг-шэрг…

Холад, стома, а галоўнае – няма ў душы хоць якой надзеі, што там яго прымуць. І ўсё ж нешта ў душы было, нейкая іскрынка, нейкая кволая, як вясновы парастак, надзея сабрала яго ў гэты няблізкі свет.

А дождж то заціхаў, марнеў, то зноў, спуджаны ветрам, стараўся лупіць з новай сілай.

Калі Аркадзю прыходзіла на памяць тая апошняя сустрэча, ці, можа, лепш ростань, станавілася яшчэ халадней, яшчэ безнадзейней. Ён упарта гнаў гэту памяць-думку і вяртаўся да таго, калі ўсё было добра. Па кропельцы, па макулінцы збіраў ён у адно цэлае тое добрае, і яно станавілася, як яму здаецца, не такім ужо мізэрным. А галоўнае – прыемным. Але асабліва прыемным і светлым ён яго адчувае зараз, калі так баліць стомленая душа, калі так востра адчуваецца адзінота. Ну, а тады для яго ўсё гэта было такое простае, такое звычайнае, банальнае.

Ну, сустрэліся, пакахалі адно аднаго, пабраліся. Усё так зразумела, прывычна, адвеку ўстаноўлена – жыць людзям сем'ямі. Але ж сямейнае жыццё – вялікае, складанае,球 рознае ў ім бывае. І што ж там страшнага, калі недзе ён, у адносінах да Вікі, павёў сябе не так, як

належыць. Трэба было даравацъ. У сям'і ж так: заўсёды нехта некаму ўступае. Часцей, вядома, жонка мужу. Яно толькі так здаецца, што жанчына слабая істота. А яна ого! Яна вельмі многае можа. Ды і сэрца яе… То чаго ж тады Віцці хацелася? Чаго? Ат, бабскі капрыз…

Так думалася ў той час. А значна пазней з'явілася зусім іншае паняцце: жанчына сапраўды многае можа, але ж і для сябе нечага патрабуе. Не ад нейкага там каварства ці капрызу, а ад чыстай жаночасці. Хочацца ёй і дабраты, і ласкі, і ўвагі, а ён гэтага Вікторыі не даваў.

- Мала табе маёй зарплаты? Мала?!.. Ну, калі мала, то і не трэба. Іншай і гэтага хопіць…

Віку ён пакінуў. Жыццё цягала Аркадзя па розных дарогах, сустракаліся розныя людзі. Здаецца, і добра было, і весела, і ўсё ж… І ўсё ж заўсёды нечага не ставала. Не ставала таго, што было ў Вікі…

Гоніць вецер мокрае шмоцце хмар. Абдаюць твар ледзяныя пырскі. Наперадзе нешта бліснула. "Ваўкі? Адкуль ім тут быць?! У звярынцы хіба толькі і ўбачыш іх цяпер". За першым агеньчыкам лыпнуў другі, трэці… Пасёлак. І затахкала ў Аркадзя сэрца, ліхаманкава застукалі зубы. Ці то ад холаду, ці то ад хвалявання…

Знаёмы дом, знаёмы ганак. Слабы стук у дзверы. Каб і хацеў мацней пастукаць, то нельга – рукі замёрзлі.

Там, за дзвярыма, у мяккай соннай цеплыні нешта зашамацела. Праз мінуту пачуўся здзіўлены голас:

- Хто?
- Я.
- А хто – я?
- Аркадзь…

На нейкі час усталявася цішыня. Нібы Віка нешта раздумвала. Потым ярка ўспыхнулі святлом вокны, скрыгатнуў ключ, дзверы адчыніліся, і на Аркадзя дыхнула знаёмым пахам сенцаў.

- Ну, заходзь, - прапанавала Віка.

  Аркадзь асцярожна пераступіў парог і няўпэўнена спыніўся.

- Праходзь, чаго ж…

Аркадзь скінуў свій мокры плашч, паставіў пры вушаку чамаданчык і зноў спыніўся.

- Ну і вымак жа! Адкуль ты?
- Са станцыі.
- Пешшу?
- А чым жа даедзеш?

  Віка падала Аркадзю яго, некалі ім пакінутя, штаны і рубашку.

- Пераапранайся.

  На газавай пліце сіпеў чайнік.

- У камандзіроўку? – спытала Віка.

Аркадзь паглядзеў на сцяну, дзе ў рамцы віселі фотаздымкі, сярод якіх быў і яго здымак, кашлянуў і прыглушаным голасам прагаварыў:

- Я, Віка… - і асекся. – Ты даруй мне, Віка… Я хачу назусім… Да цябе…

Вікторыя моўчкі ўважліва разглядвала Аркадзя, нешта думала, потым сказала:

- Заўтра, Аркадзь, пагаворым, заўтра. Добра?



**Чакур Ганна Іванаўна** (1959) нарадзілася ў Астраўцы. Вучылася ў Астравецкай сярэдняй школе, потым у Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце. Доўгі час працавала аграномам па ахове раслін. Потым працавала журналістам, загадчыцай аддзела сельскай гаспадаркі у газеце “Астравецкая праўда”. Творы Ганны Іванаўны друкаваліся ў газетах «Звязда», «Беларуская Ніва», часопісах «Полымя», «Дзеяслоў».

Была пераможцай рэспубліканскага конкурсу сярод журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі на лепшае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, міжкультурнага дыялогу ў Рэспубліцы Беларусь.

Піша вершы (у асноўным, белыя), невялікія апавяданні, казкі і проста замалёўкі. Вельмі падабалася пісаць пра людзей – іх лёсы, спадзяванні, расчараванні. Пераклала з англійскай мовы кнігу Шмуэля Керэна «Мулік-жулік» (лёс габрэйскага хлопчыка, які перажыў Халакост), перакладала таксама з англійскай мовы вершы Менке Каца. Шмат пісала пра трагедыю габрэйскага народа, на прыкладзе людзей, якія перажылі (або загінулі) 2-ую Сусветную вайну на тэрыторыі Астравеччыны.

У 2019 г. была выдадзена кніга Ганны Чакур у суаўтарстве з У. Завальнюком “Вялікая душа маленькай парафіі” (пра гісторыю касцёла Святой Тройцы ў Гервятах).

Жыве ў Астраўцы.

**Казка пра Астравец**

Даўным-даўно (нават сонца ў той час уставала на захадзе, а сядала на ўсходзе) на месцы, дзе сёння стаіць

Астравец, плёскалася возера. Ды такое незвычайнае, што пагалоска аб ім разыходзілася па ўсяменькаму свету — як кругі ад кінутага ў ваду каменя.

— Вада там празрыстая-празрыстая, — распавядалі купцы. — Упусціш манетку, і нават у самым глыбокім месцы можна разгледзець яе вартасць.

— Ды не проста празрыстая, — дадавалі знахары, — яна яшчэ і гаючая: паміраючага дзеда акуні ў возера — заскача маладым казлянём.

— Не толькі-не толькі, — шапталіся паміж сабой варажбіткі. — Вада з гэтага возера прываротная. Не кожны дзень, канешне. Але начэрпай у купальскую ноч гарлачык, і любое сэрца тваім будзе. Папырскаеш потым вадой сляды патрэбнага чалавека — прысушыш яго на ўсё жыццё.

— Русалкі ў тым возеры водзяцца, — летуценілі маладыя воіны, што ў баявых паходах начавалі на яго берагах. — Ды такой прыгажосці, што раз убачыш, і век перад вачыма стаяць будзе. Толькі вейкі прыкрыеш — вось яна, гарэзніца, ўсміхаецца спакусліва...

Не ведаю, праўда гэта ці не, толькі з’язджаліся да нашай воднай пярліны з усяго свету.

Хто ў надзеі паправіць здароўе, хто — сустрэць русалку, а хто і проста адпачыць, выпрастацца душой. Вельмі ж прыгожымі былі яе берагі — раслі на іх дзівосныя дрэвы, цвілі нябачаныя ў свеце кветкі. А птушкі пяялі! Паслухаеш хвіліну — і закахаешся ў першага сустрэчнага, навошта тая варажба!.

Было гэтае возера нічыім. Усіхнім. Толькі згледзеў адзін хітраваты мужык, што кожны, хто на возеры бывае, талер у яго воды кідае — каб вярнуцца сюды яшчэ і яшчэ. І на дне — вада ж празрыстая — серабрыцца манетак ужо нямала.

— Эге, — думае сабе мужык. — Эге...

Стаў ён цішком ды крадком гэтыя грошы са дна даставаць. Дзень за днём, дзень за днём. Не за год, дык за два, а мо і за ўсе тры, толькі сабраў мужык цэлы мех талераў.

— Што ж, — зашаптаў ён аднойчы сабе пад нос, — ёсць грошы — трэба нешта купляць. Не адно ж па начах любавацца іх бляскам.

Аднаго ранку ускуліў мужык свой мех на воз і паехаў у Быстрыцу.

А Быстрыца ў той час — ого! — стольным горадам была. Сам кароль тут з усёй сваёй світай сядзеў.

Вось упаў мужык ніцма перад каралём:

— Дазволь, найвышэйшы, слоўца акругліць.

— Круглі, — не адмовіў той прасталюдзіну.

— Хачу, ваша мосць, возера займець.

— Во дурань, — зарагатаў правіцель. — Хочаш — дык мей. Яно ж нічыйнае. Кожны ў ім можа купацца, рыбачыць, на лодцы грэбсці або плытом плыць...

— А я, твая вялікасць, — прыпаў да каралеўскі ног мужык, — хачу, каб не кожны.

Каб толькі я над возерам гаспадарыў...

— Ах, ты злыдзень! Курыная твая галава, — закрычаў кароль. — Бач, што ўдумаў.

Гэй, варта, схапіць...

— Пачакай, найвышэйшы, — заюліў мужык. — Не кліч сваю варту. Я ж не за так прашу... Задком-задком выпнуўся ён за дзверы і выцягнуў з-за іх мех з талерамі. Вывалак на сярэдзіну ды шмаргануў завязку — сыпануў з меха срэбны дождж, заскакалі талеры па звонкіх плітах троннай залы.

Глянуў на гэтае багацце кароль ды задумаўся. Не, асабліва сквапным ён не быў.

Можа, хіба трошкі — як большасць з нас. Але трынаццаць гадоў і два месяцы ішла вайна з маскавітамі, і ў каралеўскай казне ўжо даўно паблісквала донца...

Узяў кароль мужыцкія грошы. Выдаў яму ўзамен грамату. Так, маўляў, і так — мужык гэты ёсць адзінаасобны ўладнік возера. У чым мы, найвышэйшы кароль, надпісваемся і пячатку гербавую прыкладаем.

Вярнуўся мужык дадому героем. Усім граматай выхваляецца, да возера і падыходзіць забараняе. Толькі не слухаюць яго людзі: мужык на адным беразе граматай трасе — яны на другім купаюцца ды рыбку вудзяць. Прыбяжыць «уладнік» на супрацьлеглы бераг, а людзі зусім у іншым месцы плытагоняць. Забегаўся ён. Прытаміўся. Сеў пад дрэва адпачыць і задумаўся. Думаў-думаў, ды і прыдумаў (кажу вам, што хітры быў!).

* * *

Нібы гаспадар – каня на пашы
Поўдзень спутвае ногі прахожых
Кароткім ланцугом
Іх уласных ценяў
Відаць, для таго,
Каб былі на відавоку
Так...
На ўсялякі выпадак
А раптам спатрэбіцца
Куды-небудзь упрэгчы.

* * *

Па крыштальным стрыжні
Учорашняга сну
Параспелай, гатовай выбухнуць
Брудным воблакам

Порхаўкай
Сноўдаецца занадта датклівая
Рэчаіснасць.

* * *

Калі наканавана
Прарасце і на скалах
Зачэпіцца
Укарэніцца
Убурыцца ў непрыступнасць
Пяшчотай раздробіць мармур і граніты
У нетрах каменнасці
У эпіцэнтры адсутнасці глебы
Народзіць парасткі
Без хларафілінкі ў лістоце
Без крывінкі ў твары
Празрыстыя нібы прывіды
Але жывыя
З тых
Што ад нараджэння ведаюць
Смак несвабоды
І не мапах шукаюць
Накірунак ад сонца...
Калі наканавана
Парастак стане дрэвам
Ахоўнікам цені
Іаанам Хрысціцелем глебы
Магільшчыкам камня
А можа і не стане...

* * *

Думка саслізнула з далоні
Разам з мыльнай пенай

Зачапілася за край рукамыйніка
Пасядзела, паразважала
І прыйшоўшы да нейкай
Ёй адной вядомай высновы
Кінулася раптам
У бездань каналізацыі.

* * *

З камячка
Старанна размятай
У руках гліны
Паспрабую выляпіць
Ідала
Каб маліцца яму
У адзіноце.

* * *

Мне б крочыць па паветры
А калі скончыцца
Па яго адсутнасці
Мне б зоркай ззяць
Новай
Пакуль неадкрытай
Скрупулёзным вучоным
Мне б расхінуць нарэшце
Сутаргай зведзеныя крылы
І адмахнуўшыся ад парад
Песіміста Дэдала
Дарасці да нязлога сонца
Мне б, а ты прапануеш яечню...



**Шэін Сяргей Віктаравіч**, ветэран працы, падпалкоўнік міліцыі ў запасе. Нарадзіўся і вырас у г. Гродна. Вучыўся ў Гродзенскім універсітэце на гістарычным факультэце. У Астравец пераехаў у 1985 г. з Дзятлава, дзе працаваў у раённай газеце “Перамога”. У Астравецкі раён Сяргей Віктаравіч быў накіраваны, каб узначаліць раённы камітэт камсамола. Тут і пусціў свае карані. Калі перадаў справы камсамольскага лідара пераемніку, працаваў у Варнянскім міжшкольным вучэбна-вытворчым камбінаце. Затым С. Шэйн быў запрошаны на работу ў міліцыю, на пасаду намесніка начальніка Астравецкага РАУС па палітчасці. Калі ў званні падпалкоўніка міліцці ён развітаўся з міліцэйскай службай, працяглы час працаваў на розных пасадах: загадчыкам аддзела арганізацыйна-кадравай работы райвыканкама, начальнікам аддзела фізкультуры, спорту і турызму, на грамадскіх пачатках узначальваў райкам прафсаюза работнікаў дзяржаўных устаноў.

Сяргей Віктаравіч, маючы добрыя журналісцкія здольнасці, шмат пісаў у армейскія газеты, падчас службы ў арміі; падчас работы ў міліціі супрацоўнічаў з рэспубліканскай газетай “На страже Октября”, ахвотна дзяліўся інфармацыяй з “Астравецкай праўдай”. Захоплены гісторык, ён займаецца вывучэннем мінулага Астравеччыны, яго даследаванні друкаваліся ў раённай газеце.

Вершы Сяргей Віктаравіч пісаў яшчэ з юнацтва, але надрукаваць вырашыў у “Астравецкай праўдзе” у 2009 г.

**Весна. Дорога**

Клубилось дымкою согретое околье.
Игривым проблеском весенний солнца луч
Сквозь леса поросли искал себе раздолья,
То исчезал в багрянец кромки круг.
Лента асфальтная за взгорком на низине
Вдруг утонула в белой пелене,
И солнца словно не было в помине.
Но вот пробилось робко в стороне!
В тенистых заводях лесного придорожья
Ещё белеют снега островки,
Но нет – весна в душе, как искра Божья,
Зиме здесь оставаться не с руки.
И снова заискрил и замаячил
Сквозь лапы ели солнечный привет
И недвусмысленно собою обозначил:
Да – радости. Унынью, мраку – нет.

**Романс**

Не рядом ты. Не далеко. Не близко.
Не рядом ты – чтобы достать рукой,
Чтобы, когда упало небо низко,
Твоей груди налиться теплотой,
Чтоб глаз любимых, простодушно добрых
Светлом омыться, озариться мог,
Чтоб локонов твоих коснуться полных.
Не рядом ты. Не дал мне это Бог…
Но вот прикрыл глаза в тоске щемящей –
И рядом ты, как свет внутри меня,
Как призрак, сладостно к себе манящий.
О нас, о нашем, о любви моля
Не рядом ты. Но рядом ежечасно,
Как вечности причастность – рядом ты,

Как всё, что появляется внезапно.
Из яви уходя в мои мечты
Не рядом ты. Не далеко. Не близко…

**Феерия декабря**

Даже в скудной палитре
Коротких декабрьских дней
Глаз невольно отметит
Соцветие радужных красок,
Проблеск солнца, синь неба,
Искристые взгляды друзей,
Серпантины, гирлянды
И блески рождественских масок.
Тот, кто ищет, - найдёт,
Тот, кто хочет, - увидит и внемлет.
День короткий,
Но красок радужный и яркий букет –
И душа словно вдруг
Феерический мир всеобъемлет –
Синий, жёлтый, зелёный
И самый изысканный цвет.

****

Как пьянят вальса жаркие кружева,
Нежный шёпот: «пардон…», «вуаля…»
Тот корнет может стать вам суженым,
На коленях о счастье моля.
Что ж ты, бабочка, крылья повесила,
Не порхаешь былым мотыльком?
На паркет смотришь с люстры невесело
И не смело от света бочком…
Затухает бравур струнно-клавишный
И лакеи сломались в спине.

Так сегодня становится давнишним,
Так пылинка сгорает в огне.
Что ж ты, бабочка, крылья повесила,
Не порхаешь былым мотыльком?
На паркет смотришь с люстры невесело
И несмело от света бочком.

****

Мир, в котором мы живём –
Это мир, который видим,
Тот, который здесь живьём,
Тот, что любим или ненавидим,
Тот, что утром с болью, без прикрас
Или в полдень солнечный с надеждой.
Не бывает мир, чтоб раз на раз.
Мир – босяк под праздничной одеждой.
Или франт без сути, слёз и грёз,
Или целый ворох чепухи,
Или миллион пурпурных роз,
Или храм, чтоб отмолить грехи.
Он творимый и творящий нас,
Нами и для нас благословенный
То на век, а то на миг, на час…
К счастью и увы – несовершенный.